# “КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ”

**незалежны перыядычны *on-line* часопіс**
**у падтрымку беларускай культуры**
**і беларускасьці**

## №12
## Сьнежань 2015

*Часопіс заснаваны ў сьнежні 2012 года*
*Выходзіць раз на тры месяцы*

*Аттава, Канада*

## Дарагія сябры!

Часопіс **"КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ"** заснаваны як незалежнае перыядычнае выданьне, прызначанае для абмеркаваньня праблем беларускай культуры і развіцьця беларускасьці.

Часопіс зьмяшчае арыгінальныя аналітычныя артыкулы, эсэ, а таксама абгрунтаваныя дыскусіі і каментары па гісторыі, мове, літаратуры, сацыялогіі, традыцыях і іншых пытаньнях, маючых дачыненьне да развіцця беларускай нацыі.

Беларуская Мова – асноўная мова часопіса, але магчымы публікацыі і на іншых мовах.

Запрашаем да супрацоўніцтва ўсіх зацікаўленых.

*Свае матэрыялы дасылайце на* chasopis.sakavik@hotmail.com

Часопіс **"КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ"** публікуецца на вэб-старонцы www.sakavik.net

**Рэдакцыя часопіса:**

Заснавальнік і рэдактар Пётра Мурзёнак

Сябры рэдакцыі: Наталія Баркар

Вікторыя Казлова

Галіна Туміловіч

*Аттава, Канада*

# Зьмест часопіса «КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ», №12, сьнежань 2015

*Прадмова рэдактара да 12-га нумара часопіса* (с.4-7)

*Артыкулы*

Аляксандр Кашо **Гісторыя хлуслівага тэзісу аб тым, што Беларусь квазідзяржава, нацыя, якую прыдумалі бальшавікі** (8-22)

*Дыскусія: “Нацыянальнае будаўніцтва і сучаснасць. 2015”* (23-68)

**Тэма: “СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ”.**

**Удзельнікі:** А. Анісім, А. Кашо, П. Мурзёнак, А. Трусаў, І. Шумская

Аляксандр Кашо **Беларуская нацыя: сучасны стан, мэты, задачы, падыходы** (24-44)

Пётра Мурзёнак **Развагі аб стратэгіі развіцця беларускай нацыі** (45-57)

Ірына Шумская **Беларусь у цывілізацыйным разломе** (58-62)

Алена Анісім **Тэзісы да праекта “Стратэгія развіцця беларускай нацыі”** (63-65)

Алег Трусаў **Тэзісы да праекта “Стратэгія развіцця беларускай нацыі”** (66-67)

*Юбілеі*

**Да 90-годдзя з дня нараджэння Кастуся Акулы** (69-78)

Вольга Іпатава **Дарогамі змагання** (70-75)

Пётра Мурзёнак **Слова пра земляка** (76-77)

*Наступны нумар часопіса выйдзе ў сакавіку 2016 года*

**Прадмова рэдактара да 12-га нумара часопіса**

**Дарагія чытачы!**

**Шчыра віншуем Вас з Новым 2016 годам!**

**Зычым Вам і Вашым сем'ям моцнага здароў'я, шчасьця, посьпехаў і дабрабыту.**

***З павагай,***

***рэдакцыя часопіса "КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ"***

12-ты сьнежанскі нумар часопіса пачынаецца артыкулам нашага сталага аўтара Аляксандра Кашо, прысвечанага крытыцы поглядаў, адмаўляючых існаванне беларускай і украінскай дзяржаў.

Большую частку нумара занялі матэрыялы дыскусіі **"Нацыянальнае будаўніцтва і сучаснасць. 2015". Тэмай дыскусіі стала** "СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ". Дыскусія па гэтай тэме дыктуецца неабходнасцю дапаўнення і абнаўлення падыходаў у рэалізацыі беларускай ідэі ў сувязі з новымі уплывовымі фактарамі, знешнімі (глабалізацыя, лакальныя войны, міграцыя) і ўнутранымі (стан грамадства, адсутнасць адзінства ў беларускай эліце).

Часопіс прапанаваў сваю пляцоўку для абмеркавання і распрацоўкі праекта "Стратэгіі развіцця беларускай нацыі", якая, як думаецца, можа стаць праграмай дзеянняў беларускай эліты на бліжэйшыя 20 год. Запрашэнне да ўдзелу ў праекце было разаслана шэрагу патэнцыйных экспертаў, якія з пункту гледжання часопіса маюць вялікі досвед у галіне ідэалагічных, культурных і маральных пытанняў развіцця нацыі. У гэтым нумары друкуюцца матэрыялы, прадстаўленыя Аленай Анісім, Аляксандрам Кашо, Пётрам Мурзёнкам, Алегам Трусавым і Ірынай Шумскай.

На першым этапе часопісам было прапанавана асвятліць шэраг праблем датычных да характарыстыкі сучаснага стану беларускай нацыі, вызначэння мэты і задач Стратэгіі, а таксама падыходаў і сродкаў для яе рэалізацыі. Характарызуючы стан беларускай нацыі прапанавалася засяродзіць увагу на ўзроўні

самаідэнтыфікацыі\нацыяналізму\патрыятызму; на адносінах да незалежнасці і суверэнітэту, да дэмакратычных каштоўнасьцей, да праблемы Ўсход-Захад; на ўзаемаадносінах дзяржавы і нацыянальнай ідэі; на тэндэнцыі зменаў стану нацыі за апошнія 20, 50, 100 год (стан палепшыўся, пагоршыўся), на патэнцыяле сіл для рэалізацыі нацыянальнай ідэі. Натуральна, што кожны з экспертаў меў магчымасць уключаць іншыя аспекты абмяркоўваемай тэмы. Карэктная ацэнка сучаснага стану нацыі вельмі важная для вызначэння мэты і задач Стратэгіі.

Натуральна, што часопіс "КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ" запрашае іншых магчымых экспертаў далучацца да распрацоўкі "Стратэгіі развіцця беларускай нацыі". Ніжэй падаецца прыблізны пералік пытанняў (гл. "Асноўныя тэзісы"), якія было б пажадана абмеркаваць і абгрунтаваць пры напісанні праекта. Не сакрэт, што распрацаваць такі праект будзе не вельмі проста па прычыне розных меркаванняў і падыходаў, але мы спадзяёмся, што зможам знайсці згоду на фінальнай стадыі бо ўпэўнены ў неабходнасці стварэння такой Стратэгіі. Стратэгія распрацоўваецца для ўсіх прадстаўнікоў беларускай нацыі, а не пад канкрэтных асоб, партыі ці грамадскія рухі.

На падставе матэрыялаў прадстаўленых экспертамі будзе падрыхтаваны ўзгоднены варыянт Стратэгіі, які будзе вынесены на публічнае абмеркаванне ў СМІ тэрмінам на 2-3 месяцы. Распрацаваная стратэгія, у выпадку яе шырокага абмеркавання і распаўсюду, можа стаць праграмай дзеяння для ўсіх асоб, зацікаўленых ў пытаннях развіцця нацыі.

У раздзеле "Юбілеі" змешчаны матэрыялы прысвечаныя 90-годдзю з дня нараджэння пісьменніка і грамадскага дзеяча Кастуся Акулы.

*Пётра Мурзёнак*

## Асноўныя тэзісы да праекта "Стратэгія развіцця беларускай нацыі"

*(падрыхтаваныя рэдакцыяй часопіса і адкрытыя да іншых прапаноў)*

**Змест**

1. **Стан беларускай нацыі**
2. **Мэта стратэгіі**
3. **Задачы стратэгіі**
4. **Падыходы і сродкі рэалізацыі.**

*Думаецца, што па аб'ёму канчатковы варыянт прапануемай стратэгіі павінен заняць не больш 4-5 старонак ці нават менш, крыстальна зразумелым, рэальным, абгрунтаваным. Натуральна, меркаванні і іх абгрунтаванне экспертамі на папярэднім этапе аб'ёмам не абмяжоўваюцца.*

1. **Стан беларускай нацыі** (*сюды можна уключыць, але не толькі*):

- Узровень самаідэнтыфікацыі\нацыяналізму\патрыятызму;
- Адносіны да незалежнасці і суверэнітэту;
- Адносіны да дэмакратычных каштоўнасьцей;
- Адносіны да Ўсход-Захад;
- Дзяржава і нацыянальная ідэя;
- Тэндэнцыя зменаў за апошнія 20, 50, 100 год (стан палепшыўся, пагоршыўся);
- Патэнцыял сіл для рэалізацыі нацыянальнай ідэі.

2. **Мэта або чаго хоча беларуская эліта**

- Якую нацыю збіраецца будаваць беларуская эліта (меншасці; прынцып уключнасці; грамадзянская ці этнічная нацыя). Вызначэнне паняццяў нацыя, нацыянальная дзяржава;
- Што мы хочам пабудаваць – нейтральную дзяржаву (як Швейцарыя); працягваць развівацца як і зараз, падтрымліваючы добрыя адносіны з суседзямі, але выйсці з ваенных блокаў: канфрантацыя з Усходам і далучэнне да Еўропы; іншае?
- Абазначыць мірны характар рэалізацыі нацыянальнай ідэі. Сфармуляваць адносіны да палітычнага вырашэння пытанняў рэалізацыі нацыянальнай ідэі.

3. **Задачы (***калі ласка, дапоўніце***)** *(падаецца, што задачы павінны быць канкрэтнымі і выконваемымі, прымаючы да ўвагі абмежаванасць сродкаў для іх рэалізацыі)***:**

- Патрымліваць ідэю аб гістарычнай унікальнасці беларускай нацыі, якая павінна падтрымліваць добрыя адносіны са славянскімі народамі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы і з іншымі народамі свету; сфармуляваць адносіны да ідэі трыадзінства усходнеславянскіх народаў;
- Вызначыць адносіны да Расіі і Польшчы;
- Вызначыць суадносіны стратэгіі і дзяржавы ў сучасных умовах;
- Вызначыць суадносіны стратэгіі і рэлігіі ў сучасных умовах;
- Праводзіць аствэтніцкую дзейнасць у галіне гісторыі, культуры і традыцый беларускага народа (Полацкая дзяржава, ВКЛ); стварыць асветніцкі агульны канал на магчымых сродках інфармацыі – электронных і неэлектронных;

- Стымуляваць выкарыстанне мовы ва ўсіх сферах грамадскага і культурнага жыцця, вызначыць адносіны да двухмоўя; даць спасылку на “Стратэгію развіцця беларускай мовы ў XXI стагоддзі”; вызначыць адносіны да рэалізацыі прынятага “Закона аб мовах”;
- Заахвочваць людзей аддаваць дзяцей у беларускія садкі і школы;
- Заахвочваць ужыванне беларускай мовы на надмагільных надпісах;
- Даводзіць інфармацыю пра ўсе станоўчыя праяўленні беларускасці і рэагаваць на ўсе без выключэння праявы этнацыду беларусаў;
- Праводзіць працу з дзяржаўнымі работнікамі аб маральнай адказнасці за ўціск беларускасці (садкі, школы, сімволіка);
- Стымуляваць мясцовыя ўлады да змены савецкіх назваў (вуліц, пасёлкаў) на нацыянальныя;
- Папулярызаваць нацыянальных герояў і нацыянальныя даты (канкрэтна);
- Ганарыцца тымі дасягненнямі, які мае беларускі народ сёння.

## 4. Падыходы і сродкі рэалізацыі

У прэамбуле даць **“Кодэкс”** узаемаадносін паміж грамадзянамі Беларусі пры рэалізацыі стратэгіі (*можа быць абмеркаваны асобна*). У гэты раздзел пажадана даць асноўныя і нават агульнавядомыя маральныя прынцыпы ўзаемаадносін як паміж непасрэднымі удзельнікамі рэалізацыі стратэгіі, так і для тых людзей, якія будуць проста спачуваць яе рэалізацыі, уключаючы:

- Выключэнне фракцыйнасці;
- Адзіны падыход у вырашэнні пытанняў стратэгіі;
- Узаемапавагу і падрымку;
- Максімальнае карыстаньне мовай;
- Крытычнае і абгрунтаванае вядзенне спрэчак і дыскусій (напрыклад, выключэнне абраз, выкарыстанне неправераных фактаў, неталерантнасці да выказванняў думак апанентамі і інш.);

**Сродкі рэалізацыі** *(абмежаваныя ва ўмовах адсутнасці падрымкі дзяржавы)*

- Сродкі масавай інфармацыі;
- (арганізаваны) інфармацыйны канал\старонку для найважнейшых навін, якія ляжаць у рэчышчы выканання дадзенай Стратэгіі;
- Выданне кніг, заснаванне вэб-рэсурсаў;
- Сродкі грамадзян, мецэнатаў;
- Праекты.

*Артыкулы*

**Аляксандр Кашо: Гісторыя хлуслівага тэзісу аб тым, што Беларусь квазідзяржава, нацыя, якую прыдумалі бальшавікі**

Сітуацыя ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне значна змянілася за апошнія два гады - пачынаючы ад другога ўкраінскага Майдану, і далейшай агрэсіі, якая адбылася ў сувязі з ім: анексія Крыму, вайна на Данбасе. Гэтыя падзеі выявілі вялікі ўзровень ксенафобіі да суседніх народаў як расійскага грамадства ў цэлым, так і сучаснай расійскай улады, істэблішменту, у прыватнасці. Лагічнай вынікам і працягам такіх адносін стала інфармацыйная вайна, якую разгарнула расійская дзяржава супраць усяго свету, але найперш супраць суседніх дзяржаў. І трэба сказаць, што гэта асабліва і не хаваецца – кіраўніцтва Расіі на самым высокім узроўні заяўляе пра гэта. Прэзідэнт, сенатары, дэпутаты заклікаюць да такой вайны, і для вядзенне гэтай вайны выдзяляюцца вялікія сродкі.

Адным з тэзісаў расійскай інфармацыйнай вайны супраць суседзяў з’яўляецца тэзіс аб тым, што Беларусь і Украіна ёсць квазідзяржавы, нацыі, якія прыдумалі бальшавікі. Хаця ёсць і іншыя падварыянты гэтага тэзісу, напрыклад, што нас прыдумалі палякі ці аўстрыйцы.

Гэта абсалютна лжывае сцверджанне, якое сёння могуць паўтараць толькі тыя, хто не ведае, альбо свядома ігнаруе гістарычныя абставіны часоў крушэння Расійскай імперыі і фармавання СССР. Разважанні аб штучнасці і несамастойнасці беларускай і ўкраінскіх нацый паўсталі і падтрымліваліся ў першаю чаргу сярод расійскіх эмігрантаў першай хвалі, якія былі высланы бальшавікамі з краіны, альбо самі былі вымушаны з’ехаць. У бальшавікоў была іншая стратэгія і ідэалагічныя ўстаноўкі ў нацыянальным пытанні, пра іх размова пойдзе крыху ніжэй.

Рэакцыя прадстаўнікоў расійскай эміграцыі, якія выказалі сваю нязгоду ў сувязі з тым, што бальшавікі далі беларусам і ўкраінцам права на фармальныя аўтаномныя рэспублікі ў складзе СССР была рознай: ад умерана крытычнай да рэзкага непрыняцця. Шмат з іх аперыравалі старой імперскай формулай – самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць – якую ўвёў у абарачэнне ідэолаг расійскай імперскасці граф Увараў у 1833 годзе як антытэзу дэвізу французскай рэвалюцыі – свабода, роўнасць, братэрства. З гэтага пастулату – самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць – выводзілася і непадзельнасць Расіі як імперыі. Шмат каму з тагачаснай расійскай эліты здавалася

і верылася, што ў гэтых трох словах палягаюць усе неабходныя абгрунтаванні права імперыі на панаванне над іншымі народамі.

Адным з пачынальнікаў гэтай традыцыі быў расійскі рэлігійны філосаф Н. Бярдзяеў, які яшчэ ў 1917 пачаў наступ на правa народаў былой Расійскай імперыі на самавызначэнне, у сваёй брашуры «Інтэрнацыяналізм, нацыяналізм і імперыялізм» ён піша: «Украінскі сепаратысцкі рух ёсць самы трывожны і самы абуральны факт у раскраданні і раздзіранні Расіі, якое зараз адбываецца. Украінскае нацыянальнае самавызначэнне, заўсёды было па прыродзе сваёй не ў меру разадзьмутым правінцыялізмам ... Аўстрыя даўно марыць аб аддзяленні Маларосіі ад Расіі для паслаблення і прыніжэння Расіі… Украінскі народ ёсць неадрыўная частка Расіі. Існуе адзіны рускі народ, адзіная вялікая Расія, адзіная руская дзяржава ... Украінскі сепаратызм ёсць здрада рускай ідэі ў свеце, здрада рускай культуры, здрада мінуламу народа і яго вялікаму будучаму ў імя дробных пачуццяў, спароджаных часовымі ўмовамі».

Выказваўся супраць украінскай самастойнасці і расійскі лінгвіст, культуролаг, заснавальнік еўразійства Н. С. Трубяцкі ў сваім артыкуле «К украинской проблеме» ў 1927 годзе. Але гэты аўтар рабіў націск не на палітычны, а на культурны фактар. Культурны сепаратызм украінскай і беларускай нацый, якія ён называў абагульнена Заходняй Руссю і супрацьпастаўляў Маскоўскай Русі, хваляваў яго болей, чым сепаратызм палітычны. Ён лічыў, што ўкраінская і беларуская культура можа мець месца толькі ў якасці ніжэйшага паверху: «Бесстаронне ўзважваючы шанцы, прыходзім да высновы, што наколькі верагодна і праўдападобна, што новая ўкраінская культура здавальняюча вырашыць задачу прыстасавання ніжняга паверха культурнага будынка да народных каранёў, настолькі ж зусім неверагодна, каб гэтая культура колькі небудзь здавальняюча магла вырашыць іншую задачу, - стварэння новага «верхняга паверху», здольнага задаволіць вышэйшыя запыты інтэлігенцыі ў большай меры, чым адпаведны верхні паверх ранейшай, агульнарускай культуры.» [7]

Што тычыцца тых, хто будзе спрыяць умацаванню і развіццю ўласнай нацыянальнай культуры «верхняга паверха», а не служыць развіццю «агульнарускай высокай культуры» (чытай расійскай), то яны называюцца Трубяцкім «вузкімі і фанатычнымі краёвымі шавіністамі, якія не дараслі да чыстага цанення вышэйшай культуры радзі яе самой», гэтыя «бяздарныя і пасярэднія творцы» жадаюць такім чынам агарадзіцца ад канкурэнцыі. Паколькі самастойная ўкраінская культура будзе «вартым жалю сурагатам, не культурай, а карыкатурай», аўтар эсэ «К украинской проблеме» прыходзіць да наступнай высновы: *«Каб пазбегнуць вышэйакрэсленага жаласнага будучага ўкраінская культура павінна быць пабудаваная так, каб не канкурыраваць з*

*агульнарускай, а дапаўняць сабой агульнарускую, іншымі словамі, украінская культура павінна стаць індывідуацыяй культуры агульнарускай… Тыя ж прынцыпы і меркаванні павінны быць закладзены ў аснову размежавання сфер агульнарускай і беларускай, вялікарускай і г.д. абласных культур.»* [7]

Яшчэ адзін дзеяч расійскай эміграцыі Мікалай Лоскі, прадстаўнік рэлігійнай і інтуітыўнай філасофіі ў артыкуле «Украинский и белорусский сепаратизм» (1958 г.) апублікаваным у часопісу «Грані», працягнуў традыцыю расійскага вялікадзяржаўнага адмаўлення права народаў на самавызначэнне: «Выпрацаваная Еўропай высокая культура, каштоўная для ўсяго чалавецтва, працягвае развівацца з рознымі варыяцыямі ў шэрагу еўрапейскіх дзяржаў.

…у кожнай з іх маюцца асобы, якія адштурхваюцца ад вялікага нацыянальнага цэлага і якія аддаюць перавагу асаблівасцям сваёй правінцыі.

Яны хацелі б узвесці сваю правінцыю на ступень нацыі, якая ўтварае самастойную дзяржаву... Далей сваёй званіцы яны нічога не бачаць…

У наш час сярод украінцаў-эмігрантаў моцна развіўся ўкраінскі нацыяналізм, прасякнуты нянавісцю да Расіі, які даходзіць да сцвярджэння, што вораг нумар адзін - не камунізм, а рускі народ. Пасля падзення савецкай дыктатуры такія ўкраінцы хочуць аддзялення Украіны ад Расіі і ўтварэння ад яе самастойнай дзяржавы.

... У наш час з'явіўся і беларускі сепаратызм. Пра яго пасля разгляду ўкраінскага сепаратызму можна выказаць вельмі каротка аналагічныя меркаванні.» [4]

Гісторыя паказала, што многія прадстаўнікі расійскай эміграцкай інтэлігенцыі не ведалі і не разумелі свайго ўласнага народа. Паглыбіўшыся ў схаластычныя, адарваныя ад сапраўднага жыцця разважанні аб велічы і асаблівай місіі расійскага народу, яны згубілі сувязь з рэчаіснасцю. І вось гэтыя людзі, якія пацярпелі ашаламляльную паразу ў выніку перавароту 1917 году, якія так і не зразумелі прычыну сваёй паразы, пачалі сцвярджаць з пазіцый пераможцаў, што, маўляў, Беларусь і Украіна штучныя ўтварэнні. Пакуль яны палымяна абвяшчалі тры асноўныя стаўпы існавання імперыі – самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць, з якіх выводзілася непадзельнасць Расіі як імперыі – бальшавікі пры маўклівай згодзе расійскага народу бралі ўладу, і потым пры такой жа маўклівай згодзе выпіхнулі з краіны гэтых абаронцаў старой імперыі і стварылі новую. А ўвасабленне старых прынцыпаў – самадзержца, расстралялі разам з усёй сям'ёй.

Расійскі ж народ, які на думку вялікай часткі расійскіх інтэлігентаў з'яўляўся боганосцам і павінен быў выканаць асабліваю ролю духоўнага прыкладу сярод

народаў, пакінуў гэтую падзею па-за ўвагай як нязначнаю, як не вартую клопату. Не малы кошт прыйшлося заплаціць расійскім інтэлектуалам за свае памылковыя погляды: яны страцілі краіну, Радзіму. Можна зразумець чаму Ленін адмаўляў расійскай інтэлігенцыі ў званні розуму нацыі.

Сітуацыя, якая склалася ў савецкай Расіі падчас грамадзянскай вайны была катастрафічная. Насамрэч перамога бальшавікоў не была такой безумоўнай як тое ўяўляецца сённяшнім расійскім дзеячам, ідэолагам і прыхільнікам «рускага свету», ім здаецца, што ўсталяванне нацыянальных рэспублік было гэткай блазнотай з боку Леніна. Каб утрымаць уладу бальшавікі пайшлі на некаторыя важныя саступкі, якія не адпавядалі іх першапачатковай ідэалогіі, пабудаванай на марксізме.

Такой саступкай стала перадача зямлі сялянам, у той час як па вучэнню марксізму зямлю трэба было абагульняць і ствараць на ёй камуны. За такі адыход ад чыстага марксізму бальшавікоў крытыкавалі. У прыватнасці Роза Люксембург указвала на тое, што падзел зямлі створыць перадумовы для фармавання новага дробнабуржуазнага сялянскага саслоўя. Але як паказала практыка для бальшавікоў гэта была часовая саступка – сталінская калектывізацыя паклала канец усялякай незалежнасці сялян.

Акрамя гэтай саступкі бальшавікі паабяцалі народам мір, а таксама свабоду нацыянальнага самавызначэння, што з аднаго боку было часовай мерай, каб утрымацца ва ўладзе. А з другога гэта было лагічным развіццём марксісцкіх ідэй, ад якіх немагчыма было так запраста адмовіцца, бо ўлічваючы першапачатковую слабасць бальшавіцкай улады ім усё ж такі трэба было быць паслядоўнымі. У свядомасці марксістаў нацыі павінны былі паступова знікнуць, іх павінна была замяніць пралетарская інтэрнацыянальная супольнасць, але прыгнёт нацыі нацыяй, імперыялізм лічыўся заганнай, негатыўнай праявай капіталістычнага свету, а таму асуджаўся і павінен быў быць выкаранены.

Для таго, каб зразумець няпэўнасць і складанасць палітычнай, сацыяльнай і эканамічнай сітуацыі таго часу можна выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі. Зараз я прапаную звярнуцца да англійскага філосафа Бертрана Расэла, які ў 20-м годзе дваццатага стагоддзя прыняў удзел у наведванні савецкай Расіі у складзе дэлегацыі брытанскіх палітычных дзеячаў, пераважна з лейбарыстскай партыі. Расэл меў размову з Леніным, Горкім, сустракаўся з Троцкім і пакінуў даволі грунтоўныя і трапныя заўвагі і назіранні.

У выніку гэтага падарожжа Расэл напісаў працу пад назвай «Практыка і тэорыя бальшавізму», гэта праца даволі цікавая для нашага разгляду і мы будзем карыстацца заўвагамі аўтара наконт тагачаснай сітуацыі ў СССР. Вось што ён піша пра

складанасць сітуацыі: *«Ён сказаў [Ленін], што два гады таму ні ён, ні яго паплечнікі не разлічвалі выжыць у асяроддзі варожага свету. Яны выжылі дзякуючы сваркам і разыходжанням інтарэсаў розных капіталістычных краін; адыграла сваю ролю таксама сіла бальшавіцкай прапаганды. Ён сказаў, што немцы смяяліся, калі бальшавікі прапанавалі змагацца з гарматамі пры дапамозе ўлётак, але ход падзей даказаў, што ўлёткі не менш магутная зброя. Я не думаю, што ён усведамляе, якую ролю адыгралі ў гэтым рабочыя і сацыялістычныя партыі. Ён, здаецца, не ведае, што брытанскія лейбарысты зрабілі шмат, каб не дапусціць разгортвання буйных баявых дзеянняў супраць Расіі.»* [6, с. 24]

На думку Расэла бальшавікі не цешылі сябе надзеяй на сапраўдны мір з капіталістычнай Еўропай і Амерыкай, мір для іх гэта толькі часовая перадышка на шляху да сусветнай рэвалюцыі: «Мір паміж бальшавіцкай Расіяй і капіталістычнымі краінамі, сказаў ён [Ленін], не можа быць стабільным; стомленасць або ўзаемныя разлады могуць прымусіць краіны Антанты да заключэння міру, але ён перакананы, што мір гэты будзе непрацяглым. Я выявіў, што ён, як і іншыя камуністычныя лідары чакае ад заключэння міру і зняцця блакады значна меней, чым мы ў нашай дэлегацыі. Ён перакананы ў тым што нічога сапраўды каштоўнага нельга дасягнуць без сусветнай рэвалюцыі і знішчэння капіталізму.» [6, с. 22]

Ленін па назіраннях Расэла з’яўляецца надзвычай самаўпэўненным, нязломным артадоксам, сіла якога ў нясхільнай *«рэлігійнай веры ў евангелле ад Маркса, якое займае такое ж месца, што і вера хрысціянскіх пакутнікаў у царства нябеснае, але адрозніваецца меншым эгацэнтрызмам. Ён гэтак жа мала любіць свабоду, як хрысціяне, якія пацярпелі падчас праўлення Дыяклетыяна і адпомсцілі за гэта, калі прыйшлі да ўлады.» [6, с. 24]*

Нягледзячы на тое, што Расэл быў уражаны прастатой у паводзінах Леніна, а таксама яго верай у сваю справу і правату марксізму, для Расэла не засталося па-за ўвагай тое, што Ленін *«пагарджае вельмі многімі людзьмі і ў інтэлектуальным плане з'яўляецца арыстакратам.»* [6, с. 21]

Такія псіхалагічныя заўвагі неабходны для таго, каб зразумець, чым на самой справе былі саступкі бальшавікоў. З расэлаўскага аналізу вынікае, што такія саступкі былі часовымі і непазбежнымі, бо савецкая ўлада не была абсалютна папулярнай і ўтрымлівалася на дыктатуры камуністычнай партыі. Ніякіх сантыментаў і ілюзій да таго ж сялянства бальшавікі не мелі.

*«Ён [Ленін] распавёў аб падзеле сялян на багатых і бедных і пра тое, што прапаганда ўрада сярод апошніх супраць першых прыводзіць да актаў гвалту, падобна, гэта яго проста забаўляе. Паводле яго слоў, неабходнасць у дыктатуры ў*

*адносінах да сялянства захаваецца на няпэўна доўгі час з-за імкнення сялян да свабоднага гандлю.» [6, с. 23]*

Эканамічна бальшавіцкая ўлада знаходзілася ў даволі вялікім крызісу, так, напрыклад, царскія рублі цаніліся ў дзесяць разоў вышэй і былі больш распаўсюджаныя. Але як заўважае Расэл гэта цалкам заканамерныя наступствы, якія вынікаюць з тэорый Маркса.

*«З моманту рэвалюцыі ў кастрычніку 1917 г. Савецкі ўрад быў у стане вайны амаль з усім светам і ў той жа час сутыкнуўся з грамадзянскай вайной унутры краіны… На самой справе Расіі вельмі пашанцавала, што яна не трапіла ў яшчэ больш адчайную сітуацыю. Расія агромністая па тэрыторыі і з'яўляецца сельскагаспадарчай краінай, што дало ёй магчымасць супраціўляцца і ўварванню, і блакадзе лепш, чым гэта змаглі б зрабіць Вялікабрытанія, Францыя ці Нямеччына… Відавочна, што, калі б Вялікабрытанія паспрабавала ажыццявіць падобную рэвалюцыю, яна была б вымушана здацца пад уплывам голаду на працягу некалькіх месяцаў, сутыкнуўшыся з блакадай з боку Амерыкі.» [6, с. 85-86]*

Голад прымушаў працоўных савецкай Расіі з’язджаць у вёску дзеля таго каб пракарміцца, але гэта пераследвалася. Расэл прыводзіць урывак з рэзалюцыі 9-га з’езду камуністычнай партыі: «Трудавыя дэзерцірствы». З прычыны таго што значная частка рабочых у пошуках лепшых умоў харчавання, а нярэдка і ў мэтах спекуляцыі самавольна пакідае прадпрыемствы, пераязджае з месца на месца, чым наносіць далейшыя ўдары вытворчасці і пагаршае агульнае становішча працоўнага класа, з'езд адной з надзённых задач Савецкай улады і прафесійных арганізацый бачыць планамернаю, сістэматычную, настойлівую, суроваю барацьбу з працоўным дэзерцірствам, у прыватнасці шляхам апублікавання штрафных дэзерцірскіх спісаў, стварэння з дэзерціраў штрафных працоўных каманд і, нарэшце, заключэння іх у канцэнтрацыйны лагер». Выказваецца надзея распаўсюдзіць гэтую сістэму і на сялян:

«Параза белых армій, мірнабудаўнічыя задачы ў сувязі з неверагодна катастрафічным становішчам народнай гаспадаркі патрабуюць зусім выключнага напружання сіл пралетарыяту і ўключэння ў грамадскі працоўны працэс шырокіх сялянскіх мас.» [6, с. 51]

А вось што Расэл піша пра нацыянальнае пытанне ў савецкай Расіі: «У тэзісах, прадстаўленых Другому кангрэсу Трэцяга Інтэрнацыяналу (ліпень 1920 года), ёсць вельмі цікавы артыкул Леніна, які называецца «Першапачатковы накід тэзісаў па нацыянальнаму і каланіяльным пытаннях». Наступныя яе тэзісы ўяўляюцца мне асабліва прыцягальнымі.

«5. Сусветная палітычная абстаноўка паставіла цяпер на чаргу дня дыктатуру пралетарыяту, і ўсе падзеі сусветнай палітыкі засяроджваюцца непазбежна вакол аднаго цэнтральнага пункта, менавіта: барацьбы сусветнай буржуазіі супраць Савецкай Расійскай рэспублікі, якая групуе вакол сябе немінуча, з аднаго боку, савецкія рухі перадавых рабочых усіх краін, з другога боку, усе нацыянальна-вызваленчыя рухі калоній і прыгнечаных народнасцей, якія пераконваюцца на горкім вопыце, што ім няма выратавання, акрамя як у перамозе Савецкай улады над сусветным імперыялізмам.

6. Такім чынам, нельга абмяжоўвацца ў цяперашні час голым прызнаннем або абвяшчэннем збліжэння працоўных розных нацый, а неабходна весці палітыку ажыццяўлення самага цеснага саюза ўсіх нацыя- і каланіяльна-вызваленчых рухаў з Савецкай Расіяй, вызначаючы формы гэтага саюза адпаведна ступені развіцця камуністычнага руху сярод пралетарыяту кожнай краіны або буржуазна-дэмакратычнага вызвольнага руху сярод рабочых і сялян у адсталых краінах або сярод адсталых нацыянальнасцяў.» [6, с. 36]

Такім чынам, саступкі бальшавікоў у нацыянальным пытанні былі абумоўлены слабасцю бальшавіцкай улады, і спадзевамі Леніна на тое, што нацыянальныя рухі могуць аказацца часовымі хаўруснікамі на шляху барацьбы да сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Расійскія камуністы не стваралі нацыі, яны спадзяваліся скарыстацца набіраючымі моц нацыянальнымі рухамі ў сваіх мэтах. Гэта выдатна зразумеў ужо прыгаданы расійскі філосаф Трубяцкі, ён адзначаў, што адной з галоўных прычын таго, што савецкая ўлада «патурае культурнаму сепаратызму» з’яўляецца імкненне «абяззброіць сепаратызм палітычны». І сапраўды, бальшавікам неабходна было прыцягнуць на свой бок хаця б частку нацыянальна настроенай эліты: беларускай, украінскай і іншых народаў, раскалоўшы і паслабіўшы нацыянальныя рухі, у той час бальшавікам гэта было жыццёва неабходна.

На Беларусі бальшавікам прыйшлося пайсці на стварэнне БССР, бо існавала пагроза пабудовы на Беларусі незалежнай краіны, якая не пойдзе ў фарватары савецкай палітыкі па пераўсталяванні свету пад дыктатуру пралетарыяту. Заснаванне Беларускай Народнай Рэспублікі беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі прымусіла савецкіх камуністаў пайсці на такі крок.

Увогуле, карту беларускага нацыяналізму спрабавалі выкарыстаць і польскія ўлады. Так была створана Найвышэйшая рада на чале з Лёсікам, прадстаўнікі якой лічылі магчымым супрацоўніцтва з Польшчай, у той час як прадстаўнікі іншых беларускіх нацыянальных арганізацый палічылі немагчымым такое супрацоўніцтва. Напрыклад, партыя беларускіх эсэраў не магла па сваіх палітычных установках пайсці на

супрацу з польскімі ўладамі, у сувязі з чым, яны пайшлі на часовае замірэнне з бальшавікамі, дзеля барацьбы за незалежнасць Беларусі, якую бальшавікі насамрэч не збіраліся даваць. Варта адзначыць, што беларускія эсэры значна пераўзыходзілі бальшавікоў па колькасці, апошніх на Беларусі было каля 4 тыс., у той час як эсэраў было больш за 20 тысяч. Да гэтай лічбы трэба дадаць і шматлікія іншыя рухі, якія стаялі на пазіцыях нацыянальнай незалежнасці Беларусі, абвешчанай радай БНР.

Такім чынам, бальшавікі на Беларусі знаходзіліся ў яўнай палітычнай меншасці ў параўнанні з нацыянальнымі арганізацыямі і казаць, што беларускую нацыю прыдумалі бальшавікі з'яўляецца абсалютным ігнараваннем гістарычных фактаў. Бальшавікі скарысталіся нацыянальнымі рухамі для ўстанаўлення сваёй дыктатуры. Ужо пачынаючы з 20-х гадоў камуністы пачалі знішчаць палітычных апанентаў, спачатку гэта былі кропкавыя зачысткі, а ў выніку сталінскіх рэпрэсій 30-х гадоў амаль усе былыя прадстаўнікі беларускай партыі эсэраў (БПС-Р) былі рэпрэсаваны.

Як ужо адзначалася Ленін і яго саратнікі самі да канца не верылі ў сваю перамогу і не разлічвалі выжыць у варожай абстаноўцы. Але здольнасць Леніна да часовых кампрамісаў давала бальшавікам неабходную перадышку, дазваляла ім сабраць сілы. Аднак далёка не ўсе ў камуністычнай партыі былі згодны з такой палітыкай і ў пытанні нацыянальным часам перагібалі, імкнучыся як мага хутчэй уладкаваць дыктатуру пралетарыяту. Ленін здаецца добра ведаў узровень расійскага шавінізму, і ў сваіх нататках «К вопросу о национальностях или об «автономизации» (1922) ён пісаў:

«Пры такіх умовах вельмі натуральна, што «свабода выхаду з саюза», якой мы апраўдваем сябе, апынецца пустою паперкай, няздольнай абараніць расійскіх іншародцаў ад нашэсця таго сапраўднага рускага чалавека, вялікароса-шавініста, па сутнасці, падлюгі і гвалтаўніка, якім з'яўляецца тыповы рускі бюракрат».[3]

Так што Леніну прыходзілася стрымліваць сваіх калег па партыі: «Я баюся таксама, што тав. Дзяржынскі, які ездзіў на Каўказ расследаваць справу пра «злачынства» гэтых «сацыял-нацыяналаў», вызначыўся тут таксама толькі сваім сапраўдна рускім настроем (вядома, што абрусеўшыя чужынцы заўсёды перасольваюць па частцы сапраўдна рускага настрою) і што аб'ектыўнасць усёй яго камісіі дастаткова характарызуецца «рукапрыкладствам» Арджанікідзе. Я думаю, што ніякай правакацыяй, ніякай нават абразай нельга апраўдаць гэтага рускага рукапрыкладства і што тав. Дзяржынскі непапраўна вінаваты ў тым, што паставіўся да гэтага рукапрыкладства легкадумна.»[3] Але ўвесь гэты клопат аб нацыянальным раўнапраўі, як і было паказана пры дапамозе Б. Расэла, праяўляўся Ленінам дзеля адной асноўнай мэты: «варта пакінуць і ўмацаваць саюз сацыялістычных рэспублік;

аб гэтай меры не можа быць сумнення. Яна нам патрэбна, як патрэбна сусветнаму камуністычнаму пралетарыяту для барацьбы з сусветнай буржуазіяй і для абароны ад яе інтрыг.» [3]

У часы грамадзянскай вайны калі не было разумення таго, якая партыя ўрэшце прыйдзе да ўлады бальшавікі не карысталіся такой абсалютнай папулярнасцю як пра гэта сцвярджала савецкая прапаганда. Давайце разгледзім працэс прыходу да ўлады бальшавікоў на прыкладзе Клімавіцкага раённага цэнтру, што ва усходняй Беларусі. Першы камуніст з'явіўся ў Клімавічах у снежні 1917 году. Ім быў марак-балтыец Стратонік Жбанкоў, які быў прызваны яшчэ ў царскую армію. Ён прымаў удзел у бальшавіцкім Кастрычніцкім перавароце пасля чаго прыехаў ствараць савецкую ўладу на малую радзіму.

У сваёй воласці, у Касцюковічах Жбанкоў утварыў рэўком, які абраў Жбанкова дэлегатам на губернскі з'езд саветаў, што праводзіўся ў Магілёве. Там Жбанкоў атрымаў мандат на 3-ці Усерасійскі з'езд саветаў. Вярнуўся Жбанкоў у Клімавічы ў лютым 1918. Па вяртанні ён аб'явіў, што бярэ на сябе ўладу ва ўсім павеце і паабяцаў у хуткім часе склікаць павятовы з'езд саветаў. У 115-ці кіламетрах ад Клімавічаў у мястэчку Унеча (зараз Бранская вобласць РФ) знаходзіўся бліжэйшы атрад чырвонай арміі. Жбанкоў звярнуўся з просьбай да камандуючага атрадам Шчорса, каб апошні дапамог са зброяй. Гэта просьба была задаволена. І ў бліжэйшыя дні ў Клімавіцкім павеце быў створаны атрад чырвонагвардзейцаў, у які ўвайшлі 9 чалавек. Крыху пазней быў скліканы павятовы з'езд саветаў, сярод дэлегатаў якога ў пераважнай большасці былі салдаты-франтавікі. І да вясны 1918 году колькасць бальшавікоў павялічылася да 7 чалавек. А да канца 1918 году партыйная арганізацыя налічвала ўжо каля 60 чалавек. У той час у Клімавіцкім павеце пражывала больш за 80 тысяч чалавек.

Далейшы лёс матроса Жбанкова быў звязаны з партыйнай працай. Спачатку ён перамяшчаецца ў суседні з Клімавічамі Чэрыкаўскі павет, дзе дапамагае тамтэйшым таварышам усталёўваць савецкаю ўладу. Потым ён працуе пад кіраўніцтвам Дзяржынскага ў ВЧК – АДПУ, пасля чаго быў заняты на адказных пасадах у Сібіры і ў Маскве.

А вось яшчэ некаторыя цікавыя вытрымкі з успамінаў іншага непасрэднага ўдзельніка тых падзей старшыні Клімавіцкага ЧК Ігната Марчанкі. «Прыбыў я ў студзені 1918 г. у сваю родную вёску Ерашоўка Клімавіцкага павета…Актыўна ўключыўся ў барацьбу за ўсталяванне савецкай улады… У ліпені 1918 году быў накіраваны ў Маскву на курсы агітатараў і палітынфарматараў…Хутка ад

сістэматычнага недаядання я сур'ёзна захварэў. Калі вярнуўся на курсы, тав. Тэадаровіч сказала, што Клімавіцкі павятовы камітэт РКП (б) адклікае мяне дамоў.

Працуючы інструктарам павятовага выканкама, я актыўна ўдзельнічаў у канфіскацыі лішкаў хлеба, арганізоўваў тыдні дапамогі франтам…змагаўся з кулацтвам, бандамі «зялёных».

Маладыя і малаадукаваныя людзі, мы з пралетарскім пачуццём вызначалі сваю лінію паводзін…Ужо будучы старшынёй ЧК, мне давялося весці напружаную барацьбу з сіламі мясцовай контррэвалюцыі. Так, у чэрвені 1919 году ўспыхнула паўстанне заможных сялян Надзейкавіцкай і Соінскай воласцей, арганізаванае нейкім белабандытам Вайтыгам. Пазней паўсталі кулакі Міласлаўскай воласці. Тут былі разагнаны сельскія саветы, забіты некаторыя сельскія актывісты.» [5, с. 146-147]

Менавіта такім чынам усталёўвалася савецкая ўлада на Беларусі. Такая сітуацыя была характэрна і для іншых паветаў усходняй Беларусі. Усе т. з. «кулакі», усе банды «зялёных», усе гэтыя шматлікія і амаль недаследаваныя лакальныя антыбальшавіцкія паўстанні альбо ўжо падтрымлівалі пэўныя нацыянальныя партыі і рухі, альбо былі патэнцыйнай сілай, якая б далучылася да барацьбы за незалежнасць Беларусі.

Пра такое непазбежнае развіццё падзей, пра тое, што нацыяналістычныя рухі і антыбальшавіцкія настроі сярод сялянства ў перспектыве злучацца ў адну плынь адзначаў на прыкладзе Украіны Н. Трубяцкі: «Што тычыцца да насельніцтва Украіны, то вядомыя пласты гэтага насельніцтва спачуваюць не столькі тым канкрэтным формам, якія прымае ўкраінізацыя, колькі таму, што гэты рух з выгляду накіраваны да аддзялення ад Масквы, - ад Масквы камуністычнай: такім чынам, культурны сепаратызм на Украіне сілкуецца антыкамуністычнымі («дробнабуржуазнымі» па савецкай тэрміналогіі) настроямі вядомых колаў насельніцтва». [7] Зразумела, што ў разуменні еўразійца Трубяцкога гэта з'ява мела негатыўны характар, і таму ён імкнецца падкрэсліць і прыдаць значэнне толькі прагматычнаму, матэрыяльнаму аспекту нацыянальных настрояў сялянства.

Такім чынам, станаўленне дыктатуры камуністычнай партыі праходзіла ў надзвычай складаных абставінах, таму бальшавікам неабходна было паспрабаваць прыцягнуць да сябе хаця б частку нацыянальна настроенай эліты. І гэта ў іх у пэўнай ступені атрымалася. Некаторыя беларускія дзеячы пайшлі на супрацу з бальшавікамі і ўвайшлі ва ўладныя структуры БССР. Але потым шмат хто з іх быў рэпрэсаваны, некаторыя невытрымаўшы цкавання ўчарашніх калег і абвінавачанняў у нацыянал-дэмакратычнай контррэвалюцыі скончвалі жыццё самагубствам (па афіцыйнай версіі) як Ігнатоўскі, Чарвякоў.

Савецкі ўрад у 21-25 гадах дваццатага стагоддзя абвясціў амністыю сваім палітычным праціўнікам. Гэта быў час калі бальшавікі адышлі ад палітыкі ваеннага камунізму, увялі НЭП, дазволілі развівацца нацыянальным культурам савецкіх рэспублік. Шмат тых, хто эміграваў падчас грамадзянскай вайны пачалі вяртацца назад. Многія дзеячы беларускай эміграцыі натхніўшыся тымі дасягненнямі ў нацыянальным будаўніцтве, якія так рэкламавалі бальшавікі, ў ліку якіх быў пісьменнік, грамадскі і дзяржаўны дзеяч акадэмік АН БССР Жылуновіч (Цішка Гартны), вярнуліся ў савецкую Беларусь, паверыўшы у аб'яўленую амністыю. За гэты свой крок ім прыйшлося дорага заплаціць каму свабодай, а многім і жыццём. Вельмі хутка бальшавікі згарнулі праграму беларусізацыі, аб'явілі прыхільнікаў беларусізацыі нацдэмаўскімі і фашысцкімі элементамі і амаль знішчылі беларускую нацыянальную эліту. Так было вырашана нацыянальнае пытанне, так на практыцы быў рэалізаваны падманны бальшавіцкі лозунг аб свабодзе народаў. Такім жа чынам, шляхам масавых рэпрэсій, быў рэалізаваны лозунг «зямля сялянам».

Адным з тых, хто паверыў бальшавікам быў Ф. Аляхновіч, выбітны беларускі пісьменнік, драматург, палітычны дзеяч. Аляхновіч прыехаў у савецкую Беларусь у 1926, яго арыштавалі праз пару месяцаў у 1927 годзе ў Менску і адправілі на Салаўкі. Адседзеўшы больш шасці гадоў, ён быў абмяняны савецкім урадам на Браніслава Тарашкевіча, які на той час адбываў пакаранне ў польскай турме. Вярнуўшыся ў Вільню, Аляхновіч здолеў напісаць кнігу ўспамінаў «У кіпцюрох ГПУ», у канцы якой апісаў падрабязнасці гэтага абмену.

«Я ўжо вырозьніваў твары людзей, якія да нас падыходзілі. Наперадзе йшоў нейкі высокі мужчына ў цывільнай вопратцы. Зь ім - з двума паліцыянтамі па бакох - той, каго польскі ўрад абменьваў на мяне: Браніслаў Тарашкевіч. У гэты мамэнт я адчуў ня толькі духовы, але й фізычны кантраст паміж намі. Вязень "капіталістычнага гаспадарства" меў на сабе прызваіты фільцовы капялюш, добра скроенае восеньскае паліто, беззаганна вычышчаныя боты... Савецкі вязень ішоў у старэцкім падзёртым кажуху на салавецкім бушлаце...

Тарашкевіч ішоў, гледзячы на мяне зь ня выразнай усьмешкай на твары.

…Ён із вастрогу пойдзе туды, дзе ўвесь вялізарны край - гэта адзін вялікі вастрог, дзе думка чалавечая сьцісьненая ў вабцугох савецкага абсурду, дзе ня толькі дзеяць і гаварыць, але й думаць і дыхаць трэба паводле аднаго, для ўсіх абавязковага шаблёну.» [1]

У гэтым урыўку сканцэнтравалася ўся сімвалічная трагічнасць Беларусі дваццатага стагоддзя. Трагічнасць гэта мае не адно вымярэнне. З аднаго боку не можа не ўражваць той факт, што Б. Тарашкевіч, пераходзячы савецкую мяжу, наіўна верыў у

тое, што атрымлівае свабоду. Насамрэч ён патрапіў з турмы ў турму, крыху пазней, у 1937 ён быў арыштаваны, а праз сем месяцаў расстраляны. Такі кошт ілюзій. З іншага боку, нягледзячы на тое, што Аляхновіч атрымаў уласную свабоду, краіна, за незалежнасць якой яны абодва змагаліся, яшчэ доўгі час будзе заставацца пад акупацыяй, яшчэ доўга будзе служыць чужым інтарэсам. Абмен на тым мосце гэта трагічны сімвал, беларускага лёсу, калі больш моцныя дзяржавы быццам на нявольніцкім рынку абменьваюць сына на сына той зямлі, якою падзялі паміж сабой на кавалкі, і на якой не па праву пануюць.

Гэтак было, але нам, тым, хто ўжо прызвычаіўся да існавання незалежнай Беларусі, часам пачынае здавацца, што назад той час ужо не вернецца. Аднак гэта не так. І тыя кпіны, знявагі з усяго беларускага, украінскага з боку шавіністычна настроеных прарасійскіх сілаў пацвярджаюць гэты непакой. Напрыклад, наконт Украіны кажуць, што яна не адбылася як самастойная дзяржава, і ўказваюць пры гэтым на эканамічны, палітычны крызіс, якім, між іншым, Украіна шмат у чым абавязана Расіі. Сам цяперашні прэзідэнт Расіі В. В. Пуцін некалькі год таму пераконваў сваіх калег па «Вялікай васьмёрцы» (да таго як Расія была выключана з гэтага клубу), што Украіна – не дзяржава. Але калі б на падставе наяўнасці крызісу можна было адмаўляць дзяржавам у праве на існаванне, то атрымаецца, што Расія ўжо шмат разоў была не дзяржавай.

Наогул, на гэтую тэму – несапраўднасці Беларусі, Украіны, як незалежных краін – шмат спекуляцый, якія як правіла выкананы ў традыцыі беспадстаўных схаластычных разважанняў. Адна з іх сцвярджае, што беларуская нацыя ніколі не змагалася за незалежнасць у сваім поўным складзе да апошняга чалавека, што незалежнасць на беларусаў звальвалася задарма. Гэта абсалютна няслушныя сцверджанні. Трэба задацца пытаннем, а грамадзяне якой краіны ў час свайго нацыянальнага станаўлення аднагалосна падтрымалі незалежнасць і змагаліся за яе. Можа ЗША? Падчас вайны за незалежнасць там была немалая колькасць людзей, якія ўсяляк падтрымлівалі каралеўскую ўладу: «лаялісты», «торі», «прыхільнікі Караля». А можа грамадзяне Францыі, якая стала гэткім хрэстаматыйным прыкладам станаўлення нацый на еўрапейскім кантыненце, былі маналітна адзінымі ў сваёй адданасці прынцыпам новай Францыі – свабода, роўнасць, братэрства? Дык не, там былі свае прыхільнікі старога ладу «раялісты» і была цэлая правінцыя – Вандэя, якая паўстала супраць рэвалюцыі. Ну а Германія? Ці не «жалезам і крывёю» аб’ядноўваў нацыю канцлер Бісмарк? На прыкладзе найбольш вялікіх нацый становіцца зразумела, што фармаванне незалежных нацыянальных дзяржаў супярэчлівы і неадназначны працэс, гэта заўсёды барацьба пэўных ідэй і эліт. Па вялікаму рахунку

змагацца за незалежнасць у сваім поўным складзе нацыя можа толькі тады, калі ўжо паўстала як незалежная нацыянальна дзяржава з сваім урадам, войскам.

Але не толькі шавіністычна настроеныя прарасійскія сілы ставяць пад сумнеў Беларусь як незалежную краіну і беларусаў як нацыю. Часам такія аргументы гучаць і з боку прадстаўнікоў дэмакратычнага, прагрэсіўнага еўрапейскага грамадства. «Расія некалі дазволіла краінам СССР стаць сувэрэннымі, а цяпер мае права захаваць сваю сфэру ўплыву», — такую заяву зрабіла ў Варшаўскім унівэрсытэце знакаміты францускі гісторык, сакратар Францускай акадэміі Элен Карэр д’Анкос, прадстаўляючы сваю новую кнігу «Шэсьць гадоў, якія зьмянілі сьвет. Падзеньне савецкай імпэрыі»… Сакратар Францускай акадэміі Элен Карэр д’Анкос — далёка ня першы інтэлектуал, які лічыць, што Францыя павінна ахвяраваць інтарэсамі малых постсавецкіх краінаў, каб захаваць добрыя стасункі з Расеяй.» http://www.svaboda.org/content/article/27357911.html

Відаць, свет яшчэ далёкі ад таго, каб на практыцы пачаць выконваць палажэнні прапісаныя ў статуце ААН аб тым, што нацыі маюць права на самавызначэнне, права якое рэалізоўваецца народамі знутры. Нам трэба ведаць, што аказваецца былыя імперыі маюць права на свае былыя калоніі на падставе таго, што некалі дазволілі калоніям стаць суверэннымі. Ва ўнісон з такімі заявамі, якую зрабіла сакратар Францускай акадэміі, расійскія па імперскі настроеныя інтэлектуалы, палітыкі, журналісты (а такіх на сёння пераважная большасць у расійскім істэблішмэнце), як мантру паўтараюць тэзіс аб тым, што Расія мае права на свае геапалітычныя інтарэсы. А мы – Беларусь, Украіна, Малдова і інш. – значыць, не маем сваіх геапалітычных інтарэсаў. Пры такіх ідэалагічных падыходах заходнія інтэлектуалы і вокам не маргнуць, не пашавеляць і пальцам, калі Расія адважыцца на далейшую эскалацыю канфлікту з Украінай, калі пачне рэалізоўваць свае тэарэтычныя ўстаноўкі аб тым, што мы фэйкавыя дзяржавы, якім належыць вярнуцца ва ўлонне «рускага свету».

Тэзіс аб тым, што Беларусь не сапраўдная дзяржава, нацыя, якую прыдумалі бальшавікі не мае пад сабой ніякіх падстаў. Трансліраваць і паўтараць яго могуць толькі людзі, якія не ведаюць гісторыю, забываюць тую складаную сітуацыю, у якой фармаваліся нацыі і нацыянальныя дзяржавы пасля развалу расійскай імперыі і дзесяцігоддзі да гэтага. Калі яны з пазіцый рускага нацызму пачынаюць сцвярджаць, аб тым, што беларусаў прыдумалі бальшавікі, ім напэўна здаецца, што палітычная сітуацыя ў Савецкім Саюзе была заўсёды такой адназначнай і непахіснай, якой яна была ў часы сталай сталінскай дыктатуры заснаванай на тэроры супраць народаў. Да гэтай катэгорыі нацыял-імперыялістаў трэба дадаць працаўнікоў расійскай

прапаганды і салдатаў інфармацыйнай вайны, якія за пэўную фінансавую ўзнагароду напаўняюць ілжывымі імперскімі, антыдэмакратычнымі тэзісамі інтэрнэтпрастору. Ні першая, ні другая катэгорыі ні думаць, ні ведаць не жадаюць, што Беларусь – гэта суверэнная дзяржава, а беларусы – нацыя, якая паўстала ў барацьбе з імперыяй на права існавання. Яны не хочуць ведаць, што насамрэч бальшавікі скарысталіся нацыянальнымі рухамі, а не стварылі іх. І што па вялікаму рахунку, ім не крытыкаваць трэба Леніна, а ўхваляць яго тактыку, бо адносна гнуткая палітыка ў дачыненні да нацыянальных рэспублік, паспрыяла таму, што Расійская імперыя, толькі ўжо ў выглядзе СССР, пратрывала яшчэ 70 год да аднаго з сваіх чарговых развалаў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Аляхновіч,Ф. У капцюрох ГПУ. http://knihi.com/Francisak_Alachnovic/U_kapciuroch_HPU.html
2. Бердяев Н. Интернационализм, национализм и империализм. М., 1917.
3. Ленин В. И К вопросу о национальностях или об "автономизации». http://revarchiv.narod.ru/vladimilitch/lenin45/avtonomisazia.html
4. Лоскій М. А. Украинский и белорусский сепаратизм. http://belaya-russia.narod.ru/civis/separatizm.htm
5. Памяць: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Клімавіцкі раён [Климовичский район] / Рэд.-уклад. Г. Л. Напрэеў; Рэдкал.: В. І. Аўдзеева, Р. І. Маслоўскі і інш. Мінск: Універсітэцкае, 1995. 647 с.
6. Рассел, Б. Практика и теория большевизма. М.: «Наука», 1991. 124 с.
7. Трубецкой Н.С. К украинской проблеме. [Электрон. ресурс]. - Режим доступа: http://oboguev.tripod.com/nstukr.htm

**Alexander Kasho: History of false thesis that Belarus is a quasistate, the nation invented by Bolsheviks**

*(Abstract, magazine “CULTURE, NATION”, December 2015, issue 12, pp. 8-22)*

One of the theses of the modern Russian information war against its neighbors is the idea that Belarus and Ukraine are quasistates, the nations invented by Bolsheviks. The analysis of the national question in Russia after the October Revolution, inclusively with the thoughts of Lenin, Rosa Luxemburg, Bertrand Russell, is presented. It is alleged that the positive steps of the Bolsheviks towards the national question (self-determination of nations, later belarusizatsyja) were due to the weakness of the Bolshevik government and Lenin aspirations that the national movements may be temporary allies in the fight for the world proletarian revolution. An example of the establishment of the Bolshevik power in Kostyukovichskij region of Belarus with the participation of comrade Zhbankov in conditions of nationalist movements and anti-Bolshevik sentiments is presented. The views of Berdyaev, Trubetskoy, Loskij and other Russian and non-Russian (Hélène Carrère d'Encausse) intellectuals who denied the right of the Ukrainian and Belarusian peoples to independent existence are critisized. All of this type of people do not think and do not want to know that Belarus is the sovereign state, and Belarusians is the nation that has emerged in the fight against the empire for the right to existence.

**Тэма: “СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ”.**

**Удзельнікі:** Аляксандр Кашо, Пётра Мурзёнак, Ірына Шумская, Алена Анісім, Алег Трусаў

Аляксандр Кашо **Беларуская нацыя - сучасны стан, мэты, задачы, падыходы**

Пётра Мурзёнак **Развагі аб стратэгіі развіцця беларускай нацыі**

Ірына Шумская **Беларусь у цывілізацыйным разломе**

Алена Анісім **Тэзісы да праекта “Стратэгія развіцця беларускай нацыі”**
Алег Трусаў **Тэзісы да праекта “Стратэгія развіцця беларускай нацыі”**



Аляксандр Кашо. Скончыў Беларускі Дзяржаўны Універсітэт па спецыяльнасці філасофія. Публіцыст. Сталы аўтар часопіса “КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ”.



Пётра Мурзёнак, заснавальнік і рэдактар часопіса “КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ”, доктар медыцынскіх навук



Ірына Шумская – культуролаг-даследчык, пісьменніца і грамадская актывістка. Кандыдат навук па культуралогіі, аўтар 11 кніг, 70 навуковых прац. Яе творы былі перакладзены на рускую, украінскую, польскую, нямецкую мовы. У якасці паэткі і перакладчыцы прымала ўдзел у шэрагу міжнародных фестываляў. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (з 2000), беларускага ПЭН-цэнтра (з 2011).

**Аляксандр Кашо: Беларуская нацыя - сучасны стан, мэты, задачы, падыходы**

***Увядзенне***

Гэты тэкст напісаны ў сувязі з прапановай рэдактара часопісу «КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ» Пётры Мурзёнка прыняць удзел у праекце - распрацоўцы «Стратэгіі развіцця беларускай нацыі». За гэтую прапанову я хачу выказаць сваю падзяку сп. Мурзёнку.

У сваім запрашэнні да ўдзелу ў праекце рэдактар адзначае, што па прычыне рознасці ў поглядах не проста будзе прыйсці да адзінства ў экспертных меркаваннях. І гэта так, бо цяжка ўявіць, што пазіцыя чалавека з ліберальнымі поглядамі цалкам супадзе з пазіцыяй чалавека, які прытрымліваецца поглядаў кансерватыўных, альбо сацыялістычных. Але пад некаторымі агульнымі ідэямі могуць аб'яднацца людзі з рознымі перакананнямі. Адной з такіх ідэй можа стаць ідэя пабудовы незалежнай дэмакратычнай краіны як увасаблення права на нацыянальны суверэнітэт беларускага народу. Гэтая ідэя прапісана ў Канстытуцыі.

«Мы, народ Рэспублікі Беларусь (Беларусі), зыходзячы з адказнасці за цяперашні стан і будучыню Беларусі, усведамляючы сябе паўнапраўным суб’ектам сусветнай супольнасці і пацвярджаючы сваю прыхільнасць да агульначалавечых каштоўнасцей, грунтуючыся на сваім неад’емным праве на самавызначэнне, абапіраючыся на шматвяковую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці, імкнучыся зацвердзіць правы і свабоды кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, жадаючы забяспечыць грамадзянскую згоду, непахісныя ўстоі народаўладдзя і прававой дзяржавы, прымаем гэтую Канстытуцыю — Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь.»

Такім чынам, з гэтага вынікае: кожны, хто паздзяляе гэтую ідэю, не гледзячы на свае палітычныя перакананні, можа далучыцца да абмеркавання гэтай тэмы. Што тычыцца асабіста мяне, то прымаючы прапанову, выдатна разумеючы маштаб і складанасць такой тэмы, а таксама абмежаваныя магчымасці канкрэтнага чалавека, хачу адзначыць, што я свабодна выказваю свой пункт гледжання, не прэтэндуючы на дасканаласць і апошнюю ісціну.

Могуць узнікнуць сумненні, а ці варта наогул займацца такой працай. Думаю варта. Адзін толькі аналіз сучаснага стану будзе карысным: трэба выяўляць і называць тыя праблемы, з якімі прыходзіцца сутыкацца ў працэсе рэалізацыі права беларускага народу на існаванне і развіццё. Што тычацца мэт і задач Стратэгіі, то ў гэтым

пытанні напэўна карысным будзе выяўленне як агульных, універсальных падыходаў у справе развіцця нацыянальнай супольнасці, так і пералік канкрэтных захадаў пры рэалізацыі Стратэгіі як інструкцыі да дзеяння. Праўда, неабходна заўважыць, што такія канкрэтныя задачы будуць змяняцца ў новых палітычных абставінах.

## 1. Стан беларускай нацыі

*Даследаванне стану беларускай нацыі сёння натыкаецца на цяжкасці звязаныя з немагчымасцю праводзіць рэпрэзентатыўныя сацыяльныя даследаванні, як тое мае месца ў краінах са сталымі дэмакратычнымі сістэмамі. У аўтарытарных краінах, якой на дадзены момант з'яўляецца Беларусь, у грамадстве існуе пэўны ўзровень страху. Таму па некаторых пытаннях, асабліва палітызаваных, даведацца аб сапраўдным становішчы грамадства цяжка. У Беларусі, як і ў іншых аўтарытарных краінах, улада кантралюе сродкі масавай інфармацыі, таму можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ў нас адсутнічае свабода слова, а таму ў даследаваннях беларускай нацыі, беларускага грамадства трэба заўсёды мець на ўвазе, што ў дэмакратычных умовах, у выпадку разняволення СМІ грамадская думка значна зменіцца літаральна за месяцы і нават тыдні, шмат па якіх пытаннях.*

Трэба адзначыць, што сучасная ўлада баіцца па сапраўднаму незалежных даследаванняў грамадскай думкі. У сувязі з чым у 2013 годзе былі прыняты папраўкі ў адміністрацыйны кодэкс, згодна з якім прадугледжваецца адказнасць за правядзенне няўзгодненых з уладай сацыялагічных апытанняў.

*Пачынаючы аналіз сучаснага стану беларускай нацыі, трэба ў першую чаргу звярнуць увагу на стан нацыянальнай адукацыі. Сёння шматлікія адмыслоўцы б'юць трывогу і кажуць пра катастрофу ў галіне адукацыі. За дваццаць гадоў кіравання цяперашні рэжым здолеў разваліць вышэйшую школу. Рэзка знізіўся ўзровень выпускнікоў вузаў. Крызіс вышэйшай адукацыі закранае ўсе галіны, але найбольш ён праявіўся ў гуманітарнай сферы. Ад пачатку свайго праўлення цяперашні кіраўнік дзяржавы пачаў перапісваць падручнікі гісторыі, збліжаючы іх з савецкай інтэрпрэтацыяй гісторыі Беларусі.*

Асобным прадметам была ўведзена гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, у якой падзеі падаюцца з пункту гледжання савецкай гістарыяграфіі з невялікімі карэкціроўкамі на сучаснасць, на патрэбы і каштоўнасныя ўстаноўкі дзеючай улады (хаця калі ўжо і ўводзіць такі прадмет, то трэба было б уводзіць гісторыю Другой Сусветнай вайны). Ва ўсіх сярэдніх і вышэйшых вучэбных установах уведзена дысцыпліна «Ідэалогія беларускай дзяржавы», якая па сутнасці з'яўляецца фармаваннем культу цяперашняй

улады на чале з А. Лукашэнкам. Часы адведзеныя на сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны ў ВУЗах значна скараціліся, на некаторыя ў два разы, так, напрыклад, у 2012 годзе згодна з «Канцэпцыяй аптымізацыі зместу, структуры і аб'ёму сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі» скарочаны часы філасофіі, паліталогіі, эканамічнай тэорыі. Вывучэнне на беларускай мове скарацілася нават болей, чыму часы Савецкага Саюза.

Недахоп гуманітарнай адукацыі і палітычнай культуры, добра бачны на прыкладзе рэферэндумаў 1995, 1996, 2004 гадоў. Возьмем найменш палітызаванае пытанне. На рэферэндуме 96-га году 65% грамадзян прагаласавалі за тое, што дзяржава не павінна даваць справаздачу грамадскасці за фінансаванне ўсіх галін улады. Сам па сабе такі вынік галасавання раўназначны акту самазабойства грамадства. Толькі дэзарыентаванае, збітае прапагандай насельніцтва магло прагаласаваць такім чынам. Я зараз пакідаю ў баку той факт, што ўсе рэферэндумы былі незаконнымі і непрызнанымі дэмакратычнай міжнароднай супольнасцю, гэта так. Само вынясенне такога пытання на рэферэндум сведчыць пра нізкую палітычную культуру насельніцтва. Варта сказаць, што цяжкасці звязаныя з пераходам да дэмакратыі, да ўсеагульнага выбарчага права, былі ўласцівыя ў свой час і заходнім краінам. Малаадукаваныя людзі без усялякіх уяўленняў пра палітычную сістэму і сваёй ролі ў гэтай сістэме галасавалі даволі ірацыянальна. У сувязі з чым вядучыя тэарэтыкі дэмакратычнага ладу, напрыклад, Дж. Міль, прызывалі ўлады да пашырэння палітычнай адукацыі праз усеагульнае школьнае навучанне.

Сёння ў Беларусі мы бачым супрацьлеглы працэс. *Цяперашні рэжым за 20-ць год свайго праўлення не толькі не паспрыяў пашырэнню палітычнай культуры грамадства, а наадварот зрабіў шмат для яе знішчэння.* Сёння ад пэўнай часткі нашых грамадзян можна пачуць, што дэмакратыя гэта не зьмяняльнасць улады, незалежнасць галін улады, свабода слова, а распуста, тэрарызм і нестабільнасць, – гэта паказчык таго, як працуе прапаганда і таго, што для аўтарытарнай улады палітычная адукацыя грамадства не толькі не патрэбная, але і небяспечная.

Тое самае тычыцца і гістарычнай адукацыі. На гэту тэму я пісаў у сваім артыкуле «Плацэба для беларусаў» урывак з якога хачу прывесці, каб не паўтарацца:

«У сваёй працы «Аб карысці і шкодзе гісторыі для жыцця»… Ніцшэ дзяліў гісторыю на тры роды – манументальны, антыкварны і крытычны. Для разгляду нашай беларускай сітуацыі будзе цікава скарыстацца дадзенай формай. Коратка пра тое, што кожны з іх уяўляе. Манументальнай гісторыі прызначана папулярызатарская і выхаваўчыя роля, на гераічных прыкладах выбітных асоб, на захапленні велічнымі падзеямі, яна выхоўвае наступныя пакаленні. Антыкварная гісторыя павінна стаяць

на варце захавання гістарычнай спадчыны. Крытычная гісторыя пераглядае і пераасэнсоўвае гістарычныя падзеі, але робіцца гэта толькі дзеля таго, каб супольнасць мела магчымасць жыць далей, то бок, адкідваюцца ранейшыя нежыццяздольныя высновы і ўводзяцца новыя з пункту гледжання карыснасці для нацыянальнага здароўя. І кожны з гэтых трох родаў гісторыі адпавядае сваёй уласнай функцыі і садзейнічае жыццю толькі калі прымяняецца да месца і да часу. Інакш атрымоўваецца адваротнае – гіпастазаванне і павелічэнне ролі аднаго роду за кошт іншых прывядзе толькі да адмоўных вынікаў.

Таму, хто хоць крыху ведае становішча гістарычнага выхавання ў сучасным беларускім грамадстве, цалкам зразумела, што ў нас тры вышэйзгаданыя роды гісторыі і блізка не знаходзяцца ў гарманічным адзінстве. У цяперашняй афіцыйнай манументальнай гісторыі пераважаюць каштоўнасныя погляды і міфы савецкага перыяду, памяць і адлюстраванне ролі большасці выбітных гістарычных асоб і падзей падменены альбо выціснуты. Стаўленне да антыкварнай гісторыі яскрава праяўляюцца ў адносінах да гістарычных помнікаў і артэфактаў важных для беларускай нацыянальнай культуры, гэтыя адносіны вельмі часта набываюць знішчальны характар. А вось крытычны накірунак у нас яўна пераважае і ўяўляе небяспеку для нацыі, прычым, пануе яго штучная і антыбеларуская версія.

Пачынаючы ад шкоднага ўздзеяння на дзяржаўным узроўні, калі пад дзейсны рэжым перапісваецца гісторыя, калі вядзецца пераслед выкладчыкаў за выданне праўдзівай гістарычнай літаратуры, нязручнай сучаснаму рэжыму, альбо калі праплачаныя рэжымныя ідэолагі зневажаюць выбітныя постаці нашай гісторыі…гледзячы на ўсё гэта становіцца цалкам зразумела, што ў нас з большага развіваецца толькі крытычная гісторыя і не на карысць Беларусі.» ( «Плацэба для беларусаў» http://sakavik.net/2013/12/14)

*Сёньняшні свет называюць інфармацыйным грамадствам. Гэтым падкрэсліваецца, што інфармацыя, інфармацыйныя тэхналогіі, маюць выключнае значэнне для развіцця і існавання грамадства. Трэба канстатаваць, што існаванне беларускай нацыі праходзіць у сітуацыі калі дзеючы рэжым падпарадкаваў сродкі масавай інфармацыі і пазбавіў народ права на свабоду слова і атрыманне інфармацыі, парушыўшы пры гэтым Канстытуцыю. «Артыкул 34. Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя.»*

*Беларуская нацыя, існуючы ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму, цярпела і працягвае цярпець рэпрэсіі. Прычым рэпрэсіі звязаны не толькі з парушэннем правоў асобы, але і з выкарыстаннем беларускай мовы і нацыянальнай гістарычнай сімволікі, якая была адменена на незаконным рэферэндуме 1995-года. Напэўна не знойдзецца на сёння ніводнай краіны, дзе тытульная нацыя пераследуецца за свае нацыянальныя сімвалы так, як гэта зараз адбываецца ў нас.*

З рознай ступенню інтэнсіўнасці адбываецца ціск дзяржавы на нацыянальную культуру. Дзяржава пакінула месца толькі для такой нацыянальнай культуры, якая не супярэчыць ідэалогіі аўтарытарнага рэжыму. У Беларусі існуюць чорныя спісы музыкаў, пісьменнікаў іншых творчых прафесій, прычым у іх трапляюць не толькі за апазіцыйнае стаўленне да ўлады, а і проста за выразна беларускую накіраванасць творчасці. Беларускія выканаўцы і аўтары амаль выцеснены з дзяржаўных тэле і радыё каналаў. У Беларусі амаль няма сваёй поп-культуры і дзяржава не робіць нічога дзеля паляпшэння сітуацыі. Нацыянальнае кіно таксама амаль адсутнічае, нацыянальная тэлерадыёкампанія здымае фільмы згодна з густам цяперашняга кіраўніка краіны.

### 1.1. Узровень самаідэнтыфікацыі

*Аднак не гледзячы на негатыўны ўплыў цяперашняй улады на грамадства з яе антынацыянальнай накіраванасцю ёсць не мала станоўчых прыкладаў і неаспрэчных фактаў, што беларуская нацыя існуе і развіваецца. Першы і асноўны такі факт гэта апошні перапіс насельніцтва, які ў адрозненні, напрыклад, ад выбараў ці рэферэндумаў, якія праводзяцца цяперашняй уладай, збольшага можна прызнаць рэпрэзентатыўным. І на апошнім перапісу амаль 84 % насельніцтва назвалі сябе беларусамі - гэта дарагога варта. На перапісу ў 1989 годзе беларусамі назвалі сябе 78% насельніцтва такім чынам у адсоткавых суадносінах колькасць грамадзян беларускай нацыянальнасці вырасла. Гэта добры знак, улічваючы тое, што ў наш час у свеце ідзе размыванне ідэнтыфікацый. Такім чынам, галоўная ўмова існавання нацыі – самаўсведамленне – у беларусаў ёсць.*

*Таксама варта адзначыць, што пераважная большасць грамадзян Беларусі прыхільна ставіцца да беларускай мовы і беларускай культуры.* На гэтую тэму я пару гадоў таму напісаў артыкул «І мова, і каўбаса» які быў надрукаваны газетай «Наша Ніва», урывак з яго я хацеў бы прывесці тут, бо сітуацыя засталася прыкладна такая ж. «У беларусаў ніякай непавагі да сваёй мовы няма, падзел на нібыта варагуючых рускамоўных і беларускамоўных — надуманы, скіраваны на раз’яднанне…Просты працоўны можа не карыстацца роднай мовай на працы, дома, можа нават назваць роднай рускую, калі перапісчык саб’е з панталыку

ўдакладненнем, што родная мова — гэта тая, якую засвоіў у дзяцінстве. Але гэта не азначае, што ён не гатовы размаўляць па-беларуску і аддаць дзяцей у беларускую школу, калі для гэтага будуць спрыяльныя ўмовы. Свая мова беларусу, у тым ліку рускамоўнаму, уласцівая ўнутрана, іманентна.

... На апошнім перапісе беларускаю мову назвалі роднай 60% насельніцтва. Прыплюсуйце заблытаных удакладненнем пра «засвоеную ў дзяцінстве», больш карэктным для каланіяльных краін, і ўлічыце: ніхто не тлумачыў, што родных моў можа быць некалькі. І мы пабачым, што большасць жыхароў Беларусі станоўча ставяцца да беларускай мовы.

Так, ёсць невялікі адсотак людзей, якія ставяцца адмоўна. Часткова гэта тыя, хто мае дачыненне да ўлады і карыстаецца яе рэсурсам. Беларуская мова для іх — сімвал зменаў да горшага (хаця зразумела, што не ўсе з іх дрэнна ставяцца да мовы). Могуць адмоўна ставіцца да мовы і малаадукаваныя людзі з саўковымі стэрэатыпамі. Такія хутка пазбаўляюцца комплексаў пасля невялікай адукацыйнай лекцыі. Колькасць тых і другіх часта перабольшваюць, бо зневажаць беларускую мову пры цяперашнім рэжыме бяспечна, а вось бараніць — не заўсёды.

У моўных пытаннях беларусаў часта параўноўваюць з ірландцамі, аднак гэта не зусім карэктна. Там з часу абвяшчэння незалежнасці вядзецца актыўная праца па адраджэнні ірландскай мовы. У Беларусі, на дзяржаўным узроўні вядзецца праца па вынішчэнню мовы: зверху спускаюцца дырэктывы аб недапушчэнні беларусізацыі, парушаюцца правы беларускамоўных, за мову могуць звольніць, неадэкватна паставіцца ў судзе ці міліцыі і г.д. Пасля Другой сусветнай вайны, калі ірландцы ўзяліся за нацыянальнае адраджэнне, у нас пачалася чарговая хваля русіфікацыі. У тыя часы гарадам патрабавалася працоўная сіла, а сяляне імкнуліся вырвацца з галодных вёсак. Той, хто прыязджаў з вёскі ў горад, павінен быў пераходзіць на рускую мову, калі хацеў знайсці прыстойную працу.» («І мова, і каўбаса…» http://nn.by/?c=ar&i=110493)

*Такім чынам, можна адзначыць, што нацыянальнае самаўсведамленне ў беларусаў ёсць і колькасць грамадзян, якія лічаць сябе беларусамі ў краіне расце, але тым не менш ёсць і негатыўныя факты адносна нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Гэта перш за ўсё звязана з гістарычнай неадукаванасцю, якая склалася ў выніку таго, што пры Саюзе гістарычная адукацыя была аднабакова савецкай. Потым быў кароткі перыяд адраджэння, за які не магчыма было цалкам перайсці да выкладання гісторыі з беларускіх пазіцый і пабудаваць нацыянальную гістарычную школу. Ну а далей, як ужо адзначалася, новая ўлада на чале з Лукашэнкам перайшла да*

*згортвання праграмы адраджэння і вяртання да савецкага падыходу ў гісторыі Беларусі з невялікімі карэкціроўкамі.*

*Трэба адзначыць адну важную асаблівасць беларускай нацыі – вялікі адрыў нацыянальнай эліты ад асноўнай масы насельніцтва.* Вядома, што эліту можна разглядаць з аксіялагічных (каштоўнасных) і альтыметрычных пазіцый, першы падыход грунтуецца на пачатковым сэнсе паняцця «эліта» (гэта значыць «лепшае»). Маецца на ўвазе, што да эліты належаць індывіды, якія валодаюць больш высокімі інтэлектам, талентам, здольнасцямі ў параўнанні з сярэднімі паказчыкамі канкрэтнага соцыюма. Другі, альтыметрычны падыход, ацэньвае прыналежнасць да эліты па факце валодання індывідамі рэальнай уладай і ўплывам без жорсткай прывязкі да іх інтэлекту і маральна-этычных якасцяў. Я бяру паняцце «эліта» у першапачатковым значэнні гэтага слова. Я ўвогуле лічу, што альтыметрычны падыход не карэктны, бо семантыка слова супраціўляецца такому выкарыстанню, само слова эліта – гэта лепшы. Я думаю, што замест альтыметрычнага выкарыстання слова «эліта» трэба ўжываць паняцце «Істэблішметн». І хоць сучасны правячы клас, яўна не дацягвае і да гэтага паняцця ў сілу сваёй залежнасці, недзеяздольнасці, безаблічнасці, але ва ўсялякім выпадку гэта паняцце не абавязвае быць разумным і здольным. У строгім сэнсе паняццю «Істэблішметн» адпавядае толькі адзін чалавек у цяперашнім аўтарытарным рэжыме – сам кіраўнік гэтага рэжыму.

*На сённяшні дзень у Беларусі, у выніку вышэйзгаданай гуманітарнай катастрофы, адставанне асноўнай часткі насельніцтва ад эліты – у нацыянальнай гістарычнай адукацыі, у разуменні сваёй гісторыі далей 1917 году і такім чынам ідэнтыфікацыі сябе праз веданне вытокаў нацыянальнай гісторыі – даволі вялікае.*

Тут мы наўпрост падыходзім да тэмы адносін да нацыянальных дзяржаўных сімвалаў. Я не ведаю ці праводзіліся, якія сацыялагічныя даследаванні па гэтай тэме, але бясспрэчна тое, што *эліта (аксіялагічная) абірае гістарычнымі нацыянальнымі сімваламі: бел-чырвона-белы сцяг і герб Пагоню. Што тычацца большай часткі насельніцтва, то яна, здаецца, у асноўным абыякава ставіцца да гэтай тэмы, лічачы, што гэта не надта істотна (зноў адбіваецца недахоп гуманітарнай адукацыі).* Аднак мне не аднойчы прыходзілася чуць ад людзей, якія не надаюць вялікага значэння таму, якія сімвалы павінны быць, што ўсё ж такі бел-чырвона-белы сцяг эстэтычна больш прыгажэйшы. *Так ці інакш, а людзям прыходзіцца суіснаваць з цяперашнімі дзяржаўнымі сімваламі: бачыць іх падчас міжнародных сустрэч, на розных спартовых мерапрыемствах. У кожнага чалавека існуе патрэба ў ідэнтыфікацыі сябе з той ці іншай супольнасцю, а значыць і патрэба ў сімвалах, якія рэпрэзентуюць гэтыя супольнасці. Людзі непераборлівыя,*

*якія не маюць добрай гуманітарнай адукацыі, якія дрэнна ведаюць гісторыю, якія засяроджаны збольшага на здабыцці матэрыяльных каштоўнасцяў (што само па сабе не з'яўляецца нечым заганным) пасіўна прымаюць тыя сімвалы, якія ім навязвае дзяржава. Што тычацца эліты, то ў сілу лепшай адукаванасці і ўвагі не толькі да матэрыяльнага дабрабыту, але і да нематэрыяльных каштоўнасцей яна не ўспрымае цяперашнія дзяржаўныя сімвалы як рэпрэзентатыўныя, эліта ўспрымае іх хутчэй як сімуляцыю суверэнітэту. Тым не менш адзначым, што ў імкненні і тых, і другіх да ідэнтыфікацыі сябе праз пэўныя сімвалы ляжыць неабходнае кожнаму чалавеку ўсведамленне сябе часткаю пэўнай супольнасці, і ў гэтым імкненні і першых, і другіх супадаюць, бо гэтая супольнасць, да якой хочуць належаць у дадзеным выпадку – беларускі народ. Калі прыйдзе час і бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня" вярнуцца на сваё законнае месца дзяржаўнай сімволікі пераважная большасць грамадзян Беларусі будзе толькі вітаць гэтую падзею.*

## *1.2. Адносіны да незалежнасці і суверэнітэту*

*Па апошніх дадзеных НІСЭПІ за далучэнне да ЕЗ сёння прагаласавала 27,5%, «супраць» — 51,9%. За саюз з Расіяй выказаліся 32,6%, «супраць» 49,1%. З гэтага можна зрабіць выснову, што прыкладна 40% не лічаць неабходным далучацца да ЕЗ, ці Расіі. Калі ж прыняць пад увагу, што далучэнне да ЕЗ не азначае страту незалежнасці, то мы атрымаем сведчанне таго, што большасць беларусаў падтрымліваюць незалежнасць Беларусі. Дададзім да гэтага ўжо згаданыя цяжкасці ў правядзенні сацыяльных апытанняў у аўтарытарных краінах, адзначым таксама, што гэтае пытанне надзвычай палітазавана і недакладнасць у апытаннях будзе адносіцца перш за ўсё да таго пункту, які тычацца саюзу з Расіяй, такім чынам, што рэспандэнты, адчуваючы страх, будуць адказваць згодна з афіцыйнай пазіцыяй цяперашняга кіраўніцтва, якая мае выразна прарасійскі характар.*

Тут яшчэ трэба спытаць, а што рэспандэнты разумеюць пад саюзам з Расіяй? Шмат людзей, якія згодны на саюз з Расіяй, думаюць, што такі саюз гэта прыкладна тое становішча, якое мы маем сёння, то бок, рыторыка пра трыадзінства трох славянскіх народаў, бязвізавае перамяшчэнне і г. д. Бо згодна з цяперашнім курсам і прапагандай мы ўжо 20 год будуем саюз з Расіяй і шмат каму здаецца, што так і будзе надалей. Але калі гаворка пачынае ісці, што разам з такім саюзам да нас прыйдуць і расійскія парадкі і беспарадкі, то колькасць ахвотных да такога саюза рэзка змяншаецца. І так здарыцца калі на Беларусі згодна з Канстытуцыяй нарэшце будзе дасягнута свабода слова. Я думаю ў такім выпадку колькасць гэтай катэгорыі людзей у бліжэйшыя гады зменшылася б да 10-15 адсоткаў. Прывядзём прыклад недасведчанасці нашых грамадзян: далёка не ўсе з іх ведаюць, што ўступіўшы ў

АДКБ мы павінны будзем бараніць інтарэсы краін-удзельніц Арменіі, Казахстана, Кіргізіі, Расіі і Таджыкістана, то бок, ваяваць за гэтыя краіны ў выпадку агрэсіі з боку іншых дзяржаў, а таксама пры ўзнікненні ўнутраных канфліктаў. Дзяржаўная прапаганда нават не ўзгадвае пра такія бакі інтэграцыі з Расіяй.

### *1.3. Адносіны да дэмакратычных каштоўнасцей*

*Адносіны да дэмакратычных каштоўнасцей у беларускім грамадстве неадназначныя. З аднаго боку, калі паставіць пытанне пра неабходнасць дэмакратычных каштоўнасцей, такіх як справядлівыя выбары, свабода слова, вяршэнства права, падзел галін улады, то пераважная большасць адкажа, што так, такія каштоўнасць нам патрэбны. Калі ж наўпрост спытаць, а ці патрэбна нашай краіне дэмакратыя, то адсотак станоўчых адказаў будзе меней, хаця не думаю, што большасць адкажа адмоўна. Такая сітуацыя паўстала з-за таго, што ў выніку шматгадовай дзяржаўнай прапаганды як на Беларусі, так і той, што ідзе з Расіі, ёсць частка людзей, якія пад дэмакратыяй разумеюць зусім не тое, чым яна насамрэч з'яўляецца. У гэтай частцы людзей дэмакратыя асацыюецца з распустай, крызісамі, беспрацоўем і г. д.*

Вось напрыклад, кіраўнік МЗС Макей кажа, што Беларусь яшчэ не саспела да дэмакратыі: “Мы, вядома ж, маглі б увесці кіраваную дэмакратыю з панядзелка, з 9:00 раніцы, і ўсе жылі б па гэтай кіраванай дэмакратыі. Але Вы павінны выдатна разумець наступнае - я заўсёды кажу гэта нашым еўрапейскім партнёрам - нельга заснуць у таталітарным Савецкім Саюзе, а прачнуцца ў дэмакратычнай еўрапейскай краіне (то бок, міністр замежных спраў не лічыць, што Беларусь з'яўляецца на дадзены момант дэмакратычнай дзяржавай, як тое прапісана ў Канстытуцыі, - заўвага аўтара). Для гэтага патрабуецца пэўны час. І справа не ў кіраўніцтве Беларусі, а справа ў менталітэце, традыцыях, культуры народа, у эканамічнай сітуацыі, у звычках».

Тут мы бачым падвойную хлусню. Па-першае, не можа быць ніякай кіраванай дэмакратыі, бо дэмакратыя гэта найперш прынцып падзелу ўладаў, а таксама свабода слова, і такая сістэма па вызначэнню не можа быць кіраванай, як якое-небудзь ідэалагічнае мерапрыемства цяперашняй улады, яна, дэмакратычная сістэма, існуе дзякуючы прынцыпу стрымлівання і супрацьвагі. Па-другое, міністр хлусіць, што справа не ў кіраўніцтве, а ў менталітэце. Ён як прадстаўнік урада Лукашэнкі з’яўляецца адным з механізмаў гэтага рэжыму, які і не дае прасоўвацца дэмакратыі ў Беларусі праз адсутнасць сумленных выбараў, праз падпарадкаванне ўсіх галін улады аднаму чалавеку, праз пераслед палітычных апанентаў і тых, хто спрабуе выказаць крытыку ў бок улады. Такія развагі, якія зыходзяць ад палітыка

вышэйшага рангу, з'яўляюцца поўным абсурдам, здзекам над здаровым сэнсам і грамадствам.

### 1.4. Адносіны да Ўсход-Захад

Адносіны беларусаў да Ўсходу і Захаду могуць мець супярэчлівы характар. З аднаго боку амаль кожны скажа, што Беларусь гэта цэнтр Еўропы, з іншага знойдзецца катэгорыя людзей, якія скажуць, што мы ментальна бліжэй да Расіі, я думаю гэта не больш за тых 30 адсоткаў, якія на сённяшні дзень выказваюцца за далучэнне да Расіі. Але ізноў падкрэслім, што ў гэтым, як і ў іншых пытаннях, вялікую ролю мае адсутнасць свабоды слова і недахоп гістарычнай і палітычнай адукацыі. *Варта адзначыць, што эліта пераважна бачыць незалежную Беларусь часткай Еўропы, у той час як істэблішмент будуе саюзы з Расіяй.*

### 1.5. Дзяржава і нацыянальная ідэя

Нацыянальная ідэя гэта ідэя еднасці пэўнай супольнасці, якая ўсвядоміла сябе нацыяй. Каб нацыянальная ідэя мснавала павінна быць супольнасць людзей, якія залічваюць сябе да нейкай нацыі. *Для існавання нацыі неабходны як матэрыяльныя, так і ідэальныя каштоўнасці. У ідэальнай сферы, у сферы ментальнай, для існавання нацыі павінна быць нацыянальная культура, адукацыя, гісторыя.*

*Сучасная беларуская дзяржава – калі разглядаць яе як сістэму ўлады, якая ажыццяўляе кіраванне на тэрыторыі Беларусі, якая валодае правам і сродкамі на правядзенне культурнай, адукацыйнай палітыкі, а таксама выконвае функцыі адміністрацыйнага і крымінальнага кантролю над грамадствам – не адпавядае інтарэсам нацыянальнага суверэнітэту (нацыянальны суверэнітэт з'яўляецца дэмакратычным прынцыпам, рэалізацыя якога залежыць ад усведамлення нацыяй сваіх жыццёвых інтарэсаў, якія аб'ектыўна вынікаюць з умоў яе існавання і развіцця), не адпавядае, паколькі ў выніку ўзурпацыі ўлады аўтарытарны рэжым узяў на сабе права вызначэння нацыянальнай палітыкі, пазбавіўшы гэтага права народ Беларусі. Такім чынам, цяперашняя дзяржава (не краіна, а менавіта дзяржава) не адпавядае і знаходзіцца ў супярэчнасці з нацыянальнай ідэя.*

*Для аўтарытарнага рэжыму сфарміраванага А. Лукашэнкам незалежнасць Беларусі не з'яўляецца каштоўнасцю.* Так, напрыклад, падчас першых двух сваіх тэрмінаў прэзідэнцтва, калі ён спадзяваўся на тое, што зможа перамагчы на выбарах саюзнай дзяржавы і заняць пост прэзідэнта, нацыянальныя пытанні, нацыянальная культура былі пад табу. У той час у СМІ толькі і было размоваў што пра агульнаславянскае братэрства і трыадзінства народаў Беларусі, Украіны і Расіі. Пасля ўмацавання ў

расійскай палітыцы Пуціна, гэтыя спадзяванні растварыліся. Была абрана крыху іншая тактыка. У абмен на лаяльнасць Крамля Лукашэнка стаў гандляваць незалежнасцю.

Для прыклада можна прывесці словы Ул. Някляева, які ў адным з інтэрв'ю распавёў як Лукашэнка прапаноўваў яму месца галоўнага ідэолага: «Калісьці ён мне сказаў фразу, калі быў у нас перыяд нейкіх асабістых адносін: я быў старшынёй Саюза пісьменнікаў, і ён хацеў мяне мець прыдворным ідэолагам. Дык ён сказаў: «Цяпер трэба рускіх задобрыць. Вось прыйдзе час — мы ўсё вернем. «Пагоню» вернем, сцяг вернем, усё вернем» ( http://nn.by/?c=ar&i=65339). Мяркуючы па ўсім, па тым, што нічога не вернута, а ціск на нацыянальную культуру працягваецца, Лукашэнка вяртаць нічога і не збіраўся. Але ў гэтым эпізодзе паказальна тое, што ён фактычна прызнаўся: нацыянальныя сімвалы з'яўляюцца для яго прадметам гандлю. Гэта ж будзе тычыцца і незалежнасці. Заявы Лукашэнкі наконт незалежнасці носяць кан'юктурны характар і як паказвае практыка могуць мяняцца ў супрацьлеглы бок. Што тычацца фактаў то: Беларусь еўрапейская краіна, якая знаходзіцца ва ўсіх навязаных Расіяй саюзах, незалежнасць якой знаходзіцца пад пагрозай. Увогуле ў самой наяўнасці гэтай спрэчкі - ці змогуць некаторыя сённяшнія супярэчлівыя заявы Лукашэнкі паспрыяць незалежнасці Беларусі, ці гэта ўсё толькі кан'юнктурныя хістанні вырачаныя на страту незалежнасці – праяўляецца ўвесь абсурд і нікчэмнасць такіх спадзяванняў, гэта не нармальна, не здарова, каб лёс нацыі, яе нацыянальных каштоўнасцей залежалі ад палітычных інтарэсаў адной асобы.

*Усё пазітыўнае, што зроблена за апошнія 20 год, у плане развіцця беларускай нацыі, ёсць перш за ўсё заслугай і здабыткам беларускага грамадства, а не дзяржавы. Пашырэнне выкарыстання нацыянальных сімвалаў, пашырэнне цікавасці да роднай мовы, развіццё беларускамоўнай літаратуры і інш., – гэта ў пераважнай большасці выпадкаў ініцыятыва знізу. Сітуацыя на сёння выглядае так – там дзе дзяржава некаторы час не ідзе на рэпрэсіі пачынаюць расці і развівацца розныя нацыянальныя праекты, ініцыятывы (моўныя курсы, беларускамоўная рэклама, вытворчасць і распаўсюд рэчаў з нацыянальнай сімволікай і шмат іншага). Больш за тое, шмат такіх праектаў паўстаюць і развіваюцца насуперак і ў змаганні з дзяржаўнай лініяй (сітуацыя з кнігарняй «Логвінаў», затрыманні і канфіскацыя на мяжы беларускай літаратуры і інш.).*

### *1.6. Тэндэнцыя зменаў за апошнія 20, 50, 100 год*

Што тычацца змен, якія адбыліся за апошнія сто гадоў, то тут варта разглядаць кожны паказчык у асобнасці. Так, напрыклад, сітуацыя з ужываннем беларускай

мовы значна пагоршылася. Сто гадоў таму большасць беларусаў размаўляла па-беларуску. Пяцьдзясят год таму колькасць тых, хто размаўляў па-беларуску ў адсоткавым значэнні заставалася яшчэ высокай. Зараз ужыванне мовы, калі верыць перапісам насельніцтва, скарацілася як ніколі за апошнія сто гадоў. Што тычацца незалежнасці, то ў параўнанні з пяцідзесяці- і стогадовай даўніной сітуацыя невымерна лепшая, бо нягледзячы на ўсе складанасці на сёння мы маем незалежную Беларусь.

### 1.7. Выклікі

#### Унутранныя

Напрыканцы хочацца адзначыць тыя выклікі, з якімі даводзіца сутыкацца беларускай нацыі.

*Перш за ўсё, гэта унутраныя выклікі. Аўтарытарны, антыдэмакратычны рэжым стварае шмат перашкод для паўнацэннага развіцця беларускай нацыі і грамадства. Цяперашняя дзяржаўная сістэма не спрыяе ні нацыянальнай, ні гістарычнай, ні палітычнай адукацыі насельніцтва, якая неабходна нашаму грамадству. Дзяржаўная прапаганда пры адсутнасці свабоды слова навязвае грамадзянам памылковыя погляды, фармуе ілжываю карціну рэчаіснасці, насаджае апатыю і зняверанасць у іншыя шляхі і ў тое, што лепшыя ўмовы магчымыя.*

#### Вонкавыя

*Існуюць таксама і вонкавыя выклікі для беларускай нацыі і незалежнай дзяржавы. Гэта, перш за ўсё, наяўнасць побач з намі агрэсіўна настроенай Расіі, у якой узровень агрэсіі і нецярпімасці да іншых народаў дасягнуў небывалых паказчыкаў. Прычым такія настроі характэрны, як для асноўнай масы насельніцтва, так і для істэблішмэнту. Вялікую занепакоенасць выклікае дзейнасць Расіі ў інфармацыйнай сферы. Расія вядзе інфармацыйную вайну, бадай што, супраць усяго свету. У розных СМІ, рознымі ідэолагамі так званага «рускага свету» мусіруецца ідэя аб тым, што Беларусь і Украіна з'яўляюцца квазі дзяржавамі, нацыямі, якія прыдумалі бальшавікі.*

*Апроч гэтага беларуская нацыя, як і іншыя нацыі, сутыкнулася з сусветнымі працэсамі глабалізацыі, якія могуць несці пагрозу сцірання нацыянальных адметнасцяў. Як захаваць сваю нацыянальную адметнасць і пры гэтым не застацца тэхналагічна і эканамічна адсталай краінай – надзвычай важнае пытанне, якое чакае свайго вырашэння.*

### *1.8. Патэнцыял сіл для рэалізацыі нацыянальнай ідэі*

Патэнцыял для рэалізацыі нацыянальнай ідэі трэба шукаць у беларускім грамадстве. Якое ў пераважнай большасці падтрымлівае ідэю беларускай незалежнасці і прыхільна ставіцца да беларускай культуры. І перш за ўсё, як і ў любога іншага народа, у гэтым трэба абаперціся на беларускую эліту. Менавіта яна павінна стаць рухавіком нацыянальнага развіцця.

## 2. Мэта або чаго хоча беларуская эліта

### *2.1. Якую нацыю збіраецца будаваць беларуская эліта*

*Як ужо было адзначана беларуская нацыя існуе ў абмежаванай аўтарытарнай уладай інфармацыйнай прасторы. Таму ўзнікаюць цяжкасці ў вызначэнні той мэты, якую трэба ўзяць для выбудоўвання «Стратэгіі развіцця беларускай нацыі». Бо пры цяперашнім стане са свабодай слова нельга наладзіць паўнавартасны свабодны дыялог у грамадстве. Адным з арыенціраў у вызначэнні мэты дадзенай Стратэгіі могуць стаць палажэнні Канстытуцыі, якія дарэчы не заўсёды выконваюцца сучаснай уладай. Згодна з імі краіна павінна быць незалежнай і дэмакратычнай, дзяржава абавязана гарантаваць роўнасць усіх нацыянальнасцяў. Гэта азначае, што ў палітычным плане нам патрэбна грамадзянская нацыя з беларускай нацыянальнай ідэяй у сваёй аснове.*

«У наш час на першы план выходзіць ідэнтычнасць нацыянальная (у адрозненні ад часоў сярэднявечча) і пакуль нацыі існуюць, нам прыйдзецца рабіць выбар на карысць адной з магчымых на нашай зямлі нацыянальных ідэй. Зараз на дадзены момант амаль 84 адсодкі сучасных жыхароў Беларусі лічаць сябе беларусамі, таму і нацыянальнай ідэяй тут на Беларусі павінна быць беларуская. Яе вельмі актыўна спрабавалі знішчыць альбо прынізіць, па магчымасці маргіналізаваць расійскія імперскія, а потым і савецка-імперскія сілы. Галоўным ідэалагічным накірункам гэтай стратэгіі стаў заходнерусізм. Не аслабляе гэта ідэалогія свой ціск і зараз...

У дэмакратычнай дзяржаве на заканадаўчым узроўні павінна быць замацавана раўнаправнасць этнічных супольнасцей. Незалежная беларуская дзяржава з натуральнай неабходнасцю павінна гарантаваць усім прадстаўнікам іншых нацыянальнасцей магчымасць карыстацца сваімі мовамі, жыць паводле сваіх традыцый. Але, што тычыцца нацыянальных ідэй, то гісторыя паказала, што калі на нашай тэрыторыі спрабуе аформіцца польская нацыянальная ідэя, то атрымоўваюцца Усходнія Крэсы, а калі тут замацоўваецца расійская нацыянальная ідэя

атрымоўваецца Паўночна-Заходні край, пры розных палітычных сістэмах у розных варыянтах, але заўсёды як правінцыя імперыі, з усімі наступствамі гэтага статусу» ( «Плацэба для беларусаў» http://sakavik.net/2013/12/14).

### *2.2. Пытанні інтэграцыі*

*Што тычацца пытанняў міжнароднай арыентацыі Беларусі, пытанняў ваеннага супрацоўніцтва, то думаю, што большасць зараз абрала б варыянт нейтральнай дзяржавы і пазаблокавы статус, як тое і прапісана ў Канстытуцыі. Але для канчатковага вырашэння гэтага пытання неабходна вярнуцца да Канстытуцыі 1994 году, аднавіць дэмакратычны лад, і толькі дасягнуўшы гэтага можна, паступова наладзіўшы агульнанацыянальную дыскусію, вырашыць пытанне далучэння/недалучэння да ЕС, НАТО і г. д.*

### *2.3. Мірны характар нацыянальнай ідэі*

*Кожная нацыя, усвядоміўшы сябе нацыяй, імкнецца пабудаваць незалежную нацыянальную дзяржаву. Згодна з Канстытуцыяй Беларусь яшчэ і дэмакратычная краіна. Зыходзячы з гэтага неабходна канстатаваць, што з'яўляючыся на дадзены момант незалежнай краінай, суб'ектам міждзяржаўнага права, Беларусь яшчэ не адбылася ў поўнай меры як дэмакратычная і нацыянальная дзяржава, паколькі ў нас злосна парушаюцца правы чалавека і існуе сістэматычны ціск на нацыянальную культуру. Таму неабходна прыкласці ўсе намаганні дзеля таго, каб дасягнуць вышэйзгаданых прынцыпаў. Рабіць гэта неабходна ў межах закону, дэкларуючы мірны характар нацыянальнай ідэі. Асноўны шлях да гэтага ляжыць праз асвету, адукацыю.*

Але наш уласны досвед, досвед іншых краін паказвае, што дамагчыся гэтай мэты мірным чынам не заўсёды аказваецца магчымым, мы не ў стане прадвызначыць ход гістарычных падзей і прадухіліць негатыўныя накірункі развіцця гэтых падзей. Трэба рабіць сваю справу, а якім будзе рэалізацыя пакажа час. Калі мы прыйдзем да пастаўленай мэты – Беларусь, як нацыянальная незалежная дэмакратычная дзяржава – мірным шляхам будзе добра, калі гістарычныя абставіны складуцца так, што спатрэбіцца рэвалюцыйны шлях, то гэта напэўна ніхто не зможа прадухіліць. Можна канечне сказаць, што ніякай добрыя памкненні не вартыя чалавечага жыцця, можна на гэта запярэчыць, што каштоўнасці, якія мы цяпер лічым агульначалавечымі: свабода, дэмакратыя і інш, аплачаны ахвярамі шматлікіх герояў і пакутнікаў і напэўна ж не здарма, - усё гэта так. Але закон абавязвае кожнага бараніць краіну, Радзіму і канстытуцыйны лад.

## 3. Задачы

*У папярэднім раздзеле асноўнай мэтай для беларускай эліты была вызначана мэта пабудовы па сапраўднаму незалежнай нацыянальнай дэмакратычнай дзяржавы, з тым, каб далей была магчымасць існавання і развіцця беларускай нацыі і грамадства. Зразумела, што пры вяртанні Беларусі на дэмакратычны шлях развіцця шматлікія задачы, якія стаяць сёння перад намі ва ўмовах існавання аўтарытарнага рэжыму, страцяць сваю актуальнасць і паўстануць новыя задачы, але несумненна і тое, што некаторыя прынцыпы і ўстаноўкі неабходныя для існавання незалежнай дэмакратычнай нацыянальнай дзяржавы будуць мець універсальны характар.*

### *3.1. Падтрымліваць ідэю аб гістарычнай унікальнасці беларускай нацыі*

*Згодна з Канстытуцыяй беларускі народ, прымаючы Асноўны Закон, зыходзіць з таго, што Беларусь мае шматвекавую гісторыю дзяржаўнасці. Што з'яўляецца праўдай і можа быць пераканаўча даказана на гістарычных матэрыялах. Беларусь прайшла складаны шлях да незалежнасці, такі ж нялёгкі шлях прыйшлося прайсці большасці краін нашага рэгіёну. Пачынаючы ад першых протадзяржаўных саюзаў плямён на тэрыторыі Беларусі, праз першыя княствы, праз гісторыю ВКЛ беларуская дзяржаўнасць нарэшце ўвасобілася ў існаванні незалежнай Рэспублікі Беларусь. І ўсе названыя перыяды і звязаныя з імі падзеі з'ўляюцца часткай беларускай гісторыі, на якой трэба будаваць нацыянальную гістарычную і палітычную адукацыю, а таксама нацыянальнаю самаідэнтыфікацыю.* Зараз падчас актывізацыі Расіяй інфармацыйнай вайны супраць суседзяў робяцца актыўныя спробы расколу і аслаблення нацыянальнай ідэнтыфікацыі беларусаў і ўкраінцаў. Дастаткова прааналізаваць працу расійскіх тролей і агітатараў у інтэрнэце, падыходы ў іх адны і тыя, як ва Украіне, так і на Беларусі, адзін і той жа набор штампаў і ўстановак на раскол і насаджэнне апатыі.

Дэзінфарматарамі прадпрымаюцца спробы падзяліць нацыянальную свядомасць беларусаў на ўсходнікаў і заходнікаў, на жыхароў поўдня і поўначы (былі і зараз працягваюць існаваць розны ініцыятывы, інтэрнэтрэсурсы, якія займаюцца гэтай дзейнасцю, дакладна вядома, што частка з іх фінансуецца з расійскіх фондаў). Але адчувальных вынікаў такія спробы не прынеслі, таму далейшы раскол спрабуюць прышчапіць шляхам падзелу на беларусаў і ліцьвінаў, як на дзве гістарычна варожыя адна адной супольнасці. *Калі ліцьвінства падаецца, як супрацьлегласць беларускасці, а не як палітонім і частка нашай беларускай гісторыі, то гэта негатыўная накіраванае на раскол грамадства з'ява. Ворагам Беларусі трэба абавязкова разарваць ідэнтычнасць беларусаў.*

Апошнім часам у расійскіх СМІ пачалося цкаванне ліцьвінства як з’явы. Яно і зразумела, крамлёўскім ідэолагам для іх агрэсіі патрэбны ворагі-нелюдзі, патрэбна пастаянна некага на некага нацкоўваць. Такім чынам, калі народ Беларусі аднойчы, не вытрымаўшы, выступіць супраць аўтарытарнай улады і абярэ вольнае жыццё ў дэмакратычнай дзяржаве, то ўсіх прыхільнікаў пераменаў колькі б іх не было, расійская прапаганда назаве ліцьвінамі і натаўскімі запраданцамі, накшталт “бандэраўцаў” на Украіне, а ўлічваючы тое, што ўсе інформрэсурсы на Беларусі знаходзяцца ў руках Масквы, то знойдзецца пэўная частка насельніцтва, якая ў гэта і паверыць. Вось вам і грамадзянскі канфлікт. А калі ён яшчэ падмацуецца крывёю ў выніку якой-небудзь правакацыі, то вось вам і канфлікт на стагоддзе наперад. Такія метады імперыя дэманструе зараз на Украіне.

*Таму падмяняць беларускасць ліцьвінскасцю гэта з’ява варожая. Як і варожая адваротная ёй, калі з свядомасці беларусаў выбіваецца, той велічны перыяд нашай гісторыі, калі мы былі асноўнай часткай ВКЛ, і калі ліцьвінамі называла сябе беларуская шляхта, бо гэта быў палітонім. Нацый у сучасным разуменні тады ўвогуле не існавала. Такі падзел не менш небяспечны. Любому народу патрэбна гісторыя і ўсведамленне сябе ў гэтай гісторыі, гэта як асобнай чалавечай свядомасці для паўнавартаснага існавання ў свеце неабходна і актуальнае цяпер, і разуменне сваіх магчымасцяў у будучыні, і сваё мінулае. Без любой гэтай часткі чалавек, як і нацыя, - непаўнавартаснасць.* Таму любое супрацьпастаўленне альбо-альбо беларускага ліцьвінскаму з’яўляецца шкодным для нас. Ліцьвіны – гэта палітонім, якім акрэслівалі сябе ў сярэднявеччы продкі сучасных беларусаў, перш за ўсё, шляхта, што тычацца сялянства, то ў тыя часы людзі па ўсёй Еўропе ідэнтыфікавалі сябе па веры і па прыналежнасці да якога-небудзь цэнтру княства, гораду. Сам патрыятызм быў у тыя часы іншы, чым у час нацыянальных дзяржаў, ён быў з’явай лакальнай, бо служылі не нацыі ці дзяржаве, а феадалу, бо ўлада ў тыя часы мела свой падмурак у божай волі, і базавалася не на тэорыі грамадскай дамовы як цяпер, а мела сакральнае асэнсаванне. Тыя, хто прасоўвае гэтыя две шкодныя антыбеларускія ідэі, супрацьпастаўляючы ліцьвінскае беларускаму,
ведаюць, што яны займаюцца хлуснёй, таму бяруць не якасцю, а колькасцю, яны засмецілі сваімі аднастайнымі пастамі, мабыць, усе беларускія форумы ў сеціве. Абодва гэтыя вірусы павінны быць выяўлены і пазначаны.

### *3.2. Прыкласці ўсе намаганні, дзеля пабудовы адкрытай грамадзянскай супольнасці як унутры краіны, так і за яе межамі*

*Важнай задачай, якая стаіць перад беларускай нацыяй з'яўляецца пабудова грамадзянскай супольнасці. Грамадзянская супольнасць, узятая ў маштабе нацыі –*

*гэта такая супольнасць, якая праз арганізацыю розных ініцыятыў, рухаў, партый зможа ўзяць на сябе адказнасць у вырашэнні лёсавызначальных пытанняў краіны і грамадства. Аўтарытарнаму рэжыму можна супрацьстаяць толькі арганізаванай грамадзянскай супольнасцю. Прычым важна, каб такая супольнасць паўстала ў супрацоўніцтве беларусаў, як унутры краіны, так і за яе межамі. Грамадзянская супольнасць павінна быць, незалежна ад таго кіраўніцтва, якое ў дадзены момант знаходзіцца ва ўладзе, такая супольнасць будзе неабходна і пры дэмакратычнай дзяржаве.*

### 3.2.1. Стварыць шэраг інфармацыйных пляцовак: газеты, часопісы, радыё тэлебачанне пабудаваныя па прынцыпу грамадзянскіх СМІ

*Для рэалізацыі вышэйзгаданага неабходна пашырыць свабоду слова як праз ужо існуючыя незалежныя СМІ, так і праз заснаванне новых, якія будуць працаваць па прынцыпу грамадскіх СМІ, то бок, пад кантролем і ў шчыльным супрацоўніцтве з грамадствам, і пры фінансавым удзеле грамадства.*

У розных краінах існуюць грамадскія СМІ. Ва Украіне за 2-3 гады да Майдану 2014 года распачалі сваю працу некалькі тэлеканалаў, якія адыгралі вялікую ролю ў распаўсюдзе праўдзівай інфармацыі і стварылі здаровую канкурэнцыю іншым тэлеканалам.

*Стварэнне грамадскіх СМІ з'яўляецца першачарговай задачай, якая стаіць перад беларускай элітай. Цяперашні стан інфармацыйнай прасторы з'яўляецца крайне незадавальняючым. Калі грамадзянская супольнасць здолее стварыць такія СМІ, якія будуць цікавыя большасці грамадзян, якія будуць даваць прафесійную крытыку ўлады, раскрываючы механізмы працы аўтарытарнага рэжыму, якія адмоўна ўплываюць на жыццё і будучыню, як краіны ў цэлым, так і кожнага грамадзяніна ў асобнасці, тады перамены адбудуцца з непазбежнасцю.*

Можна не сумнявацца ў тым, што цяперашняя ўлада працягне свой ціск на сродкі масавай інфармацыі, што асноўная барацьба будзе ісці ў інфармацыйнай прасторы. Таму, каб перамагчы неабходна стварыць шэраг інфармацыйных пляцовак, якія колькасна і якасна змогуць пераадолець мур дзяржаўнай прапаганды і данесці праўду да кожнага грамадзяніна.

### 3.3. Суадносіны Стратэгіі і дзяржавы ў сучасных умовах

*Суадносіны «Стратэгіі развіцця беларускай нацыі» і цяперашняй дзяржавы мала супадаюць, прыклады гэтаму былі прыведзены вышэй і іх можна было б працягваць. Але калі прадстаўнікі дзяржаўных структур па нейкіх прычынах робяць нешта на карысць Стратэгіі, то зразумела гэта можна толькі вітаць, не забываючыся пры*

*гэтым, што спадзяваціца на сапраўднае паўнавартаснае супрацоўніцтва з аўтарытарнай дзяржавай не выпадае ў сілу таго, што сучаснае кіраўніцтва захапіўшы ўладу не разглядае грамадства ў якасці раўнапраўнага партнёра.*

*Што тычацца той дзяржавы, якая павінна паўстаць на Беларусі – дэмакратычная, незалежная, прававая – то інтарэсы такой дзяржавы і «Стратэгіі развіцця беларускай нацыі» павінны супасці.*

### 3.4. Суадносіны Стратэгіі і рэлігіі ў сучасных умовах

Беларусь з'яўляецца полірэлігійнай і шматканфесіянальнай краінай. На працягу гісторыі на нашай зямлі мірна суіснавалі розныя рэлігіі, прычым нашу рэлігійнаю талерантнасць можна паставіць у прыклад іншым. Але рэлігійны падзел нярэдка раз'ядноўваў беларуская грамадства ў палітычным сэнсе. З гэтага трэба зрабіць неабходныя высновы. Нельга ўмешвацца ў справы рэлігіі, але калі некаторыя канфесіі прасоўваюць антыбеларускія ідэі, то з гэтым трэба змагацца.

### 3.5. Асветніцкая дзейнасць у галіне гісторыі, культуры і традыцый беларускага народа

*Неабходна фармаваць беларускую культуру як элітарную, так і мас-культуру. Трэба адзначыць, што ў той час калі элітарная культура ў Беларусі, яшчэ хоць неяк існуе і развіваецца, то з масавай беларускай культурай справы значна горш, у нас амаль адсутнічае нацыянальная кіно, нацыянальныя беларускамоўныя забаўляльныя і пазнавальны праграмы на тэлебачанні. Доступ да эфіру і дзяржаўнага фінансавання маюць толькі тыя аўтары, творцы, калектывы, якія поўнасцю лаяльныя рэжыму.*

Беларускамоўнасць сама па сабе выклікае падазрэнне ідэолагаў цяперашняй улады, якія выдаюць дазволы на правядзенне канцэртаў, забаўляльных мерапрыемстваў. Каб правесці які-небудзь спектакль, канцэрт у раённым доме культуры трэба дазвол з абласнога ідэалагічнага аддзелу.

*У сучасных умовах нацыянальная эліта павінна ўзяць на сябе адукацыйную функцыю ў сферы гісторыі, паліталогіі, філасофіі і інш. У перспектыве неабходна стварыць асветніцкі нацыянальны канал, на які не зможа ўплываць і ціснуць ідэалагічныя структуры аўтарытарнага рэжыму.*

### *3.6. Выкарыстанне мовы ва ўсіх сферах грамадскага і культурнага жыцця*

*Развіццё беларускай мовы і існаванне беларускай нацыі гэта ўзаемазалежныя працэсы, таму неабходна стымуляваць выкарыстанне беларускай мовы. Пры гэтым трэба разумець, што пэўны час будзе існаваць двухмоўе чаго не варта баяцца - проста гэта дадзенасць. З часам сітуацыя выправіцца. Галоўнае дамагчыся рэальнага моўнага раўнапраўя, каб людзі не баяліся, што за ўжыванне роднай мовы імі, іх дзецьмі іх могуць чакаць праблемы, а той факт што беларусы з прыхільнасцю ставяцца да беларускай мовы дае падставы меркаваць, што мова зойме сваё належнае месца.* «Беларусы, як і іншыя паняволеныя народы, апынуліся ў становішчы экзістэнцыяльнага выбару. Між акупантамі і паняволенымі усталёўваюцца вядомыя адносіны, у гэтых адносінах ажыццяўляецца пэўны гандаль, то бок, імперыя метадам бізуна і перніка прапануе паступова адмовіцца ад святынь, мовы, нацыянальнасці, і ўзамен абяцае акупаваным права на жыццё, магчымасць гадаваць дзяцей, каб потым іх жа і выкарыстаць. А той, хто не адмаўляецца ад нацыянальных каштоўнасцей ідзе ў выгнанне, на катаргу, смерць, а затым свеціць зоркай прыкладу нашчадкам тых, хто адмовіўся…

Механізм моўнай асіміляцыі просты і ў агульных рысах аднолькавы для ўсіх народаў. І гэта трэба ўлічваць, а не наракаць на тое, што народ, пастаўлены на мяжу існавання, часткова саступіў імперыялістам. І той, хто наракае на народ за яго залішняю талерантнасць, аказваецца самым дрэнным прыкладам талерантнасці, бо з'яўляецца праваднікам палітыкі раз'яднання, спрыяе чужынскай палітыцы на Беларусі, замест пошуку шляхоў да яднання…

*У Беларусі дзяржаўнай мовай павінна быць толькі беларуская, гэта павінна стаць гарантам таго, што гвалтоўная русіфікацыя больш ніколі ўжо не паўторыцца.* Але я мяркую, што нават калі б існавала сапраўдная роўнасць між расійскай і беларускай мовамі, ва ўсіх сферах – у палітыцы, на тэлебачанні, радыё і іншых СМІ, у сферы адукацыі і г. д – беларуская мова заняла б належныя ёй пазіцыі – пануючыя. Культурнага патэнцыялу для гэтага ў нас дастаткова, патэнцыялу, які не данесены да шырокай аўдыторыі. …

*Для нас неабходна, каб беларуская мова была дзяржаўнаю, што тычацца астатніх, то як гэта было ў законе аб мове 1990 года : "Рэспубліка Беларусь…праяўляе дзяржаўны клопат аб свабодным развіцці і ўжыванні ўсіх нацыянальных моў, якімі карыстаецца насельніцтва рэспублікі, забяспечвае права свабоднага карыстання рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін народаў, стварае грамадзянам Рэспублікі Беларусь неабходныя ўмовы для вывучэння беларускай і рускай моў і дасканалага валодання імі*». («І мова, і каўбаса» http://nn.by/?c=ar&i=110493)

Таварыствам беларускай мовы распрацавана «Стратэгія развіцця беларускай мовы ў XXI стагоддзі» ( http://tbm.org.by/strategy ) мэта якой з'яўляецца: «стварэнне ўмоў для захавання і доўгатэрміновага развіцця беларускай мовы як жывой, штодзённай мовы беларускага народа». На гэту мэту варта арыентавацца і ў выкананні задач «Стратэгіі развіцця беларускай нацыі».

## 4. Падыходы і сродкі рэалізацыі

*Як адзначалася ва ўвядзенні аб'ядноўвацца трэба пад адзінай ідэяй, ідэяй неабходнасці існавання беларускай нацыі і незалежнай дэмакратычнай нацыянальнай беларускай дзяржавы як найлепшай формы існавання беларускага народа і ўсіх іншых народаў, якія жывуць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Для рэалізацыі гэтай ідэі неабходна прытрымлівацца пэўных прынцыпаў. Неабходна пазбягаць палітычных разнагалоссяў, якія звязаныя з пазіцыяй пэўных палітычных партый і рухаў – вышэйназваная ідэя можа ўключыць у сябе людзей з рознымі палітычнымі перакананнямі. Неабходна прытрымлівацца прынцыпу ўзаемапавагі як падчас абмеркавання Стратэгіі, так і падчас яе выканання. Адной з асноўных умоў развіцця беларускай нацыі з'яўляецца развіццё беларускай мовы, таму пры рэалізацыі і абмеркаванні Стратэгіі неабходна максімальна карыстацца беларускай мовай. Для паразумення ўдзельнікаў дыскусіі і дасягнення мэт Стратэгі неабходна імкнуцца да карэктнага вядзення спрэчак, якія непазбежна будуць узнікаць па такому жыццёвавеважнаму пытанню.*

### *4.1. Сродкі рэалізацыі*

Вышэй, у раздзеле «Стан беларускай нацыі», было адзначана, што *інтарэсы сучаснай аўтарытарнай дзяржавы і інтарэсы беларускага грамадства мала супадаюць, таму трэба мець на ўвазе, што ў рэалізацыі Стратэгіі мы зможам абаперціся перш за ўсё на сілы і сродкі самога беларускага грамадства.*

### *4.2. Сродкі масавай інфармацыі*

*Каб забяспечыць існаванне і развіццё беларускай нацыі ў цяперашнім свеце неабходна стварыць такую сістэму нацыянальных СМІ, якія змогуць данесці якасную і праўдзівую інфармацыю як да грамадзян Беларусі, так і да нашых суайчыннікаў за мяжой.*

*Для гэтага неабходна ствараць сродкі масавай інфармацыі, якія будуць дзейнічаць па прынцыпу грамадскіх СМІ, з удзелам, пад кантролем і пры фінансавай падтрымцы грамадства.*

*Верагодна на першых этапах развіцця Стратэгіі стварыць паўнавартасны грамадскі тэлеканал будзе цяжка, але стварэнне розных грамадскіх інтэрнэт-выданняў цалкам магчымае, якія з часам могуць на сваёй базе стварыць грамадскія тэлеканалы.*

### *4.3. Інфармацыйны канал Стратэгіі*

*Часопіс "КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ" можа стаць такой ініцыятывай, на базе якой будзе рэалізоўвацца інфармацыйная падтрымка і далейшае ідэйнае развіццё Стратэгіі.*

Важным накірункам дзейнасці павінна стаць спрыянне выхаду друкаванай і электроннай беларускай літаратуры, разлічанай на спажыўцоў з рознымі густамі, у розных сацыяльных і прафесійных сферах.

### *4.4. Сродкі для рэалізацыі Стратэгіі:*

- сродкі актывістаў і неабыякавых да лёсу нацыі і краіны людзей, адным словам грамадзянскай супольнасці;

- сродкі мецэнатаў;

- сродкі міждзяржаўных арганізацый.

**Пётра Мурзёнак: РАЗВАГІ АБ СТРАТЭГІІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ**

Неабходнасць распрацоўкі прапануемай стратэгіі дыктуецца ў першую чаргу яе адсутнасцю ў руках нацыянальнай эліты на дадзеным гістарычным этапе развіцця краіны. Адсутнасць сучаснай стратэгіі адлюстроўваецца як у недастатковым адзінстве беларускай эліты ў падыходах да рэалізацыі нацыянальнай ідэі, так і ў невысокім узроўні самаідэнтыфікацыі\нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва ў цэлым. Без абодвух складнікаў немагчыма будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы.

Распрацоўка і рэалізацыя праекта бачыцца дастаткова складаным працэсам, складанасць якога абумоўлена як магчыма адрознымі поглядамі экспертаў, так і шматлікімі зменлівымі знешнімі і ўнутранымі фактарамі, што ўплываюць на працэсы развіцця нацыі. Відавочна, што перш чым разглядаць перспектыву развіцця нацыі на адносна доўгі перыяд, трэба асэнсаваць і даць крытычную ацэнку цяперашняга стану нацыі ў тых пытаннях, якія будуць вызначальнымі для яе будучыні, скарыстаўшы тыя напрацоўкі адносна нацыянальнай ідэі, якія былі ў мінулым, і якія маюцца ў наш час. Варта нагадаць, што абмеркаванню пытанняў датычных да нацыянальнай ідэі толькі ў нядаўні час прысвечаны шэраг канферэнцый: *“International Congress of Belarusian Studies” (5 кангрэсаў, Kaunas, 2011-2015); Міжнародная навуковая канферэнцыя “Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура” (Мінск, лістапад 2015); “Трансфармацыя ментальнасці беларусаў у XXI стагоддзі” (Мінск, лістапад 2013); “Проблемы современной беларускай идеологии» (Мінск, лістапад 2012).* Тым не менш, здаецца, не было спроб абагульніць высновы, зробленыя на навуковых форумах, а таксама меркаванні дасведчаных у гэтай галіне людзей, і ператварыць іх у сучасную стратэгію развіцця беларускай нацыі (далей Стратэгія).

У дадзеным праекце вызначэнні нацыя і нацыянальная дзяржава будуць выкарыстоўвацца ў аднолькавай меры, маючы на ўвазе, што дзяржава ці краіна ўяўляе сабой палітычную і геапалітычную адзінку, нацыя з’яўляецца культурнай-этнічнай адзінкай, а нацыянальная дзяржава ўключае абодва гэтыя вызначэнні.

**Стан беларускай нацыі**

Можна канстатаваць, што за мінулае стагоддзе беларусы дасягнулі значнага прагрэсу ў будаўніцтве сваёй дзяржавы. За гэты перыяд было шэсць абвяшчэнняў незалежнасці беларускай дзяржавы – пачынаючы ад абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі (25 сакавіка 1918 года) і ўтварэння БССР (1 студзеня 1919 год), і канчаючы прыняццем Дэкларацыі аб суверэнітэце БССР (27 ліпеня 1990 года). Шлях гэты быў няпросты, у развіцці краіны былі спрыяльныя і неспрыяльныя перыяды, аднак галоўным яго вынікам стала <u>існаванне незалежнай і суверэннай беларускай дзяржавы</u>.

На думку знешніх экспертаў (T. Sneider, 2013) сучасная дзяржаўнасць і суверэнітэт Рэспублікі Беларусь пасля выхаду з СССР значна ўмацаваліся. Гэта адбылося як пад уплывам знешніх абставін (напрыклад, няўстойлівага развіцця ўсходняга суседа, Расіі), так і ў выніку хісткай знешняй і ўнутранай палітыкі, праводзімай пад кіраўніцтвам адзінага з 1994 года Прэзідэнта дзяржавы. Магчыма, што з гэтым не ўсе будуць згодныя, у тым сэнсе, што магло б быць інакш, як напрыклад, здарылася з краінамі-суседзямі (краіны Прыбалтыкі і зараз змагаючаяся за большую свабоду Украіна), што ў краіне прыгнятаюцца Мова і беларускасць (што ёсць прыкметамі сапраўднага этнацыду нацыі), што насуперак імкненню да нейтральнага стану, вызначанага ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (Артыкул 18), краіна ўцягнута ў ваенныя блокі (ОДКБ, асобныя дамовы з Расіяй), і ўсё больш уключаецца ў сферу “рускага міра”. Але мы маем вельмі важнае - незалежнасць і суверэнітэт краіны. Можна спрачацца аб устойлівасці гэтага стану бо пагрозу страты незалежнасці, поўную, праз ваенную агрэсію (прыклад, Крым) ці частковую (праз размяшчэнне ваенных баз ці праз эканамічны і культурны ўціск), прадугледзець немагчыма. Але факт застаецца фактам – беларусы, якія пражывалі на тэрыторыі Паўночна-Заходняга Краю Расійскай імперыі ў пачатку 20-га стагоддзя маюць сёння дзяржаўнасць і незалежнасць. Трэба глядзець наперад і змагацца за адзінства нацыянальнай эліты і за моцную нацыю.

**За мінулае стагоддзе ў развіцці краіны былі спрыяльныя і неспрыяльныя перыяды, аднак галоўным яго вынікам стала існаванне незалежнай і суверэннай беларускай дзяржавы. Дзяржаўнасць і суверэнітэт Рэспублікі Беларусь за апошнія 25 год пасля выхаду з СССР значна ўмацаваліся.**

Сярод шэрагу мадэляў будаўніцтва дзяржавы (цывільная, культурная, уяўная) выбар <u>мадэлі этнанацыянальнай дзяржавы</u> ў найбольшай ступені адпавядае рэальнай сітуацыі ў Беларусі і прынцыпу нейтральнасці. Ніштo ў сучасных умовах не можа так спрыяць будаўніцтву дзяржавы як прыналежнасць большасці грамадзян да

аднаго этнасу (83.7% насельніцтва краіны адчуваюць сябе беларусамі, 2009). Толькі на гэтым шляху бачыцца будучыня нашай краіны. Беларусь не можа будаваць дзяржаву на аснове культурнай мадэлі ці цывільнай, рускамоўнай мадэлі, як гэта робіцца цяпер, па адной простай прычыне. І ў адным, і ў другім выпадку паглынанне беларускай дзяржавы “рускім мірам” з’яўляецца непазбежным, рана ці позна пры такіх мадэлях гэта пагроза будзе рэалізавана.

На нашу думку далейшае існаванне беларускай дзяржавы мусіць набыць фармат нейтральнасці. На сёння ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь запісана, што “Рэспубліка Беларусь ставіць за мэту зрабіць сваю тэрыторыю без’ядзернай зонай, а дзяржаву — нейтральнай” (Артыкул 18). Стан нейтральнасці будзе палітычным выхадам з-пад пагрозы быць уцягнутымі ў сферу «рускага міра» і адпавядае як ментальнасці беларускага народа, так і дзяржаўным інтарэсам у цяперашняй і ў будучай рэальнасці. Відавочна, што стан нейтральнасці не прадугледжвае сяброўства ў ваенных ці іншых блоках, уцягнутых у рэгіянальныя ці глабальныя канфлікты. Ці гарантуе стан нейтральнасці абсалютную бяспеку дзяржавы ад ваеннай агрэсіі ці захопу? Натуральна, што не, але ён дае прававыя і маральныя падставы супрацьстаяць ваеннай ці эканамічнай агрэсіі, якія пагражаюць незалежнасці і суверэнітэту краіны. Ці азначае набыццё стану нейтральнасці праяўленне слабасці грамадства, хаванне «галавы ў пясок»? Думаецца, што не. Малым дзяржавам заўжды было цяжка, а то і немагчыма зберагчы сваю самастойнасць. Але калі ўзяць прыклад маленькіх краін Еўропы, то многія з іх жывуць па-за ўсякімі блокамі, што аднак, не перашкаджае ім мірна супрацоўнічаць з іншымі малымі і вялікімі краінамі.

Прасоўванне ідэі нейтральнасці сярод насельніцтва безумоўна зойме шмат часу, каб грамадства ўрэшце саспела да неабходнасці правядзення адпаведнага рэферэндуму. Праблема развіцця Беларусі ў якасці нейтральнай дзяржавы не часта разглядалася ў апытанках грамадскай думкі. Набыццё краінай юрыдычнага статусу нейтральнасці ў нашы дні можа быць прызнана ААН. Нейтральная краіна ў пэўнай вайне з'яўляецца суверэннай дзяржавай, якая афіцыйна аб'яўляе сябе нейтральнай у адносінах да ваяўнічай дзяржавы. Правы і абавязкі нейтральнай дзяржавы вызначаны ў раздзелах 5 [1] і 13 [2] Гаагскай канвенцыі ад 1907 года. Нейтральнымі краінамі ў Еўропе на сёння з’яўляюцца: Аўстрыя, Ірландыя, Ліхтэнштэйн, Мальта, Малдова (з 1994), Сан-Марына, Сербія (з 2007), Фінляндыя, Швейцарыя, Швецыя (хаця некаторыя з гэтых краін ёсць сябрамі Еўрапейскага Саюза, ЕС).

Ёсць шмат як станоўчых, так і адмоўных праяў, якія характарызуюць узровень самаідэндыфікацыі беларусаў. Сама па сабе Дэкларацыя аб суверэнітэце БССР (1990) мала што змяніла ў свядомасці людзей. У 1991 г. 69% беларускага насельніцтва лічыла сябе савецкімі людзьмі, і толькі 24% ідэнтыфікавалі сябе

належнымі да сваёй рэспублікі (L. Titarenko, 2007); для параўнання – для украінцаў гэтыя лічбы былі 42% і 46%, для эстонцаў - 3% і 97%, адпаведна. З таго часу змянілася няшмат – у 2009 годзе 80% насельніцтва ганарылася перамогай ў Айчыннай вайне і толькі 36% - атрыманнем незалежнасці ў 1990 годзе (С. Нікалюк, 2012); у 2013 г. 65.2% насельніцтва лічыла, што паляпшэнне эканамічнага стану краіны важней за яе незалежнасць, 29.3% (Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў, НІСЭПД). Прычынамі такіх адносін да незалежнасці з'яўляюцца як савецкая спадчына, так і працяг сучасным кіраўніцтвам амаль той жа палітыкі ў дачыненні да нацыянальных пытанняў.

Тым не менш, настрой ў грамадстве паступова мяняецца. Апытанкі сведчаць аб усё большай долі людзей (55%), якія б хацелі, каб краіна ішла сваім, асобным шляхам (С. Нікалюк, 2012). Аб'ектыўныя замеры грамадскай думкі ў апошнія два дзесяцігоддзі вагаюцца і даюць лічбы ў 30-40% у адносінах да ўтварэння саюзу з Расіяй ці адносна далучэння да ЕС. Па інфармацыі НІСПЭД, у верасні 2015 г. такіх людзей было 32.6% (за аб'яднанне з Расіяй) і 27.5% (за далучэнне да ЕС); у той жа час, пры выбары паміж гэтымі магчымасцямі (адно з двух) назіраецца тэндэнцыя да перавагі людей, што галасуюць за аб'яднанне з Расіяй – 52.7% супраць 26.4%, адпаведна. Можна думаць, што пры адсутнасці аднабокай прапаганды, якую праводзіць сучасны ўрад у адносінах да Расіі, гэтыя прапорцыі істотна змяніліся б. Трэба, аднак, улічваць таксама, што Еўрасаюз мае шмат сваіх унутраных праблем, да якіх цяпер дадаліся дадатковыя, звязаныя з хваляй міграцыі з Афрыкі, Бліжняга і Сярэдняга Ўсходу.

Такім чынам, большасць **грамадзян Беларусі** да гэтага часу **не разглядаюць незалежнасць краіны, як адну з найважнейшых каштоўнасцяў. Але ў той жа час, калі казаць пра аднясенне сябе да беларускай нацыі, то 83.7% насельніцтва краіны называюць сябе беларусамі (перапіс 2009 года). Такая высокая нацыянальная аднароднасць ёсць добрым грунтам для будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы.**

Калі звярнуцца да такога паказчыка самаідэнтыфікацыі беларусаў як родная мова, то тут справа значна горшая. Сітуацыя з Мовай ў Беларусі добра вядомая і абмеркаваная - Мова – аснова свядомасці большасці нацый - у Беларусі знаходзіцца ў прыгнечаным стане. Віна ў тым не толькі самой дзяржавы. Сярод аб'ектыўных прычын заняпаду Мовы трэба адзначыць уплыў урбанізацыі. У гарадах сто гадоў таму назад амаль не карысталіся беларускай мовай. Беларуская мова заўжды чэрпала свае сілы з вёскі. Калектывізацыя і урбанізацыя прывялі амаль да поўнага спусташэння вёскі - крыніцы, з якой чэрпала сілы наша Мова. У пачатку мінулага стагоддзя ў вёсках жыло амаль 90% насельніцтва, а зараз у сельскай мясцовасці

пражывае каля 25% грамадзян Беларусі. Але, калі б дзяржава мела намер прытрымліваца канстытуцыйных норм, як гэта робіцца ў краінах, дзе некалькі дзяржаўных моў (Канада, Бельгія), то сітуацыя з Мовай не была б такой балючай і катастрафічнай. У 20-30-я гады мінулага стагоддзя, калі ў дзяржаве праводзілася палітыка карэнізацыі-беларусізацыі, каля 80% служачых у цэнтральных органах улады ў 1927 годзе валодалі беларускай мовай, а ў 1928 годзе каля 80% школ было з беларускамоўнай формай навучання (у той час налічвалася 5500 школ).

**Сітуацыя з роднай Мовай вельмі балючая і катастрафічная, што сталася вынікам як аб'ектыўных працэсаў, звязаных з урбанізацыяй, так і з бяздзейнасцю сучаснага урада, які, маючы ўсе магчымыя сродкі для нармальнага ўжывання Мовы ў дзяржаве, ня робіць гэтага, што фактычна вядзе да паступовага выцяснення Мовы з нацыянальнай свядомасці. Гэтыя дзеі ўрада падпадаюць пад вызначэнне этнацыду свайго народа.**

Паўстае пытанне, ці можна ва ўмовах заняпаду Мовы спадзявацца на дастойнае і поўнае будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы? Іншымі словамі, ці дастаткова ідэнтыфікаваць сябе беларусам, быць рускамоўным і будаваць нацыянальную дзяржаву? Пытанне складанае, на якое няма адназначнага адказу. Хіба што толькі дапусціць, што на данным этапе такое можа быць магчымым пры адной істотнай умове – каб беларусы глыбока ведалі сваю даўнішнюю гісторыю. Гэта пытанне патрабуе прынцыповага абмеркавання. Пры такой мадэлі, гэта крок назад у адносінах да моўнага пытання, але кампрамісны падыход у пытанні нацыянальнага будаўніцтва.

Абмяркоўваючы праект Стратэгіі мы не робім спецыяльную спасылку на гістарычныя аспекты існаваўшых форм беларускай дзяржаўнасці ў далёкім мінулым (Полацкае княства, ВКЛ). Безумоўна, што наша даўнішняя гісторыя павінна займаць адпаведнае месца ў ментальнасці беларускага народа. І ў гэтым сэнсе можна канстатаваць, што шмат чаго зроблена. Хацелася б спадзявацца, што зараз колькасць беларусаў, якія ведаюць пра нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг ня зменшылася ў параўнанні з 1995 годам, калі за гэты сцяг на рэферэндуме прагаласавалі амаль мільён грамадзянаў Беларусі (988.839 чалавек).

**Дзякуючы працы беларускай эліты (публікацыі, інтэрнэт), даўнішняя гісторыя краіны паступова займае адпаведнае месца ў свядомасці жыхароў Беларусі. Аднак, узровень ведаў насельніцтва пра гісторыю Полацкага Княства, ВКЛ яшчэ недастатковы.**

Зразумела, што будаўніцтва нацыяльнай дзяржавы ў значнай ступені залежыць і ад наяўнасці грамадзянскай супольнасці заснаванай на дэмакратычных каштоўнасцях,

станаўленне і развіццё якой ва ўмовах аўтакратычнага рэжыму вельмі абмежаваныя. Гэта часткова можна патлумачыць як значным ўплывам дзяржаўнай палітыкі, ажыццяўляемай праз жорсткую вертыкаль улады, так і значным дыссанансам паміж калектывісцкімі і індывідульнымі гістарычна склаўшыміся схільнасцямі беларусаў (D. Meadow, 2012), якія фармуюць цяпер палітыка-культурнае асяроддзе. Пад уплывам Расіі і Расійскай праваслаўнай царквы ў апошнія 2 стагоддзі ментальнасць беларускага насельніцтва фармавалася на карысць супольных інтарэсаў, пасіўнасці, моцнага дзяржаўнага кіравання, і не была скіравана на развіццё асобы, яе свабоды і павагі да прыватнай уласнасці. І хаця на нашу думку такі дыссананс больш характэрны для ўсходніх рэгіёнаў Беларусі, аднак разам з сучаснай дзяржаўнай прапагандай гэта прывяло да таго, што **палітычная культура беларусаў і ўзровень развіцця грамадзянскай супольнасці застаюцца на дастакова нізкім узроўні.**

Гэта адлюстроўваецца таксама як у абыякавых адносінах грамадзян Беларусі да палітычнай актыўнасці, так і ў недастатковай талерантнасці да многіх каштоўнасцей, якія зараз прыняты ў цывілізаваным свеце. Паводле апытання, праведзенага НІСПЭД, абсалютная большасць беларусаў былі абыякавымі да палітыкі (91.5%), іх адказы былі наступнымі: маё жыццё залежыць ад палітыкі, але я ў ёй ня ўдзельнічаю, таму што гэта не мае сэнсу (23.7%) ці небяспечна (11.1%); маё жыццё слаба залежыць ад палітыкі (22.5%); я не цікаўлюся палітыкай (34.2%) (*“Народная Воля”, 3 верасня 2013*). Беларусы звязваюць лепшыя надзеі з моцным лідэрам, а не з палітычнымі партыямі. Парадаксальна, але грамадзяне Беларусі, падтрымліваючы ў большасці дэмакратыю (75.3%) і тое, як яна развіваецца ў краіне (50.4%), у той жа час не супраць аўтарытарнага стыля кіравання (61.6%). Відавочна, што яны не ўспрымаюць аўтарытарны рэжым, як пагрозу дэмакратычным свабодам, аднак і не прымаюць ваенную дыктатуру (13.1%) (О. Іванюто і інш., 2013). Не выключана, што такія адносіны да аўтарытарызма яны звязваюць з асобай кіраўніка дзяржавы і з той палітыкай якую ён праводзіць, з эканамічнай і палітычнай стабільнасцю, якая на гэты час іх задавальняе.

Талерантнасць традыцыйна лічыцца як бы адметнай і станоўчай рысай беларусаў. Аднак, апытанне, праведзенае Лабараторыяй Новак і Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў у 2010 годзе *(BelarusDigest, 08-02-2013)*, паказала, што гэта не так: 46% беларусаў лічыць, што трэба абмежаваць прыток замежных працоўных у краіну, толькі 20% беларусаў пагадзіліся б пажаніць сваіх дзяцей з прадстаўнікамі другой расы, больш за 60% беларусаў падтрымліваюць крымінальны пераслед людзей нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі і толькі 6% згодны на тое каб яны мелі тыя ж самыя правы, што і астатнія грамадзяне краіны, 80.44% беларускага насельніцтва на рэферэндуме 1996 сказалі «так» смяротнаму пакаранню.

Можна меркаваць, што адносна нізкая свядомасць беларусаў ў дачыненні да палітычных і дэмакратычных свабод перайшла ў спадчыну ад Расіі і савецкай сістэмы і з'ўляецца значнай перашкодай у будаўніцтве нацыянальнай дзяржавы.

**Такім чынам, ментальнасць беларусаў яшчэ не падрыхтаваная да ўспрыймання каштоўнасцей, звязаных з роўнасцю людзей, якія ў цывілізаваным свеце паступова ўваходзяць у жыццё і з разуменнем успрымаюцца грамадствам - беларусы недастаткова талерантныя ў адносінах да іншых расаў, нетрадыцыйных рэлігій і да асоб нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі, адмоўна ставяцца да адмены смяротнага пакарання.**

Будаўніцтва поўнавартаснай нацыянальнай дзяржавы пры недахопе якасцяў аб якіх ішла размова вышэй будзе запаволена, нягледзячы на тое, што па сваёй адукаванасці і нават па ўзроўню жыцця краіна Беларусь магла б адпавядаць еўрапейскім стандартам. Да таго ж, недастатковы ўзровень развіцця такіх каштоўнасцей будзе незразумелым пры далучэнні да народаў цывілізаваных краін у эпоху глабалізацыі і, відавочна, патрабуе карэкцыі праз выхаванне адносін да іх у грамадстве.

Мусім тут адказаць на пытанне – а ці мае наша незалежная і суверэнная Беларусь дастатковы нацыянальны колер, каб казаць, што на яе зямлі існуе моцны беларускі народ, які хоча збудаваць нацыянальную дзяржаву? Які ж патэнцыял сёння ёсць у Беларусі, каб будаваць нацыянальную дзяржаву? Шмат было зламана коп'яў на гэтым полі – дыскутаваліся ідэі ад поўнай немагчымасці збудаваць нацыянальную дзяржаву ў пост-мадэрны перыяд да стварэння ці аднаўлення старых "саюзаў". Падаецца, што тут патрэбна сказаць адназначна – будаўніцтва нацый-дзяржаў у Еўропе працягваецца (Сербія, Чарнагорыя, Славенія, Харватыя, Літва) і Беларусь мае патэнцыял каб рабіць гэта таксама.

Відавочна, што сёняшняе кіраўніцтва не гатова ўдзельнічаць у працэсе нацыянальнага будаўніцтва і працягвае будаваць цывільную, рускамоўную дзяржаву, выкарыстоўваючы ў асноўным ідэалогію, заснаваную на кароткачасовай гісторыі - будаўніцтве савецкага ладу, цяжкасці другой сусветнай вайны, і не дбаючы пра яе нацыянальны твар. У дадатак, даючы ў большасці перавагу ўсходняму вектару знешняй палітыкі, сучасны урад душыць усе праяўленні беларускасці, зацягваючы краіну ў еўразійскую культуру і палітыку. Дэкларатыўныя заявы дзяржаўных дзеячаў аб крышталізацыі нацыянальнай ідэі застаюцца ў асноўным на паперы.

У апошні час, праўда, можна чуць рытотыку адносна выхавання патрыятызму на прыкладзе апошняй вайны. Нават такі патрыятызм – гэта ў прынцыпе добра, бо ён працуе на нацыю, хаця і ў такім усечаным выглядзе. Але нават прапаганда такога тыпу патрыятызму раней шырока неназіралася, і стала заўважнай толькі ў апошнія гады пад ціскам знешніх абставін (эканамічны крызіс, вайна на Украіне). Інакш

немагчыма было б назіраць за канферэнцыяй па Вялікаму Княству Літоўскаму (ВКЛ), якая праходзіла ў Нацыянальнай акадэміі навук 6-8 лістапада 2015 года. Аднак, пакуль што, гэта мізэрныя праявы нацыянальнага выхавання. Па-ранейшаму, адчыняць беларускія класы, хаця б з некалькімі вучнямі, бацькам даводзіцца з боем. Варта яшчэ нагадаць адзін яркі прыклад антыбеларускасці, калі вымуштраваныя, абалваненыя, так называемыя міліцыянеры, прымушаюць маладых дзяўчат на дэманстрацыі здуваць балонікі з “Пагоняй” ці здымаюць майкі з “Пагоняй” у фанатаў на стадыёнах. **У такіх умовах нацыянальная свядомасць нармальна развівацца не можа, і калі гэта і адбываецца, то толькі за кошт неімаверных высілкаў усё яшчэ нешматлікай нацыянальнай эліты.**

Беларуская нацыянальная эліта імкнецца выкарыстоўваць іншыя каштоўнасці, заснаваныя на глыбокай гісторыі, даўнішняй культуры і традыцыях беларускага народа. Краіна, аднак, дзеліцца даследчыкамі як бы на дзве часткі: адна частка, ідэі якой падзяляюць каля 25-30% насельніцтва, ідзе за нацыянальнай элітай (В. Вілейта, 2005); другая частка, большая, складаецца з прыхільнікаў сёняшняга кіраўніка дзяржавы. Супярэчнасці паміж двума падыходамі даюць падставы многім даследчыкам казаць аб наяўнасці дзвюх культур ці ідэнтычнасцяў\арыентацыяў у Беларусі (абарыгенаў-этнанацыяналістаў і “крэолаў”, М. Рабчук, 2005; “националистов” і “космополитов”, А. Манаеў, Ю. Дракахруст, 2012; нацыянальнай і постсавецка-заходнерускай, Р. Радзік, 2012; свядамітаў і несвядамітаў, В. Воранаў, 2013; культуры-1 і культуры-2, А. Астапенка, 2013; «Паколькі і тыя, і тыя прэтэндуюць на тое, каб быць прадстаўнікамі беларускай культуры, атрымліваецца, што ў нашай краіне суіснуюць два абсалютна розныя ўяўленні. Дзве культурныя мадэлі, дзве візіі будучыні, дзве гісторыі, дзве мовы», М. Амнепадыстаў, 2015).

Падобныя азначэнні існуючых рэальнасцяў даволі дакладна адлюстроўваюць ці апісываюць сітуацыю. Аднак, падаецца, што гэта штучнае або “псеўда” падзяленне. Культура ў народа можа быць толькі адна. У такое падзяленне можна было б верыць толькі тады, калі б у грамадстве існаваў свабодны абмен думак, адкрытае поле для змагання ідэй. У цяперашняй сітуацыі, калі ўсе рычагі прапаганды знаходзяцца ў адных руках, падаецца, што казаць прадстаўнікам нацыянальных сіл аб наяўнасці дзвюх культур - азначае прызнаваць сваё паражэнне. У свабодным грамадстве заўсёды будзе існаваць палярызацыя думак, але гэта ў свабодным грамадстве. Беларускае грамадства такім не з’уляецца, таму сцвярджаць, што культура № “такая-то” йдзе за сучасным урадам і перамагае, відаць, нельга. Гэта часовая перавага адразу знікне, як толькі будзе вызвалена трыбуна для ўсіх адпушчаных на волю грамадзян краіны.

Падаецца, што будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы не можа быць заснавана выключна на хрысціянскай маралі, што прапагандуюць некаторыя прадстаўнікі

беларускай эліты (А. Астапенка, лідэры “Маладога фронту” П. Севярынец, З. Дашкевіч). Натуральна, што ў нацыянальнай дзяржаве з роўнымі правамі для усіх грамадзян хрысціянскія ідэі і іх прыхільнікі могуць быць значнай сілай у яе ўмацаванні і развіцці. Аднак, трэба ўлічваць, што ў краіне ёсць шмат людзей, якія прытрымліваюцца іншых веравызнанняў (у Беларусі налічваецца 27 розных канфесій ці іх напрамкаў), да таго ж каля 41% насельніцтва Беларусі не з’яўляюцца актыўнымі вернікамі. Існаванне напружання паміж некаторымі канфесіямі ў нашы дні таксама з’ўляецца ў некаторым сэнсе перашкодай для нацыянальнага будаўніцтва.

Нягледзячы на сцверджанні, што будаўніцтва нацый ў пост-мадэрным перыядзе немагчыма, факты сведчаць адваротнае. Прыкладам таму будаўніцтва ці ўмацаванне нацый на пост-савецкай прасторы і на тэрыторыі былой Югаславіі. Многія з гэтых краін, як і Беларусь, этнічна аднародныя (Сербія, 83% насельніцтва складаюць сербы; Харватыя, 88% - харваты; Славенія, 89 % - славены; Літва, 84% - літоўцы). Так, у нашай краіне жывуць людзі іншых нацыянальнасцяў, як гэта назіраецца ва ўсіх краінах (гістарычна жылі побач, міграцыя), аднак, нельга пагадзіцца, што Беларусь многанацыянальная краіна. Большасць нацыі складаюць беларусы (нацыяутвараючы этнас), якія ў асноўным і вызначаюць менталітэт краіны, яе агульны настрой і адносіны да знешняга міру. Нягледзячы на пэўныя слабасці «няспелай» беларускай нацыі магчымасць будаўніцтва беларускай нацыянальнай дзяржавы застаецца.

Мы не разглядаем магчымыя палітычныя шляхі рэалізацыі нацыянальнай ідэі таму, што прапануемая Стратэгія развіцця беларускай нацыі разлічана на бліжэйшыя два дзесяцігоддзі ў незалежнасці ад магчымых змен унутранага ці знешняга палітычнага\геапалітычнага характару (рэвалюцыя, агрэсія ці іншае). Такія хуткія змены, могуць мець як станоўчыя, так і адмоўныя наступствы. Не адмаўляючы і падтрымліваючы палітычныя падыходы, трэба заўважыць, што пастаяннай задачай нацыянальных сіл мусіць быць змаганне за нацыянальную свядомасць грамадзян Беларусі, а такая праца патрабуе доўгага часу і не можа быць вырашана кароткачасовымі кампаніямі.

Нацыянальная свядомасць саміх грамадзян Беларусі, за выключэннем аднясення сябе да нацыянальнасці беларус (83.7%), пакуль што вельмі слабая. Такія прыметы як некарыстанне Мовай, нежаданне весці дзяцей у беларускія школы і садкі, нізкая актыўнасць у пратэстных акцыях, абыякавасць да нацыянальных каштоўнасцяў, знівеліраванае пачуццё нацыянальнага гонару ніяк нельга аднесці ў актыў нацыянальнай свядомасці. Для будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы недастаткова

разумець беларускае пытанне ці толькі адчуваць сябе беларусам, трэба яшчэ і дзейнічаць, кожны на сваім месце, дзе б хто ні знаходзіўся.

Беларусы нацыяутвараючы этнас. З гэтым цяжка спрачацца. Як і з тым, што ў Беларусі нацыянальныя меншасці жывуць у бяспецы, дзякуючы як існуючым цывільным рэгулам, так і міралюбівым адносінам да нацыянальных меншасцяў саміх беларусаў. З аднаго боку, гэта характэрна для дзяржаў, дзе большасць насельніцтва складае адзін этнас ці адну нацыю – бо ў гэтым выпадку большасць не адчувае пагрозы з боку меншасцяў. Гэта натуральна, што беларусы і прастаўнікі нацыянальных меншасцяў ведаюць, але не акцэнтуюць увагу на тым, што беларусы ёсць нацыяутвараючым этнасам. У выпадку ж міграцыі ў краіну новых пасяленцаў «нетутэйшых нацыянальнасцяў» пагроза ксенафобных настрояў вырастае. Роль дзяржавы і нацыянальнай эліты ў забяспечанні роўнасці правоў для прадстаўнікоў усіх меншасцяў надзвычайная. Неталерантнасць і ксенафобія, якія часта прыпісваюць «нацыяналістам», павінны быць пад пільнай увагай і кантролем з боку нацыянальнай эліты. Пераход міжнацыянальнай мяжы можа вясці да сур'ёзных канфліктаў. Падобная мадэль пабудовы грамадства названа гібрыднай (R. Brubaker, 1996). Паводле такой мадэлі дзяржава разумеецца як нацыянальная, але ў той жа час, як дзяржава ў якой перавага не аддаецца дамінантнай этнічнай групе; грамадзянам меншасцяў гарантуюцца не толькі роўныя правы як грамадзянам гэтай дзяржавы, але і абарона ад асіміляцыі пры рэалізацыі іх нацыянальных інтарэсаў.

Што тычыцца сіл нацыянальнай эліты, то з аднаго боку яны значна пашырыліся за кошт шматлікіх інстытутаў, арганізацый і вэб-рэсурсаў, аднак, ... на жаль, значная колькасць іх вымушана дзейнічаць з-за мяжы. Свабодна ж працаваць на радзіме вельмі складана з-за шматлікіх абмежаванняў і прынятых законаў, якія фактычна загналі свабодную думку разам з Мовай у “беларускае гета”. Тым не менш, варта нагадаць многія арганізацыі і выданні, якія працуюць актыўна і пастунова даносяць інфармацыю, якая у значнай ступені дае магчымасць павышаць нацыянальную свядомасць беларускіх людзей. Сюды трэба аднесці Таварыства беларускай мовы, партыі БНФ, газеты “Наша Ніва”, “Наша Слова”, “Наш час”, “Народная Воля”, тэлебачанне “Белсат”, радыё “Свабода”, вэб-рэсурсы “Хартыя 97”, “Беларускі партызан”, “Спадчына”, “Мы-нацыя”, “Салідарнасць” і шмат іншых.

Нягледзячы на многія абмеркаваныя недахопы і перашкоды ўсё ж можна лічыць, што шанс будаўніцтва поўнавартаснай нацыі і нейтральнай, нацыянальнай дзяржавы застаецца. Гэта надзея базуецца на:

- незалежнасці і суверэнітэце, якую зараз мае РБ,

-высокай нацыянальнай аднароднасці насельніцтва (83.7% беларусы),

-наяўнасці незначнай па колькасці, але актыўна працуючай нацыяналай эліты,

-істотнай долі насельніцтва, якая спачувае ці можа патрымаць ідэі, скіраваныя на ўмацаванне нацыі,

-ўзрастаючай колькасці інфармацыйных рэсурсаў,

-спрыяльных знешніх умовах,

- тэарэтычных доказах магчымасці будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы ў пост-мадэрны перыяд.

**Мэта стратэгіі**

**Мэтай прапаноўваемай Стратэгіі з'яўляецца пабудова нейтральнай, нацыянальнай дзяржавы, у якой абсалютна роўныя правы будуць мець прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў і прадстаўнікі нацыяутвараючага этнаса - беларусы.**

**Задачы, якi вынікаюць з характарыстыкі сучаснага стану беларускай нацыі і пастаўленай мэты:**

Распаўсюджваць ідэю аб атрыманні краінай нейтральнага стану праз правядзенне рэферэндума і замацаванні гэтага палажэння ў Канстытуцыі РБ.

Патрымліваць ідэю аб гістарычнай унікальнасці беларускай народа, развіццё якога істотна адрозніваецца ад развіцця народаў Расіі і ў значнай ступені ад развіцця украінскага народа. Лічыць ідэю аб трыадзінстве усходнеславянскіх народаў (Беларусі, Расіі , Украіны) не адпавядаючай гістарычнай праўдзе. Падтрымліваць добрыя адносіны з усімі славянскімі і з іншымі народамі свету.

Дабівацца сусветнага прызнання выключнай ці роўнай ролі беларускага народа ў развіцці Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай – вялікіх еўрапейскіх дзяржаў мінулага, на тэрыторыі якіх сёння пражываюць людзі сучасных незалежных краін, Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны.

Для папярэджання пагрозы страты незалежнасці і суверэнітэту РБ праз ваенныя, эканамічныя ці культурныя механізмы супрацьстаяць ідэалогіі “рускага міра” і н’юеўразізма, якія ўяўляюць сабой абноўленыя формы імперскага шавінізму.

Не падтрымліваць ідэю сучаснага ўрада аб будаўніцтве цывільнай, рускамоўнай дзяржавы, і адначасова працягваць актыўнае ўзаемадзенне ў рамках законаў індывідуальна і арганізаванымі групамі грамадзян з мясцовымі ўладамі для паляпшэння сітуацыі ў адносінах да мовы (садкі, класы, школы, дакументацыя), гісторыі (назвы вуліц, памятныя знакі) і па іншых пытаннях.

На сучасным этапе праводзіць асветніцкую дзейнасць сярод насельніцтва ў першую чаргу ў галіне гісторыі, культуры і традыцый беларускага народа (Полацкая дзяржава, ВКЛ, абуджэнне нацыі ў 19-20 ст.ст.), не збаўляючы высілкаў па вызваленні Мовы з прыгнечанага стану. Дабівацца раўнапраўнага ўжывання беларускай мовы ў дзяржаўных установах.

Ва ўмовах адсутнасці рэальнага двумоўя і невыканання “Закона аб мовах” стымуляваць выкарыстанне Мовы ва ўсіх сферах грамадскага і культурнага жыцця, ужываючы ўсе магчымыя падыходы, прадстаўленыя ў “Стратэгіі развіцця беларускай мовы ў XXI стагоддзі” (2012).

Для асветы насельніцтва стварыць агульны канал на даступных электронных і неэлектронных сродках інфармацыі.

Заахвочваць грамадзян Беларусі аддаваць дзяцей у беларускія садкі і школы.

Дамагацца адкрыцця беларускага нацыянальнага універсітэта.

Заахвочваць рэлігійныя абшчыны розных канфесій да правядзення багаслужбы на беларускай мове.

Заахвочваць грамадскія арганізацыі нацыянальных меншасцяў да вывучэння беларускай мовы і гісторыі.

Заахвочваць грамадзян Беларусі і адпаведныя рытуальныя агенцтвы ужываць беларускую мову на надмагільных надпісах.

Даводзіць інфармацыю пра ўсе станоўчыя праяўленні беларускасці і рэагаваць на ўсе без выключэння праявы этнацыду беларусаў. Ганарыцца дасягненнямі, які мае беларускі народ сёння.

Папулярызаваць нацыянальных дзеячаў, зрабіўшых найбольшы ўклад у развіццё нацыі: І. Насовіч, Н. Орда, В. Дунін-Марцінкевіч, С. Манюшка, К. Каліноўскі, Ф. Багушэвіч, Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, Б. Эпімах-Шыпіла, І. Луцкевіч, Я. Купала, Я. Колас, У. Галубок, В. Ластоўскі, Я. Лёсік, А. Луцкевіч, М. Багдановіч, А.

Чарвякоў, Б. Тарашкевіч, Р. Шырма, Г. Цітовіч, Л. Геніюш, М. Ермаловіч, В. Быкаў, А. Адамовіч, У. Караткевіч, У. Мулявін, С. Алексіевіч.

Адзначаць нацыянальныя святы, якія пакуль што не значацца ў афіцыйным календары: 25 сакавіка – Дзень Волі, першае абвяшчэнне незалежнасці краіны, Беларускай Народнай Рэспублікі; 15 ліпеня – Грунвальдская бітва; 27 ліпеня – Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь; 8 верасня – Дзень беларускай вайсковай славы, 27 лістапада – Слуцкі збройны чын.

**Падыходы і сродкі рэалізацыі**

1. У сваіх адносінах паміж людзьмі, якія будуць падтрымліваць рэалізацыю стратэгіі пажадана выконваць наступныя правілы **“Кодэкса гонару”**:
   - лічыць, што ўдзел у будаўніцтве нацыянальнай дзяржавы гэта вялікі гонар для беларусаў і прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў;
   - праяўляць узаемапавагу і падтрымку;
   - крытычна і абгрунтавана вясці спрэчкі з недапушчэннем абраз і ўжывання неправераных фактаў;
   - быць талерантнымі да выказванняў думак апанентаў;
   - максімальна ўжываць Мову дома і па-за домам;
   - прытрымлівацца адзіных падыходаў пры выкананні задач Стратэгіі;
   - пазбягаць фракцыйнасці - пабудаваць нацыянальную дзяржаву можна толькі праз адзінства людзей, незалежна ад таго, прыхільнікамі якіх партый, рухаў, рэлігійных і іншых плыняў з’яўляюцца асобы.
2. Давесці змест Стратэгіі да максімальнай колькасці грамадзян РБ. Пажадана каб тэкст Стратэгіі мела кожная сям’я.
3. Рэалізацыя Стратэгіі разлічана на бліжэйшыя два дзесяцігоддзі ў незалежнасці ад магчымых змен унутранага ці знешняга характару (рэвалюцыя, агрэсія ці іншае).
4. Для рэалізацыі Стратэгіі выхаванне і падтрымка адпаведнага нацыянальна-свядомага настрою ў грамадстве ў доўгатэрміновай перспектыве важней за наяўнасць ці адсутнасць матэрыяльных магчымасцяў.
5. Паступовае пашырэнне кола нацыянальна свядомых грамадзян РБ праз асвету і правядзенне пастаянных і рэгулярных акцый, скіраванных на выкананне пастаўленых задач.
6. Для вырашэння задач стратэгіі, ва ўмовах абмежаванай свабоды і доступу да СМІ ў дзяржаве, выкарыстоўваць усе наяўныя і шукаць магчымыя сілы і сродкі – нацыянальна свядомых сіл і прыхільных да нацыянальнай ідэі грамадзян РБ, спонсараў, інтэрнэт-рэсурсаў, незалежных і дзяржаўных СМІ.

**Ірына Шумская: Беларусь у цывілізацыйным разломе**

**Стан беларускай нацыі**

Паводле міфалогіі, Еўропа – прыгожая дачка фінікійскага цара – была выкрадзена Зеўсам у абліччы быка і звезена на Крыт. Беларусь, у сваю чаргу, была выкрадзена са сваёй спрадвечнай калыскі – Еўропы – праз прыгнятальную палітыку Расійскай імперыі, а пасля і Савецкага Саюза, каб нагрувасціцца азіятчынай, сервілізмам і надакучлівымі мантрамі пра “славянскае братэрства”, у якім вядучая роля, як вядома, чамусьці мусіць належаць рускаму народу.

Вядомая з часоў Івана Жахлівага палітыка “збірання земляў” сёння трансфармуецца ў фармаванне дзіўнаватай канструкцыі пад назвай Еўразійскі Саюз, які будуецца на ашчэпках былога СССР. Фундамент новага формаўтварэння падмацоўваецца не толькі прагай расейцаў да захавання панавання ў рэгіёне, але і шматбаковымі крызіснымі працэсамі ў Заходняй і Паўднёвай Еўропе.

У нашых рэаліях досыць часта можна пабачыць заклікі да ўдзелу ў разнастайных семінарах, прысвечаных развіццю талерантнасці і мульцікультурнасці. Але чаму б нашым заходнім (і асабліва – усходнім) суседзям не павучыцца талерантнасці ў беларусаў? У гэтым кірунку мы ўжо даўно можам паспяхова спаборнічаць за ролю сусветных лідараў, бо канфлікты на міжнацыянальнай або рэлігійнай глебе ў Беларусі – з’ява настолькі рэдкая, што падаецца форс-мажорным выпадкам. Але ёсць і другі бок медаля – беларусы настолькі прызвычаіліся рабіць рэверансы ў бок іншых культурных традыцый, што амаль страцілі сваю, якая або прадстае ў выглядзе напаўпрыхаванай партызаншчыны, або прэзентуецца (у тым ліку, і ў медыясферы) амаль як экспанат кунсткамеры. Дадамо сюды і адпаведныя посткаланіяльныя комплексы – прыстасавальніцтва, прагу да стабільнасці, невысокі ўзровень амбітнасці (памкненне “быць, як усе, не вылучацца”), а таксама рэха вынікаў культурнага імперыялізму – настальгія па савецкасці, успрыманне рускай культуры як сваёй, выхаванне на ўзорах і артэфактах пераважна з культурнай прасторы суседзяў.

Фактычна сёння мы не можам лічыць сябе ізаляванымі ад той цывілізацыйнай матрыцы, унутры якой наша этнакультурная супольнасць існавала апошнія тры стагоддзі. “Рускі свет” – гэта не толькі папулярная прапагандысцкая мадэль у сучаснай Расіі. “Рускі свет” непазбежна атачае нас штодня ў мітуслівай штодзённасці. На вывучэнні твораў менавіта рускіх пісьменнікаў грунтуюцца каштоўнасныя арыентацыі навучэнцаў сярэдніх школ; п’есы рускіх драматургаў

пераважаюць у айчынных тэатрах; расійская папса і так званыя "селебрыці" бясспрэчна дамінуюць не толькі на большасці канцэртных пляцовак Беларусі, але і ў медыясферы; прадстаўнікі беларускай навукі не могуць пражыць і паўгады, каб не суаднесці свае даследаванні з тым, а "што там у Расіі напісалі на гэты конт", не кажучы ўжо пра старых і маладых палітыкаў, якія ніводнага кроку не робяць без таго, каб не азірнуцца на геапалітычныя інтарэсы крамлёўскай зграі.

Так што наша "ўнутраная імперыя" прывязана да "рускага свету" нашмат больш і мацней, чым нам падаецца – амаль як залежнасць пацыента ў рэанімацыі ад апарату штучнага дыхання. У сваю чаргу, самаўсведамленне беларусаў як нацыі на ўзроўні абывацеляў па-ранейшаму адбываецца скрозь прызму прарасійскіх поглядаў, грунтуецца на дамінаванні расійскіх гістарычных крыніц і няспынным уздзеянні прадуктаў расійскай медыясферы. І відавочна, што беларускае грамадства не зможа выкараскацца са сваіх посткаланіяльных сутарэнняў да таго часу, пакуль не пераадолее рэфлекс бясконцага азірання ў бок Расіі.

Найноўшая мадыфікацыя патрыятызму, якая пераважна грунтуецца на дасягненнях савецкай эпохі і факце перамогі ў Другой сусветнай вайне, не можа лічыцца прадуктыўнай і перспектыўнай, бо перакрэслівае ўсю папярэднюю гісторыю станаўлення беларускай дзяржаўнасці, што пачынаецца зусім не з 1991 года, а прынамсі з часоў Полацкага і Турава-Пінскага княстваў.

Адным з ключавых маркераў нацыянальнай самаідэнтыфікацыі з'яўляецца мова. Бясспрэчна, што заканадаўча замацаваная ў выніку рэферэндума ініцыятыва дзвюхмоўя значна пагоршыла сітуацыю з ужыткам беларускай мовы, які за апошнія 20 гадоў няўхільна звужаецца. Больш за тое, фармальнае дзвюхмоўе прывяло да няправільнага разумення статуснасці моваў, якое, часцей за ўсё, выяўляецца ў абывацельскай пагардзе менавіта да беларускай мовы, якую многія лічаць "штучнай", "мёртвай", "мовай апазіцыі" і г.д. Найбольш тыповае стаўленне да моўнай праблематыкі ў грамадстве выяўляецца ў паўсюдным памылковым сцвярджэнні: "А ў нас дзве мовы дзяржаўныя, таму, калі ласка, давайце па-руску". Хоць насамрэч дзвюхмоўе прадугледжвае **абавязковае валоданне абедзьвюма мовамі ў роўнай ступені** (пры гэтым карыстанне беларускай мовай у паўсядзённым ужытку не патрабуецца). Большасць жа гэты пастулат разумее наступным чынам: "я ведаю толькі тую мову, якую хачу (у дадзеным выпадку – рускую), а другую (то бок, беларускую) цалкам ігнарую", што аніяк не абвяргаецца на ўзроўні дзяржаўнай моўнай палітыкі. Разам з тым, прымусовае вяртанне да беларусіфікацыі сёння прынесла б нашмат больш шкоды, а не карысці.

Стаўленне беларусаў да суверэнітэту таксама не выглядае аднастайным. Нягледзячы на тое, што, паводле апошніх сацыялагічных апытанняў, пераважная большасць грамадства не жадае таго, каб Беларусь уваходзіла ў склад Расійскай федэрацыі або Еўрасаюза, толькі 14 % насельніцтва (паводле дадзеных НІСЭПД)[i] гатовыя абараняць незалежнасць са зброяй у руках.

Такім чынам, стан самаідэнтыфікацыі беларускай нацыі на бягучы момант па-ранейшаму застаецца друзлым і нетрывалым, а рэдкія праявы "павольнай беларусізацыі", пра якія радасна пасяшаўся абвесціць шэраг публічных асоб, выглядаюць хутчэй рэхам лавіравання ў дзейснай геапалітычнай сітуацыі, а не сапраўднай спробай змяніць дзяржаўную палітыку ў кірунку замацавання нацыянальных інтарэсаў у якасці прыярытэтаў.

**Мэты, задачы і метады далейшага развіцця беларускай нацыі**

Адной з найбольш сур'ёзных праблем фармавання стратэгіі развіцця нацыі з'яўляецца не толькі няпэўнасць самога паняцця "нацыя" ў нашы дні, але і шматбаковасць разумення феномену элітаў. У Беларусі назіраецца наяўнасць цэлага шэрага супольнасцяў (палітычныя, бізнэсовыя, ваенныя, рэлігійныя, навуковыя, творчыя, інтэлектуальныя і г.д.), якія прэтэндуюць на роль элітаў і разам з тым, на маю думку, паўнавартаснымі элітамі лічыцца не могуць. Хаця б таму, што першай і найважнейшай адметнасцю эліты з'яўляецца здольнасць браць на сябе адказнасць за характар бягучых і будучых падзей у краіне, а таксама схільнасць ахвяраваць сваімі прыватнымі інтарэсамі на карысць інтарэсаў грамадскіх. Абсалютная большасць публічных дзеячаў у Беларусі за перыяд існавання незалежнасці краіны так і не навучылася наступаць на горла ўласнаму эгаізму і не зусім адэкватных амбіцый, не выхавала ў сабе навыка вядзення грамадскага дыялогу і схільнасці не проста канстатаваць, але і аналізаваць праблемы (хаця б, прынамсі, скарыстоўваючы славутую "матрыцу Дэкарта"). І ў гэтым палягае вялікая складанасць, таму што розныя "эліты", як высвятляецца з публічных прамоваў, збіраюцца будаваць розныя мадэлі Беларусі, якія, паводле логікі, слаба сумяшчальныя паміж сабой.

Не з'яўляецца таямніцай і тое, што падтрымка беларускай нацыянальнай культуры на дадзеным этапе ў значнай ступені ажыццяўляецца звонку (за кошт разнастайных грантавых датацый). Пытанне, аднак, у тым, колькі так званых "адэптаў Беларушчыны" засталіся б такімі ж дзейснымі, калі б крыніцы гэтага фінансавання былі б поўнасцю перакрытымі? Мяркую, што ад цяперашніх актывістаў "у тэме" засталося б меньш за траціну.

Сумныя тэндэнцыі назіраюцца з пэўнымі асветніцкімі праектамі, якія першапачаткова абвяшчаліся ў нацыянальна-арыентаваным кірунку. Сярод апошніх, у прыватнасці, дзейнасць Еўрапейскага Гуманітарнага Ўніверсітэта, а таксама яшчэ адносна маладога, але ўжо закранутага павуціннем модных папулістычна-ідэалагічных трэндаў Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі.

Я ўжо адзначала гэта раней у сваіх матэрыялах і падкрэслю нанова – будаванне так званай грамадзянскай нацыі без належнага грунту этнакультурнай еднасці, падмацаванай агульнай гісторыяй, традыцыямі, мовай, светапоглядамі і, так ці іначай, этнічным паходжаннем, – з'яўляецца памылковым шляхам, а папулярныя параўнанні Беларусі з ЗША і Швейцарыяй у дадзеным выпадку выглядаюць проста недарэчна. Адпаведна спробы аўтаматычна запісваць у шэраг беларусаў усіх тых, хто працяглы час пражывае на тэрыторыі Беларусі і нават аніяк не атаясамлівае сябе з беларускай культурай, – ёсць ні што іншае як глупства.
Нацыянальная дзяржава, такім чынам, уяўляецца мне дзяржавай, якая не толькі фармальна высоўвае на першасны план, але і рэальна адстоўвае інтарэсы не нейкіх там меньшасцяў і не прадстаўнікоў суседніх дзяржаў, ад якіх маецца энергетычная (ці яшчэ якаясьці) залежнасць, а таго народа, продкі якога пражывалі на гэтых землях на працягу некалькіх стагоддзяў і які мы прызвычаіліся называць “тытульнай нацыяй”.

Магчыма, у цяперашніх умовах гэта гучыць непаліткарэктна і нават звышкансерватыўна, але ў беларусаў проста няма іншага выйсця – калі яны не зменяць харатар сваіх стасункаў і да свету (з пазіцыі: “– А што мы нясем на свет цэлы? – “Сваю крыўду” Я. Купала), і, што яшчэ больш важна, да сваёй культуры, якую занадта часта успрымаюць як другасную, ім (а дакладней – нам) пагражае татальная асіміляцыя і расцярушванне без усялякіх “крыжовых паходаў” – найперш у “рускім свеце”, а пасля і ў “глабальнай вёсцы” (паводле Маклюэна).

У гэапалітычным плане нам варта скіроўвацца да вяртання статусу нейтральнай дзяржавы, якая існуе па-за межамі ваенных блокаў; у эканамічным – зрабіць стаўку на разгляд магчымасцяў стварэння афшорнай зоны, развіцця навукаёмістай вытворчасці і альтэрнатыўнай энергетыкі. Пры гэтым важна ўсведамляць, што ні шчыльны звяз з Еўрасаюзам, ні – тым больш – з Расіяй (і Мытным саюзам) не будуць аптымальнымі варыянтамі далейшага развіцця. Ідэальная мадэль – нейтральнай сацыяльнай дзяржавы – цяжка дасягальная, але адначасова і не з'яўляецца зусім ужо фантастычнай (прыклад – Ісландыя).

Усе задачы, акрэсленыя ў праекце, з’яўляюцца актуальнымі і істотнымі. Складанасць у тым, якімі шляхамі шэраг дадзеных задач будзе рэалізоўвацца. Падаецца, што многія дзеячы з беларускіх адраджэнскіх колаў па-ранейшаму працягваюць ездзіць на ровары, у той час калі ўжо вынайдзены электрамабіль. Інакш кажучы, для больш паспяховай працы ў цяперашняй рэчаіснасці нельга абмяжоўвацца наборам традыцыйных асветніцкіх прылад (правядзенне канферэнцый і семінараў, выданне кніг і часопісаў, перыядычнае дэклараванне заяў пра занепакоенасць станам беларускай культуры (як, напрыклад, гэта робіць Рада БНР і многія прадстаўнікі айчыннай інтэлігенцыі). Усе гэтыя сродкі, хоць і маюць нейкае ўздзеянне на бягучую сітуацыю, але ж ягоны КПД вельмі нізкі.

Па-першае, трэба разумець, што мы існуем у эпоху дамінавання візуальнай культуры і віртуальнай камунікацыі, інфармацыйных фэйкаў і Інтэрнет-мемаў. І рэзервы ў гэтым кірунку скарыстоўваюцца пакуль што вельмі слаба. Па-другое, нават з улікам таго, што памеры штогадовай замежнай грантавай падтрымкі, скіраванай пераважна на “развіццё дэмакратыі і станаўленне грамадзянскай супольнасці”, досыць істотныя, ступень эфектыўнасці гэтай падтрымкі таксама вельмі сумніўная.

Дарэчы, паводле экспертных дадзеных, толькі ў 2008 годзе і толькі з боку амерыканскіх фундацый на дэмакратызацыю беларускага грамадства было скіравана больш за 10 млн даляраў.[1] На маю думку, плён ад адной мастацкай стужкі, прысвечанай, напрыклад, трагічным падзеям беларускай гісторыі ў сярэдзіне XVII ст. з бюджэтам у 6-8 млн. даляраў, знятай пры ўдзеле галівудскіх зорак і шырока разрэкламаванай у міжнародных медыях, мог бы быць значна вышэйшым у плане ўздзеяння на масавую свядомасць і змянення стаўлення беларусаў да ўласнай нацыянальнай ідэнтычнасці. Аднак шэраг замежных донараў па інэрцыі працягваюць падсілкоўваць напаўмёртвыя беларускія НДА, мноства з якіх, даруйце за выраз, проста паразітуюць на гэтых сродках, ствараючы ілюзію актыўнай “барацьбы з рэжымам”.

[1] http://news.tut.by/politics/406063.html

## Алена Анісім: Тэзісы да праекта “Стратэгія развіцця беларускай нацыі”

### Стан беларускай нацыі

Беларуская нацыя найбольш мэтава фармавалася цягам 19-20 ст. Але так сталася, што гэты працэс увесь час затарможваўся з-за неспрыяльных адносін да нашай нацыі з боку бліжэйшых суседзяў, якія доўгі час (і зараз таксама ) адмаўлялі ў праве беларусаў быць самастойным нацыянальным суб’ектам.

Тым не менш дзякуючы нашым асветнікам і нацыянальным героям (як Кастусь Каліноўскі) наш народ адчуваў сябе адметным як у плане менталітэту, так і ў культурным сэнсе. Шмат што было зроблена ў часы БССР (якога мажліва і не было б без БНР). Аднак вялікая праблема была ў тым, што дзяржаўная эліта вельмі часта пад ціскам абставін (сталінскі тэрор, да прыкладу) ці па сваім маладушшы слаба працавала на ўмацаванне беларускасці.

Адсюль у нашага народа слабая нацыянальная самаідэнтыфікацыя, якая да таго ж размывалася найноўшымі тэндэнцыямі пазіцыянавання сённяшніх насельнікаў Зямлі як людзей Сусвету.

У беларусаў дэмакратызм, на маю думку, прысутнічае ў дастатковай ступені, але абарона дэмакратычных каштоўнасцей – гэта вялікае пытанне.

Мне падаецца, беларус самадастатковы па сваёй сутнасці, таму імкнецца захоўваць добрыя стасункі і з Захадам, і з Усходам. Але часам змушаны падпарадкоўвацца большай сіле, што прыводзіць да ўступлення ў розныя псеўдаўтварэнні кшталту саюзнай дзяржавы.

На сённяшні дзень, я думаю, ёсць тэндэнцыя ў некаторых дзяржаўных дзеячаў сфармаваць нацыянальную беларускую ідэю, дзеля таго, каб забяспечыць устойлівае развіццё краіны. Таму адсюль-адтуль з’яўляюцца білборды з адпаведнымі слоганамі і пасыламі і іншыя праявы руху да беларускасці. Пытанне ў тым, наколькі глыбока яны гэта змогуць/захочуць рэалізаваць.

Безумоўна, сёння людзі ў Беларусі жывуць найлепш за ўсе папярэднія сто гадоў. Але як будзе заўтра, сказаць цяжка. Гэта вялікая праблема – эканамічны крызіс, які накладаецца на няпростыя міжнародныя абставіны. Пакуль што людзі цэняць спакойнае мірнае жыццё ў сваёй краіне з магчымасцю ездзіць па свеце.

Калі эліта як дзяржаўная, так і дэмакратычная змогуць знайсці паразуменне ў плане спраўджвання нацыянальнай ідэі, патэнцыял у рэалізацыі нацыянальнай ідэі вялікі. Тым больш што пакаленне 35-40-гадовых прыхільнае да беларушчыны.

**Мэта або чаго хоча беларуская эліта**

Я згодна з вызначэннем А.Трусава пра тое, што наша нацыя грамадзянская, але з выразнымі прыкметамі беларускай этнічнасці, найперш моўнай.

**Задачы**

- Падтрымліваць ідэю аб гістарычнай унікальнасці беларускай нацыі, якая павінна падтрымліваць добрыя адносіны са славянскімі народамі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы і з іншымі народамі свету;
- Праводзіць аствэтніцкую дзейнасць у галіне гісторыі, культуры і традыцый беларускага народа (Полацкая дзяржава, ВКЛ); стварыць асветніцкі агульны канал на магчымых сродках інфармацыі – электронных і неэлектронных;
- Стымуляваць выкарыстанне мовы ва ўсіх сферах грамадскага і культурнага жыцця;
- Даводзіць інфармацыю пра ўсе станоўчыя праяўленні беларускасці;
- Стымуляваць мясцовыя ўлады да змены савецкіх назваў (вуліц, пасёлкаў) на нацыянальныя;
- Папулярызаваць нацыянальных герояў і нацыянальныя даты (Еўфрасіння Полацкая, Рагнеда, Францыск Скарына, Кастусь Каліноўскі, Грунвальдская бітва, 25 сакавіка 1918 г., 1991 год).

**Падыходы да рэалізацыі Стратэгіі**

Падчас рэалізацыі стратэгіі, лічу, што сапраўды правільна было б трымацца маральных прынцыпаў узаемаадносін паміж усімі ўдзельнікамі працэсу, а таксама прыхільнікамі:

Узаемапавага і падтрымка, максімальнае карыстанне беларускай мовай і заахвочванне іншых да гэтага праз станоўчае ўспрыманне тых, хто пачынае гаварыць па-беларуску, напачатку можа і з памылкамі, павышэнне культуры вядзення спрэчак і дыскусій без свядомага ўжывання абраз, мянушак, крыўдлівых выразаў.

**Сродкі рэалізацыі**

Самай добрай справай было б стварэнне на базе хаця б аднаго дзяржаўнага тэлеканала паўнавартаснага сродка масавай інфармацыі на беларускай мове з вяшчаннем у 24-гадзінным рэжыме. Трэба, каб былі і навіны, і культурнае жыццё, і мастацкія стужкі, і літаратура, і спорт – адным словам, уся інфармацыя на беларускай мове.

Яшчэ адной важнай справай лічу працу па стварэнні Нацыянальнага ўніверсітэта з беларускай мовай навучання на аснове новых тэхналогій і перспектыўнымі адукацыйнымі накірункамі.

**Алег Трусаў: Тэзісы да праекта “Стратэгія развіцця беларускай нацыі”**

**Стан беларускай нацыі**

Наша нацыя яшчэ знаходзіцца ў стане свайго фармавання, якое паскорылася пасля атрымання незалежнасці.

Найбольшы ўзровень патрыятызму праяўляецца ў Менску і вялікіх гарадах.

Большасць грамадзянаў Беларусі выступаюць за незалежнасць і сувернітэт, але кожны па-свойму. Адносіны да дэмакратычных каштоўнасцяў збольшага абыякавыя, бо значная частка насельніцтва проста пра іх нічога не ведае.

Галоўная нацыянальная ідэя зараз – мірнае жыццё без вайны і рэвалюцый.

За апошнія 20 год узровень жыцця беларусаў самы лепшы за апошнія 100 гадоў.

Патэнцыял сіл для рэалізацыі нацыянальнай ідэі вялікі – гэта штодзённая праца ў галіне культуры сярод насельніцтва.

**Мэта або чаго хоча беларуская эліта**

Мы будуем сваю нацыю ў сярэдзіне нашай этнічнай тэрыторыі, якая канчаткова склалася ў канцы XIX – пач. XX ст. і была вызначана падчас перапісу 1897 года.

Наш ідэал – нейтральная дзяржава як Швейцарыя альбо Нарвегія, якія ў НАТА, але не ў Еўразвязе. Наша нацыя грамадзянская, але з выразнымі этнічнымі (беларускімі) прыкметамі, бо складаецца ў асноўным (80%) з беларусаў.

**Задачы**

- Праводзіць асветніцкую дзейнасць у галіне гісторыі, культуры і традыцый беларускага народа (Полацкая дзяржава, ВКЛ, БНР, БССР); стварыць асветніцкі агульны канал на магчымых сродках інфармацыі – электронных і неэлектронных;

- Папулярызаваць нацыянальных герояў і нацыянальныя даты у адпаведнасці з юбілейнымі датамі знакамітых беларусаў.

**Падыходы да рэалізацыі Стратэгіі**

Адзіны падыход у вырашэнні пытанняў стратэгіі;
Максімальнае карыстаньне нашай мовай.

**Сродкі рэалізацыі**

Сродкі масавай інфармацыі;

Арганізаваны інфармацыйны канал для найважнейшых навін, якія ляжаць у рэчышчы выканання дадзенай стратэгіі;

Выданне кніг, буклетаў, паштовак, календароў і інш. (у тым ліку і электронных), заснаванне вэб-рэсурсаў.

**Summary of discussion "Nation-building and modernity. 2015".**

**Topic: "The strategy of development of the Belarusian nation".**

**Participants: A. Anisim, A. Kasho, P. Murzionak, I. Shumskaja, A. Trusau**

*(Abstract, magazine "CULTURE, NATION", December 2015, issue 12, pp. 23-68)*

The characteristics of the Belarusian nation are provided including the level of self-identity \ nationalism \ patriotism; respect for independence/sovereignty and democratic values, the interrelations East-West; relations between the state and the national idea; the trends of changes in the nation over the past 20, 50, 100 years, the potential forces for the implementation of the national idea. A correct assessment of the current state of the nation is very important to determine the goals and objectives of the Strategy of the Belarusian nation development. On the basis of the materials submitted by experts an agreed version of the Strategy will be prepared and submitted for public discussion in the media for a period of 2-3 months. The strategy, in the case of wide discussion and dissemination, might be a program for action for those people interested in the development of the nation. The Strategy is being developed for the entire Belarusian nation, and not for specific individuals, parties or social movements. Naturally, the magazine "CULTURE, NATION" invites other possible experts to join the development of the "Strategy of development of the Belarusian nation". It is no secret that to develop such a project will not be an easy task because of different views and approaches but we hope that we can find an agreement on the final stage as we are convinced of the need for such a strategy.

*Юбілеі*

## ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ КАСТУСЯ АКУЛЫ



*Ад рэдакцыі:* Кастусь Акула (Аляксандр Ігнатавіч Качан), пісьменнік і вядомы грамадскі дзеяч беларускага замежжа, нарадзіўся 16 лістапада 1925 года ў вёсцы Верацеі, Докшыцкага раёна, Віцебскай вобласьці. Памёр 29 студзеня 2008 года, пахаваны ў Таронта, Канада.

Падчас нямецкай акупацыі настаўнічаў, з вясны 1944 года быў курсантам Мінскай афіцэрскай школы Беларускай Краёвай Абароны. У 1944-1945 г.г. ваяваў у складзе 2-га польскага корпуса Брытанскай арміі. Удзельнік баёў пад Касіно, Італія. У 1947 годзе прыехаў у Канаду. Заснавальнік і першы старшыня Згуртавання беларусаў Канады (ЗБК). Выдаваў газету «Беларускі Эмігрант», часопіс «Зважай» (1974-1997).

Апублікаваныя кнігі:

- Tomorrow is Yesterday: A Novel. Toronto: «Pahonia» Publishers, 1968. 225 p.
- Гараватка: Раман. Кн. І. Дзярлівая птушка. The Bird of Prey: Byelorussian novel. Таронта, 1965. 180 с.
- Гараватка: Раман. Кн. ІІ. Закрываўленае сонца. The Red Sun. Таронта: выдавецтва «Пагоня», 1974. 285 с.

- Гараватка: Раман. Кн. III. Беларусы, вас чакае зямля. Byelorussians, the soil is yours. Таронта: выдавецтва «Пагоня», 1981. 286 с.
- За волю: Раман. Таронта: «Пагоня», 1991. 172 с.
- Заўтра ёсьць учора: раман / Кастусь Акула; пер. з англ., прадм. Ірыны Варабей. Мінск: Медисонт, 2008. 197 с. (Бібліятэка Бацькаўшчыны; Кн. 15). ISBN 978-985-6530-91-6.
- Змагарныя дарогі=Combat Trails: Аповесьць. Торонто-Мюнхэн: выданьне аўтара, 1962. 583 с.
- Усякая ўсячына: Проза, паэзія, п'еса. Таронта: выданьне «Пагоні», 1984. 136 с.

22 лістапада 2015 года ў памяшканні Беларускага культурна-рэлігійнага цэнтра ў Таронта прайшло паседжанне, прысвечанае памяці Кастуся Акулы. Часопіс «Культура, Нацыя» далучаецца да добрых слоў пра пісьменніка і чалавека. Ніжэй падаюцца успаміны Вольгі Іпатавай і Пятра Мурзёнка пра сп. Акулу.

**Вольга Іпатава: НА ДАРОГАХ ЗМАГАННЯ**

У лістападзе 1948 года дваццацітрохгадовы канадскі эмігрант Кастусь Акула, тады чарнарабочы на адной з фермаў, разам са сваімі тады яшчэ нешматлікімі сябрамі заснаваў ў Таронце Згуртаванне Беларусаў Канады. Гэты малады беларус добра ведаў, што ён хоча – захаваць нацыянальны асяродак тут, на чужой зямлі, куды прывялі яго дарогі змагання, і служыць Беларусі разам з тымі, хто ўсведамляе сябе прыналежным да яе. ЗБК паступова стала ўплывовай арганізацыяй, з якой сталі лічыцца мясцовыя ўлады. Сведчаннем гэтаму можа служыць такая дэталь: на будынку гарадской управы у Таронце кожны год (ажно да 2006-га) у гонар абвяшчэння БНР 25 сакавіка ўздымалі бел – чырвона – белы сцяг. Пасля, відаць, пастаралася наша беларускае пасольства – сцяг знік.

У 1965–м годзе, менавіта яму прыйшла ў галаву ідэя стварыць цэнтр адпачынку для беларусаў (сёння ён носіць назву "Слуцак"), і, сабраўшы грошы, нашыя землякі выкупілі ферму і будынкі на беразе возера Манітовабінг. Гэтыя 260 акраў зямлі сёння сталі прыгожым лесам, дзе стаяць катэджы, зробленыя працавітымі рукамі людзей, дзяды і прадзеды якіх былі пераважна сялянамі і любілі зямлю. У часы, калі ўпала "жалезная заслона", пасля прыезду (ці, хутчэй, звароту) на Бацькаўшчыну, яго ахвяраваннем і клопатам паўстала ў Заслаўі пад Мінскам капліца будучай праваслаўнай аўтакефальнай царквы.

Гэтыя акцыі – толькі нямногія з тых шматлікіх грамадзянскіх ініцыятыў і спраў, якія ажыццявіў Аляксандар Качан з Глыбоччыны, які сёння добра вядомы на Беларусі і за яе межамі як пісьменнік Кастусь Акула.

Невялікая ратапрынтная кніжачка Міколы Мішчанчука “Літаратура беларускага замежжа”, якая выйшла пад эгідай Міністэрства адукацыі і навукі і Педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка ў 1993 годзе накладам у 200 асобнікаў, і зараз застаецца самым грунтоўным даследаваннем творчасці Кастуся Акулы. А між тым ён з’яўляецца самым значным беларускім пісьменнікам сённяшняга замежжа. Праўда, раманную трылогію “Гараватка”, як і іншыя ягоныя раманы, беларуская крытыка на працягу апошняга дзесяцігоддзя узгадвала не раз, асабліва пасля таго як упала «жалезная заслона», калі мы змаглі азнаёміцца з тым значным духоўна – культурным набыткам, які за доўгія дзесяцігоддзі міжвольнага адчужэння ад роднай зямлі назапасіла эміграцыя. Тут можна ўзгадаць перадусім вельмі цікавае даследаванне А. Данільчык “Шлях да зямлі запаветнай” (Героі Янкі Брыля, Кастуся Акулы, Прыма Леві ў пошуках волі), змешчанае ў “Родным слове” ў № 1-1999 г., артыкул “Чужие игры” М. Тычыны ў часопісе “Неман” у №№10-11 у 1995г., артыкулы і прадмова да адзінай пакуль што надрукаванай у Беларусі ягонай кнігі “Змагарныя дарогі” У. Арлова, інтэрв”ю Л. Пранчака дый іншых, у тым ліку і артыкулы Лідзіі Савік. Да таго ж, ніколі не абыходзіла аўтара увагай найперш газета “Беларус”, дзе рэцэнзаваліся ўсе ягоныя кнігі.

Аднак для пісьменніка, які ўнёс у нашую літаратуру аб вайне новы, ім самім перажыты вопыт беларуса, што між Усходам і Захадам шукае свой, беларускі шлях і, як магутным прэсам, выціснуты са сваёй зямлі, чый першы раман трылогіі “Гараватка” адзначыў “як бясспрэчную ўдачу пісьменніка й як значнае дасягненьне беларускай літаратуры” яшчэ ў 1965 годзе вельмі патрабавальны Ст. Станкевіч, чыя кніга “Змагарныя дарогі” была прызнаная бестселерам па апытаннях чытачоў “Нашай нівы” у 1995 годзе – дык вось, для пісьменніка такога ўзроўню гэтага вельмі і вельмі мала. Дадамо, што, мабыць, ні адзін з пісьменнікаў замежжа не падвяргаўся праз усе свае гады такому цкаванню са сваёй радзімы, як гэты чалавек, які яшчэ ў маладосці прысягнуў служыць сваёй Беларусі і слова гэтае трымаў да самай смерці. Яго здзекліва высмейвалі, пастаянна аблівалі брудам, шантажавалі родных, што засталіся на Глыбоччыне - ды не толькі прыслугачы савецкага рэжыму, штатныя і няштатныя. Яго закляймілі некалі (а менавіта ў “Голасе Радзімы”, №42 за 1966 год), лепшыя і на той, і на гэты час беларускія пісьменнікі. Горка і балюча і сёння чытаць словы, некалі, вядома ж, прадыктаваныя пісьменнікам зверху і адрасаваныя не толькі К. Акулу, але і Ст. Станкевічу, Р. Крушыну, Ю. Віцьбічу: “Не вам і не вашым хаўруснікам гаварыць пра літаратуру, якая сцвярджае вялікія ідэі сапраўднай чалавечнасці, не вам гаварыць пра волю і справядлівасць. Прадаўшыся адзін раз, цяжка, відаць, утрымацца, каб не прадацца і другі”. Але як крыўдна, як невыносна – цяжка было, думаецца, чытаць іх калісьці самому Кастусю Акулу, які ў той час працаваў рабочым і творы свае пісаў ў нешматлікія вольныя хвіліны – вольныя і ад

вялікай грамадскай працы, і ад барацьбы з камунізмам, што быў атабарыўся некалі на канадскай зямлі і які забраў ад беларускага руху многіх старэйшых эмігрантаў!

Але час мяняецца і паціху ставіць усё на свае месцы. Рада беларускіх пісьменнікаў абрала К. Акулу (а таксама В. Кіпеля і Я. Запрудніка) сваімі ганаровымі сябрамі, кнігі нашых калег выходзяць нават у сённяшняй Беларусі, хай сабе і не ў дзяржаўных выданнях. У час Інтэрнэту апусціць перад намі новую жалезную заслону наўрад ці ўдасца, і ідэя незалежнасці, беларускай вольнасці і ўласнага шляху, нягледзячы на ўсе цяжкасці і сённяшняга станаўлення дзяржаўнасці, прасочваецца ў душы юных беларусаў, якія, у адрозненне ад старэйшых, ведаюць імёны тых, каго мы, нацыянальная інтэлігенцыя, з вялікімі цяжкасцямі, праз шалёнае супраціўленне, уводзілі ў наш культурна-палітычны кантэкст.

Творчасць Кастуся Акулы сёння таксама павінна ўвайсці ў наш культурны і літаратурны кантэкст. Жыццё даказала праўду таго, за што яго бязлітасна цкавалі на Беларусі, ды што ён разумеў даўно і бясстрашна выводзіў у сваіх творах – што рэжымы Гітлера і Сталіна аднолькава небяспечныя для чалавецтва. Гэтага ва ўмовах таталітарызму не асмеліўся, апроч хіба В. Быкава, сказаць ніводны з беларускіх пісьменнікаў. А К. Акула гаварыў і пісаў. І даказваў тое не толькі сваёй творчасцю, але і ўчынкамі. Перафразуючы вядомае “Но пасаран!”, якое некалі казалі фашызму, можам узгадаць, што пісьменнік сцвярджаў “Камунізм не пройдзе!” і заўсёды быў актыўным удзельнікам, а то і арганізатарам акцый супраць камунізму, што пасляваенным часам нярэдка ладзіліся ў Канадзе. Гэтае перакананне ён пранёс па дарогах Еўропы, жаўнерам польскай арміі Андэрса прайшоўшы па дарогах Еўропы і ажно да самага, як ён кажа, абцаса бота, якім глядзіцца на карце свету Італія. Вось аб чым думае галоўны герой ягонай трылогіі “Гараватка” Сымон Спарыш, у якім яскрава бачныя рысы самога аўтара і якому самому давялося жыць ва ўмовах польскай, савецкай ды нямецкай акупацый, у час якіх раз за разам сотнямі, тысячамі знішчаліся мясцовыя жыхары: “Прыходзілі на памяць нядаўнія бальшавіцкія ўчынкі ў Бярэзвечах, дзе ў колішнім манастыры, перарobленым на вязніцу, людзі пазнаходзілі кучы трупаў з паабразанымі насамі, языкамі, жаночымі грудзьмі, павыколванымі вачыма, павыломванымі пальцамі. Прыгадвалася цяжкое жыццё пад савецкай акупацыяй, вывазы ў Сібір, вечныя нараканні бацькі. І ў параўнаннях маладога Сымона абодва акупанты выглядалі аднолькавымі. “Чорт іх ведае, - думаў юнак, - адна нячыстая сіла, а другая яшчэ горшая. Мусіць, каб паставіў на вагу, дык ніводзін не пераважыў бы, абое, як кажуць, рабое”.

Для беларускай літаратуры раманы К. Акулы з”яўляюцца не толькі мастацкім здабыткам. Яны ўводзяць дзесяцігоддзямі зацяснутага і адрэзанага ад іншых краін чалавека ў свет, які і дасюль з’яўляецца для яго даволі экзатычным, нягледзячы на

тое, што ўжо нямала беларусаў выязджае за мяжу рэгулярна ці раз-пораз. Месца дзеянняў рамана "Змагарныя дарогі" адбываецца у Неапалі, Балоніі, Лондане, Берліне – усюды, дзе быў сам Кастусь Акула. Яго творы сапраўды ў большасці аўтабіяграфічныя, ды ўсё ж ягоны герой - гэта па-мастацку абагульненая біяграфія соцень і тысяч маладых беларускіх хлопцаў, якія на шмат якіх дарогах свету змагаліся за сваё жыццё, бо захацелі стварыць СВАЮ БЕЛАРУСЬ. Нездарма у кароткай нататцы пра раман "Змагарныя дарогі", названаю "Паміж Курапатамі і Хатыньню" рэцэнзент газеты "Свабода" С. Лотва трохі задзірыста выказаў нават такую думку, што "паміж безьлічы бэсэсэраўскіх выданьняў аб Вялікай Айчыннай – гэты твор, падобна, адзіны, які можна ўважаць Беларускаю кнігаю пра II сусьветную вайну…"

І аўтару, у адрозненне ад некаторых нашых калегаў, не трэба адракацца ад сваіх уласных твораў, ад уласных радкоў. Жывучы ў вольным свеце, выбраўшы яго, хаця і пратэставала сэрца (цяпер мы добра ведаем пра тыя тысячы магіл, якія "надзейна" схавалі тых, хто паверыў савецкай уладзе), ён пісаў тое, што думаў, у што верыў папраўдзе.

Беларуская крытыка адзначыла і яшчэ адну якасць твораў Кастуся Акулы – магутны, часам надта бунтарны, але заўсёды нязломны беларускі дух. Ягоны герой у самых цяжкіх абставінах шукае выйсця і, у рэшце рэшт, знаходзіць яго. Нават вывад, які пры гэтым робіцца самім аўтарам: "галоўнае захавацца ды ператрываць" усё роўна пярэчыць таму, як паводзіць сябе герой. Так, ён часта бывае па-сялянску разважлівым, выбірае самую аптымальную мадэль паводзінаў у нялюдскіх варунках, але пры тым ніколі не здраджвае любові да Бацькаўшчыны. Яна вышэй за ўсё. І, можа, самыя кранальныя старонкі ягоных твораў якраз тыя, дзе гэтая любоў выяўляецца найбольш яскрава – ва ўнутраных маналогах герояў, у іхняй матывацыі тых ці іншых сваіх учынкаў. Можна адзначыць і тое, што мова аўтара, якую не псавала суцэльная русіфікацыя савецкай Беларусі, нібыта дачакалася свайго часу, каб прыйсці на зямлю, дзе яна амаль вывелася і засталася хіба што ў мастацкіх творах. Мы вымушаныя сёння падтрымліваць нават так званую "трасянку", бо, па словах некаторых спецыялістаў мовы, менавіта "трасянка" не дае беларусам канчаткова пазбыцца свае беларушчыны. Але ж гэта шлях не самы лепшы, шлях, як кажуць, "з гора". Таму мову Кастуся Акулы, магчыма, некалі стануць вывучаць як жыватворнае жарало сапраўднай беларускасці – думак, ладу мыслення, паводзінаў… Па ягонай творчасці будуць аднаўляць і той, амаль невядомы бальшыні беларусаў, шлях, які прайшла нашая эміграцыя. Бо, кажучы словамі рэцэнзента трэцяе кнігі рамана ў газэце "Беларус" (№292, 1981 г.) У. Глыбіннага, "Само бачанае й перажытае адлюстравалася ў душы, навекі затрымалася ў набалелым сэрцы; гаротныя прыкметы часу, усё перажытае й пабачанае ў жахлівыя часы вайны і ў часе

перад ёю моцна заляглі ў памяці і твораць багатую скарбонку. З яе адно трэба ўмелай рукою чэрпаць той нявычэрпны матар'ял, каб тварыць мастацкія пэрлы. І трэба сказаць, што Кастусь Акула робіць гэта ашчадна й плённа".

Сапраўды, хаця і павольна, але няўхільна, адна за адной, у эміграцыі нараджаліся і выходзілі ў свет яго кнігі, заканчваючы апошняй, якая называецца "Усякая ўсячына" (1984 г.) і выдадзеная таксама ў Таронта (аповесць "Змагарныя дарогі" выйшла ў 1994 годзе у выдавецтве "Мастацкая літаратура", але гэта - перавыданне).

Згаданая трылогія "Гараватка" сапраўды найбольш значнае, што напісанае пісьменнікам. Яна паказвае падзеі, што адбываюцца ў адной мясціне, паказвае праз збег часу і абставін людзей і іхнія лёсы. Трагедыйнасць перажытага літаральна ўваходзіць у тканіну усіх трох раманаў, якія ўражваюць масштабнасцю падзей, а таксама і глыбінёй іх мастацкага асэнсавання. Тое, што на Беларусі "Гараватку" ведаюць у асноўным па літаратуразнаўчых ды крытычных артыкулах (бо кнігі К. Акулы знаходзяцца толькі ў некалькіх бібліятэках і ў прыватных асоб), моцна збядняе агульную панараму нашай літаратуры. Яе складаюць раманы "Дзярлівая птушка" (1965 г.), "Закрываўленае сонца" (1974 г.), і, нарэшце, "Беларусы, вас чакае зямля" (1981 г.). Мне здаецца, што ўсебаковы яе агляд, зроблены нашымі лепшымі крытыкамі і літаратуразнаўцамі, яшчэ наперадзе, як наперадзе і кнігі пра самога Кастуся Акулу, яго жыццё і лёс, пра людзей, з якімі ён сустракаўся.

Толькі адна з такіх асоб – дысідэнт з Кастрамы, італьянец па крыві Аляксандр Гідоні. Яго добра ведалі і на Беларусі па ўдзеле ў лагерным паўстанні ў Пацьме яшчэ ў канцы пяцідзесятых. Эміграцыя прывяла яго ў Канаду, дзе ён, ужо прафесар Таронцкага універсітэта, пасябраваў з Кастусём Акулам і прагна цікавіўся невядомымі старонкамі беларускай гісторыі. А тыя, з кім сам К. Акула сябраваў на эміграцыі! Кожны з іх – асоба, вартая таго, каб пра яго пісаць, бо за кожным лёсам – часам амаль неверагодныя выпрабаванні, мужнасць і ахвярнасць, якія ўласцівыя і самому пісьменніку.

Часткова яны раскрытыя праз ягоныя кнігі. Але толькі часткова. Бо тое, што стаіць за імі, куды больш панарамнае. І – трагічнае.

У пачатку 90-х гадоў шмат пісалася пра нашую эміграцыю. Пасля паступова пісаць сталі ўсё меней і меней. Па-першае, дзяржаўныя выданні неяк вельмі хутка, як па камандзе, "адцураліся" ад гэтай тэмы – маўляў, колькі можна! Па-другое, прыезды эмігрантаў замест радасці даўгачаканага спаткання з Бацькаўшчынай часта неслі ім глыбокае расчараванне тым, што яны тут бачылі. Узяць хаця б той эпізод, калі юнага і ўсхваляванага Юрку Кіпеля, які папрасіў у кнігарні нейкую кнігу, тут жа астудзілі ледзяной вадой: "Говорите по-человечески!" Тая дурніца - прадаўшчыца (а колькі іх

было на кожнага з дарагіх гасцей, адзін Бог ведае!), якая разбіла крыштальны кубак Юркавай захопленасці тым, што ён на радзіме продкаў, наўрад ці здагадвалася аб тым, якое злачынства яна робіць… Уражвала эмігрантаў і тое, наколькі абыякава ставяцца людзі да таго, што самі яны доўгія дзесяцігоддзі неслі і пеставалі ў душах – незалежнасць сваёй краіны. Ды і многае іншае, уключаючы тое, што і ў самых, здавалася б, адданых беларускай справе інтэлігентаў пераважалі звадкі дый сваркі, ды нейкія дробязныя рахункі захіляні галоўнае. Але найбольш адпужвала сучасная палітыка краіны, якая колькі ўжо разоў рабілася пудзілам для ўсяго цывілізаванага свету…

Кастусь Акула вытрымаў усе гэтыя д”ябальскія перашкоды, яго душа сягнула праз усе межы, якія пастаўленыя не толькі ў ранейшы, але і ў навейшыя часы паміж эміграцыяй і Беларуссю.

... Я часта ўзгадваю яго і нашае сяброўства, якое пачалося ў 2003 годзе, калі я ўпершыню прыехала ў Канаду на тры месяцы. Так сталася, што шматпавярховік, у якім тады жыў мой сын, знаходзяўся ў якіх пару соцень метраў ад ягонай хаты.

І амаль кожны дзень з гэтых месяцаў мы сустракаліся ў ягонай хаце, дзе на той час жыў і малады эмігрант з Беларусі, якога ён прытуліў.

Без перабольшвання можна сказаць, што мая прысутнасць стала для яго як дар Божы – бо ён мог гаварыць з беларускай пісьменніцай, спрачацца аб праблемах літаратуры, быцця, філасофіі жыцця... Мне самой гэта было вельмі цікава, але часам мы і сварыліся – не згаджаліся па нейкіх пытаннях, ды і розніца ў жаночым і мужчынскім успрыйманні свету усё ж розная. Памятаю, сказаў мне: «Гляджу на цябе і не веру, што гэта ты напісала такія гістарычныя раманы». Я пакрыўдзілася і не стала нават адказваць на званкі. Прыйшоў да нас (а цярпець не мог высотак), замест прабачэння сказаў, нібыта нічога не адбылося: «Галубцы стынуць, пайшлі!» Я разрагаталася, і мы пайшлі чарговы раз есці ягоныя галубцы, якія ён часам гатаваў з самае начы і якія праз нейкі час дапамагала мне есці Ірына Варабей...

Утраіх мы правялі шмат цікавых і светлых гадзін і дзён. Засталіся фатакарткі – мы частуемся ягонымі малінамі, разам з ім цікуем за вавёркамі і чырвонагрудымі «робінамі». І засталіся запіскі: «Прыходзь, Оля, мае птушкі і вавёркі зажурыліся па табе».

І ўзгадваючы яго, я часам думаю, чаго ў ім было болей – суровага празаіка ці пяшчотнага, далікатнага, натхнёнага Паэта?

**Пётра Мурзёнак: СЛОВА ПРА ЗЕМЛЯКА**

Упершыню я пазнаёміўся са сп. Кастусём Акулам у Таронта у 1999 годзе. Для мяне, сьвежага чалавека ў беларускім асяроддзі за мяжой, было крыху незвычайна сустрэцца ў тым годзе і пазьней са старэйшай гвардыяй беларусаў у Канадзе, гэта і Кастусь Акула, Арсень Монід, Антон Маркевіч, Раіса Жук-Грышкевіч, Марыя Ганько, Барыс Кірка. Незвычайна таму, што, па-першае, гэта былі людзі, якія заснавалі беларускі асяродак у Канадзе, менавіта ў Таронта і акруговых гарадках, Ашаве, Гамільтоне. Па-другое, яны былі людзі пасьляваеннай эміграцыі, якія апантанна і аддана верылі праз доўгія гады ў перамогу і вяртаньне на Радзіму. Гэта адданасьць заўжды адчувалася ў іх выступах на беларускіх імпрэзах, і я думаю, што іх адданасьць беларускай справе безумоўна перадалася значнай колькасьці беларусаў новай хвалі эміграцыі.

Сп. Акула заўжды выглядаў паважна - высокі, моцны на выгляд мужчына, пры касьцюме і гальштуку, у традыцыйным для яго бэрэце са значком “Пагоні”. Як выглядаў паважна, так і гаварыў – павольна, зразумела, упэўнена. У апошнія гады свайго жыцьця ён зьнешне, так мне падавалася, амаль не мяняўся. Амаль пры кожным наведваньні Беларускай Аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў Таронта можна было чуць голас сп. Акулы пры багаслужбах, дзе ён заўважна падпяваў-басіў у невялікім хоры.

У нашых кароткіх размовах вызначылася, што мы з ім землякі. Ад маіх Дунілавіч, што ў Пастаўскім раёне да яго Верацеяў будзе кіламетраў двацаць. Тады ж я даведаўся, што яго сапраўднае прозвішча Качан. У нашай мясцовасьці шмат прозьвішчаў прывязаных да пабытовых рэчаў. Аднак, мне не даводзілася многа размаўляць пра нашы агульныя мясьціны. Я ўспамінаю больш яго расказы пра набыцьцё старой царквы ў Таронта, пра выпуск газеты “Зважай”, і асабліва пра яго палітычную акцыю з лістоўкамі ў Манрэалі падчас выстаўкі “Экспо 67”.

З яго творчасьцю я пазнаёміўся чытаючы “Гараватку”. Прачытаў тры кнігі ад пачатку да канца за літаральна некалькі дзён. Там і суровая праўда, і апісаньне падзей, якія праходзілі ў вельмі блізкіх і родных мясьцінах. Многія з тых падзей былі падобныя на гісторыі, якія я чуў ад старэйшых людзей. Чытаючы трылогію, праводзіў аналогіі з аповесцю В. Быкава “Знак бяды”. Які ж складаны і нязломны лёс

мае наш беларускі народ, каб перажыўшы такія цяжкасці зноў знаходзіць сілы падымацца і заяўляць аб сваёй годнасці.

Пазьней давялося даведацца, што сп. Акула меў складаныя сямейныя жыцьцёвыя абставіны. Нягледзячы на іх ён знаходзіў час тварыць. Аб яго сіле волі і жаданьні пісаць сьведчыць той факт, што часам яму даводзілася друкаваць на машынцы свае творы проста седзячы на лаўцы ў парку.

Кастусь Акула быў чалавекам прагрэсіўных поглядаў. У 2001-2003 г.г. падчас майго старшынства ў ЗБК была створана камісія па зьменах статута арганізацыі. Сярод прапанаваных зьмен было прыняцьце палажэньня паводле якога сябрам ЗБК мог быць любы чалавек (не толькі беларус, як у папярэднім статуце), які стаіць на грунце 25 Сакавіка і прызнае мэты і задачы арганізацыі. Адным з сяброў гэтай камісіі быў і сп. Акула, які быў за прыняцьце гэтага і іншых прапанаваных зьмен. У размовах пра будучыню ЗБК ён не выказваў заклапочанасьці – казаў, што пакуль тут ёсьць царква, то з ЗБК будзе ўсё ў парадку.

Мне падалося, што ён быў чалавекам няпростым у адносінах з людзьмі. Гэта было заўважна і па асьцярожнай манеры размаўляць, і па нясьпешных адказах на пытаньні. Ён займаў сваю асобную пазіцыю сярод беларусаў Таронта і ў гэтым была яшчэ адна яго адметнасьць. Аднак гэта ягоная адметнасьць не аддзяляла яго ад грамады, а станоўча вылучала як сярод старэйшай эміграцыі, так і сярод прадстаўнікоў новай беларускай хвалі. Відавочна, на такіх моцных людзях як Кастусь Акула трымаецца беларускі дух і жыве надзея на будаўніцтва свабоднай беларускай нацыі.

**On the 90th Anniversary of Kastus Akula**

*(Abstract, magazine “CULTURE, NATION”, December 2015, issue 12, pp. 69-78)*

Kastus Akula (Alexandar Ignatavich Kachan), a Belarusian writer and social activist was born on November 16, 1925 in Veratseja village (Dokshitsy district, Vitebsk region). He died on January 29, 2008, buried in Toronto, Canada. During the German occupation, he was a teacher then in the spring 1944 he was a cadet officer of Belarusian Home Defence (Minsk). In 1944-1945, he fought in the 2nd Polish Corps of the British Army. He was a participant of the battle at Cassino, Italy. In 1947 he came to Canada. He was the founder and the first chairman of the Belarusian Association in Canada. He published the newspaper "Belarusian emigrant” and magazine “Zvazhaj" (1974-1997). On November 22, 2015 in the Belarusian cultural and religious center in Toronto a commemoration meeting dedicated to Kastus Akula was held. The magazine "Culture, Nation" joins the kind words to the writer and to the man. The memories about K. Akula written by Olga Ipatava and Piotra Murzionak are presented.

*Наступны нумар часопіса «КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ» выйдзе ў сакавіку 2016 года*